Зок-1
12702

У З В Ы Ш Ш А

ЧАСОПІСЬ
ЛІТАРАТУРЫ,
МАСТАЦТВА
І КРЫТЫКІ

05
6 15344

№ 8

ПЯТЫ ГОД ВЫДАНЬНЯ

Дзяржаўная бібліятэка БССР імені ЛЕНІНА

МЕНСК—1931

ЗЬМЕСТ

Стар.

Максім Лужанін—Галасы гарадоў (*поэма*) 3

Кузьма Чорны—Бацькаўшчына 27

В. Казлоўскі—Збожжам запахла зямля (*верш*) 44

Эд. Самуйлёнак—Насустрач будучыні (*нарыс-апавесьць*) 48

П. Ананьнеў—З цыклю „Шахта буніць“ 69

Цімох Гарбуноў—Конзавод (*нарыс*) 77

Л. Бэндэ—Творчыя задачы пролетарскай літаратуры 86

Ал. Цітоў—Беллачаф 110

„ „ —Сяргей Ракіта „Я агітую за пяцігодку“ 111

Эд. Галубок—Зіна Бандарына—„Веснацьвет“ 113

Галоўлітбел № 2280. Заказ № 2979. У ліку 1000 экз. „Палесдрук“, Гомель

Максім Лужанін

Галасы гарадоў

Матар'ялы на поэму

Першы зварот да Ромэн Роляна і Бэрнарда Шоў

Дзесьці вы
за гарамі...
Колькі-б
я там
ні йшоў—

цяжка
ўбачыцца з вамі
Ромэн Ролян
і Бэрнард Шоў.

Вас-жа
ведаюць лерды
і міністры,
і каралі,
і Рокфэльлеры
й Форды
вам
пашану далі.

З іх—
ня надта
пашаны:
вельмі-ж
з кроўю яна...
Але мой
сьціплы ганак
вас чакаў
да відна.

Гэта так—
сьмешнавата...
За тры моры
ад вас
стаіць
бедная хата
і
настромлены час.

І жыве там
бяз Грэтхэн
(і шавец
і кравец),
дзікаваты поэта,
дзіўнаваты хлапец.

Шмат там
пішацца вершаў.
рвецца—
болей яшчэ:
усё ня ўхопіць ён
першы
зірк
сусьветных вачэй.

І вось—
гэты аскепак,
недалужны гібрыд,—
начытаўся ў газэтах,
што вы
нашы сябры.

Далей—
брыдка прызнацца! —
(я-ж казаў—
падрасьці!)
за руку хоча ўзяцца
ды яшчэ й
патрасьці.

Дзесьці вы
за гарамі...
Я іх—
буду ўзрываць!
Каб пабачыцца з вамі
проста
тварам
у твар.

Тут,
даруйце,—
нязвычнасьць,
каб ня ўбіцца
ў шаблён—
крок крыху гіронічны
і
апрысклівы тон.

У мяне—
абавязак,
а я
трохі адбег,
але шлях не заказан—
пасьмяцца
з
сябе...

Працяг звароту, дзе і зноў-жа гаворыцца пра сябе

Штосьці
слоў не хапае,
дужа скупа радкоў...
Чыкільгае
дурная
тутэгіронія зноў.
Каб пачулі
мой выраз,
ўзмах
(ад сэрца)
рукі—
я хачу
быць
так шчыра,
як ніколі
ні з кім.
Каб унікнуўшы
сварак
і турбот міліён—
сустракаць сваю старасьць,
быццам
майстар Брэньён.
Так
ці раз лятуценіў
я пад цяжкі настрой,
калі
дрогнуць калені
і
сьцюдзёніцца кроў.
Не таму мне холадна,
што ня веру
ў наш час.
Мая ў гэтым паходня—
шмат ярчэй,
як у вас.

Без халоднай развагі,
сэрцам
чуючы век,
не надужыўшы цягліц
гэты рос чалавек.

Я,
ў сваёй маладосьці,
многа
бачыў відна.
Месца чорнае зглосьці
заступала вясна.
Але хіліць
да плачу,
сэрца
кроіць мне згук:
шмат я дзіўнага бачу,
а падняць
не магу.

Можа—
гэта юнацтва—
час
вясёлай хады.
Я мяркую застацца
назаўжды
малады.

Каб нашчадкам вясёлым
найшчасьліўшай зямлі—
так
аддаць
гэты золак,
як яго
мы ўзялі.

Ды ня йдуць нешта песьні,
сам-жа троіў
ральлю.
Згадка блісьне балесна:
мо' ня тое раблю?

Можа-б лепш
пад ударам
паддавалася сталь,
можа-б
быў
ў загары

я адменны каваль.
А то—
ўзьбіўся на вершы—
ні туды,
ні сюды...
і блукаю ня еўшы
з сэрцам
поўным лухты.
І вось гэтую тэму
вывеў
(зноў-жа)
на зман:
„матар'ялы поэмы",
а поэмы—
няма.

Ўсё кудысьці сьпяшаю,
ўсё
шукаю чагось...
Мо' праз гэта
у краі
буду лішні
я госьць.

І казаў-жа, што дурань,
нават
брыдка чытаць.
Ёсьць асьліная скура,
месца ёсьць для хваста.

І нашоў з кім займацца,
заглядаць каму ў твар!
Накрывацца
юнацтвам,
каб няўмельства схаваць.

Бо падроблены выраз,
вы адчуеце
дзе...

Я-ж хацеў
быць
та к шчыра,
як ніколі,
нідзе...

Справа думку руплiва
ў дарогу вяла
і ў чаўне
сарамлівасьць
вусны ёй зацяла.

Вам—
куды мяне слухаць!
хай бы іншы хто нёс,
ў каго
большае вуха,
большы голас
і
рост.

Тут
поэтаў багата—
ім бы ў госьці да вас!
Ў мяне—
голая хата
і
настромлены час,
знэрваваны аловак,
яркіх дум карабель,—
вось чаму
маё слова
перш было
пра сябе.

Дзесьці вы
за гарамі.
Я іх
буду ўзрываць!
Каб пабачыцца
з вамі
проста
тварам
у
твар.

Шнур даўно мой
палае—
загрыміць
дынаміт!..

Я пакуль пасылаю
папярэднікам
ліст.
У мяне
абавязак,
а я
зноўку адбег...

Шлях такі
не заказан—
пасьмяяцца
з сябе...

Крыху далей...

Падарожнікаў
выбралі сьмешных:
лэдзі Астор,
якісьці лёрд...
Праўда, часта
шукаюць
сьцежку
ў акіяны
цераз фіёрд.
Вас
абвеяла
морскім ветрам,
акіян наш
вас
абвагніў—
озонóванае паветра
навальнічнейшае
з навальніц.

Вы пабачылі
твар
той
можны
і пасьведчыў
вам
маўзолей,
што
найлепшы
наш
спадарожнік—

томік Леніна
на стале.

Вы
на ростань
пацiснулі рукі,
загайдалі вас
хваль
гарбы...

Перадайце-ж
другому
другу—
трэба
конча
у нас
пабыць!

Раскажэце яму
па-просту,
як далёка
наш
поступ
чуць,

як мяркуюць
спаіць
нас воцтам,
мякка
лопаючы
па плячу.

Пэўне,
гаўкне які,
з-пад плоту,
і на вас.
Мы яму:
—Дррабяза!

Як ты сьмееш,
продажная цнота,
іх
на свой капыл
наразаць.
Вось ізноў-жа я
не пра тое...

Я
інакшае
слова
бяру,
і, як здужаю,
так спакойна,
вам расказваць му
пра Беларусь.

Беларусь!
першы раз
пачуеце,
хоць вялікім шляхом
ішлі,
можа гэта
крыху расчуліць вас,
што ня чулі,
а век
зжылі.

Гэта,
знаеце,
на ускраіне
каля
самай
польскай мяжы.

Негарэлае—
там—
паўстанак ёсьць,
скуль
кур'ерскі
да вас
бяжыць.

Гэта,
знаеце,
на ускраіне,
Каля
самай
польскай мяжы.

Негарэлае
там паўстанак ёсьць,
скуль
кур'ерскі
да вас бяжыць.

Шмат вякоў
была
спраняверана,
нездарма-ж
і ў поэтаў
слынь:
„пад пятою Расійскай
імпэрыі
расьцьвітае
толькі палын“.

Ня цьвіла.
Так
жыла
калюшкаю,
мову
тулячы
да грудзей.
Нават
ветры
яе
ня гушкалі,
ня ўзыходзіў
над ёю
дзень.

А пасьля,
укаршэніўшы пана—
чорнасоценцаў,
палякоў—
абазвалася
Асінстанамі
звонкай
музыкай гарадоў.

І нязрушна,
работай спорнаю,
надыходзіла
скрозь вясна,
цьвёрда
выкаваўшы гісторыю,
ад Купалы
і аж
да нас.

і рукою
ўсё тэю-ж
самаю,
што трымае
клявец
і
рычаг,
разьвінула
свой ясны
ранак яна,
падужэўшы
ў грудзях
у плячах.

У палёх—
ураджайнымі звонамі,
чорным золатам
з грузкіх
балот,
наліванаю
медзьдзю
антонавак—
свой зьбірае
яна
умалот.

Што ня слухалася—
намагніцілі,
каб
вышэй
яе
уздымаць,
мэталісты
напружнага
Віцебску,

поруч
Добруш
і
Гомсельмаш.

Окупацый
забіўшы
шчыліны,
узяліся
яшчэ жвавей:

нават
шоўк
мы рабіць
навучыліся,
а ў анучах
хадзілі век!

Так—
былі,
праўда,
аскабалкі.
Каб цяжэй нам—
на шлях—пясок.
Дзе-ж вы бачылі,
каб
бяз палкі
шлях праехала
калясо?

Тут
такое
пашло
употай,
перш дык
ціхенька:
„ква-ды-ква...
Мы ізноў пад маскоўскім ботам,
што такое
для нас
Масква!“

А пасьля—
паказалі зубы.
Давялося іх—
па вусах!

Нам—
дык есьці
патрэбны зубы,
ім—
патрэбны былі—
кусаць.

Бо,
пад рэй
незалежнай
пагудкаю,

паказаўся
вя-ясёлы
твар:
перш
паваксіць
халяўку Пілсудзкаму,
а пасьля яе—
цалаваць.

Разумееце,
ім хацелася,
атрымаўшы
замежны дыплём,
каб гарэла
ізноў
Негарэлае,
каб
Сухое
балотам
было.

Але мы—
здабывалі месца,
каб ніколі
не аддаваць.
Роўна.
Дужай
крывёю
б'ецца
сэрца сьвету ўсяго—
Масква!

Мы
спаветрым
замахі навалы,
пад
чырвоным
штандарам
Крэмля.

Там-жа—
Леніна
сэрца палала,
там-жа
Сталіна
воля расла!

Сонца!
словы мае
гарачэй кінь,
ў гэты
волатаўскі
разьбег!
Сэкратар
беларускай ячэйкі—
просты провад
ЦК УсеКП.

Гэта,
знаеце,
пэўна, самі,
дарагія
нашы
сябры.
Я-ж сьпяшаючыся
за часамі
замарудзіў
пра колёрыт.
Можна сплесьці
якую небыль
пра
асеньні
смутак палян.
Сьмешнавата
цяпер
пра неба—
цікаўнейшая рэч—
зямля!

Заўжды
ветласьці
сэрцу трэба.
Прыяжджайце!
будзеце госьць!

Малака
ў нас хапае,
хлеба
і з прыгоршчы
поэтаў
ёсьць.

Тэма разьвінаецца

Пачынаецца
новае слова,
новае слова
і новыя дні:
сутарэньні,
агонь лістовак,
над гушчарамі
навальніц.
Час,
засланы
крывавым абрусам,
крыкаў,
барбарства.
і
журбы,
аб аднэй яшчэ
Беларусі,
што
Савецкаю
хоча быць.
Як
ні тужыліся-б там,
ні хацелі,
і як ні ўчынялі-б
гвалт:
не ўзрасьце
на мужыцкім целе
панская галава!

Са сваёй
будзе жыць
рабочы,—
воля яркне
ясьней грымот!
А вось панская
дык адскочыць
і пакоціцца
на
памост.

Б-ка 1534
1953 г.
БССР • Дзяржаўная бібліятэка імені ЛЕНІНА

Пра што трэ' было гаварыць спачатку

„У Браслаўскім раёне дэмонстрацыі
і сутычкі з паліцыяй ахапілі 11 вёсак.
„Звязда"

1

Што гарэла,
займалася
і задушана
цяжкім домкратам
казэматаў—
Сёньня
дні нашы
робяць.

Але...
як гэта...
сталася?
Вось-жа
йзноў
прыгадалася
прыкрая
і
маленькая
дробязь—
нацыянал-дэмократы.

Сонца—
сьведка.
Ў прыпары
ліпнёвай задухі
суха.
Трэба—
дождж!
Трэба—
ветру!
Навалъніцы
чакае
паветра.
Долу—
вуха.
Паслухай!

Галасы гарадоў.
Га-аалась
га-радоў!
Галасі
і
ня моўк—
ні...
— Даволі!

Лес
расколваюць пошчакі:
...во-ол-і-і...

Маладосьцю быў
горад
заліты.
Запяваў
карнавал.
Дэмонстрацыя МЮД'у
на вуліцах
Менску,
дэмонстрацыя сонца
на шыльдах,
на плітах—
аддрукоўвалі
крокі
і
цені
і
змрокі
на звычайным,
на бэмскім,
на тварах,
на крамах,
на
балонках
газэт.

Калі хочаце—
хмары,
калі хочаце—
брамы,
Калі трэба—
поэт.

І ня моўк
комсамол.
І ня ціх
імпэт іх.
Запяваў
карнавал.

Плошча Волі.
Узгорак
І заклік:
„Змагацца!
Усе—
за 1040
і 518!“
І юнацтва—
плыло.
Прывітаў
старшыня
Саўнаркому.
Мора
палкіх
галоў.
Сонца,
радасьць
і гоман.
І кудлаты
хлапчына
з грудзінаю
ветру на росхліст—
Гарачыўся.
Выростаў.
І размахваў рукамі.
І словы
блукалі.
І разжвірвалі камень.
І муры
з рэпродукторавымі вушамі
перагукваліся на зары.

Ён успомніў.
Спыніўся.
І за ім—
зірк праменны
агніўся.

Стыў натоўп.
Галасы гарадоў.
Стыў натоўп.

І пачуў комсамол:
ад
гарачых
прамоў
скаланулася Вільня
процэсам „Змаганьне".
І суды фашыстоўцаў,
ад раньня
да раньня,
умагільваюць зноў
беларускіх паслоў.

Толькі гэта—
з вялікай
спагадай,
і танчэй,
як калісь
Мураўёў,
Кобрын,
Луцак
і
Навагрудак
закавалі
іржой кайданоў.

Гэта—
з Вронкаў,
Лукішак
і
Равічу
йшла работа
„гішпанскага боту",
капыты
ашалелае зграі
запраданай
за пару
банкнотаў.

Галасы гарадоў.
Стыў натоўп.
І замоўк
комсамол.

І—
раптам—
запявала
зрушыўся:
— Па-ход!
І моладзь засьпявала,
як
грозная навала:
— З Інтэрнацыяналам
паўстане
людзкі
род!
З Інтэр-
на-
цыя-
на-а-а-алам
Паўста-ане
людзкі
род!

І калі
загартованай песьняй
маладосьць загадала:
— Даволі!
Галасамі
лясоў
белавескіх
адказалі нам пошчакі:
— ... во-олі!..

„Асабліва вылучаецца ў справе катаваньня Копец, начальнік Пінскай турмы, садыст, у літаральным сэнсе гэтага слова".

„Зьвязда"

2.

Так...
За усё,
што яны заробяць,
нам
крывёю
прынесьці заплату.
Я успомніў
маленькую дробязь
нацыянал-дэмократаў.

Прыгадаліся—
думкі,
мары,
сны
і
лятункі
урадоўцаў,
прэм'ераў—
з драбязы
Бэ-эН-эРый:

„Адарваць яе
трэба
ад Азіі,
ад вар'яцкіх утопій
бальшавіцкай фантазіі—
прылучыць
да Эўропы".

Ў гэтай справе
Пілсудзкі—
скрадзе...
яйца з-пад сучкі.
Ў гэтай справе
пан Прыстар
нам вядомы
адыстар.
Ў гэтай справе
пан Копец
а-адукованы хлопец!
А дэнікінец
Юнчыц—
усіх гэтых скарунчыць.

Прылучэньне—
задужа простае...
Толькі...
крышацца
косткі.
Ды гумовыя
палкі—
ў аскабалкі.

А калі не захоча
„далучацца"
рабочы,—

дык гаворыць
пан Копец—
лепшы майстар
і хлопец:
„Можна—
воцату ў ноздры,
ды вастрэйшы
боль каб
пад пазногці
іголку.
Ад
савецкай атруты—
трохі
выкруціць рукі
і,
з усьмешкаю тонкай,
размажджэрыць галёнкі.
Потым...
можа
і звольніць...
Папыталі
й даволі.
Калі-ж
моцна завые—
дык...
павесіць за шыю.
Хай
вышчэрвае іклы
З нашай
ласкі вялікай".

Там,
дзе ўмеюць
біць і маліцца,
выгандлёўваючы спажыву:
Называлася—
і н к в і з ы ц ы я,
называецца—
д э ф э н з ы в а.
І за усіх
іх—
служкі хрыстовыя

на крыжах
падымаюць
жаль.

І пакінуўшы
закатованых
выяжджаюць паны
на баль.

Прысьпяшаючы
сваю
пагібель
кайданамі
і
бізуном,
лякаванымі
сваімі крагамі,
адлюстроўваючы
ў іх
ноч.

І затое,
што нам
Яна
родная,
што заўсёды
нязрушна
з намі—
расьпінаецца
там
Заходняя
крывяжэрлівымі
панамі.

Там—
набэрсваюцца анучыны,
вострыць штых
партызанская варта,
і
сягоньня
адзін
замучаны
ў міліён
вырастае
заўтра.

І калі
бары
разгудуцца
аж
прыназямліваючыся
на
пясок:
Чуй!
Гартуецца
Рэволюцыя
ў сутарэньнях
і па лясох.

Нам—
адразу
паліць
паходні ўсім!

Кроў-жа выбухне—
ня іначай—
за
ўкатаваную,
за
Заходнюю
за
Савецкую
нашу.

(Канец будзе)

Кузьма Чорны

Бацькаўшчына [1])

ЧАЦЬВЁРТАЯ ЧАСТКА

Жыві як хочаш

Тады, калі верныя сыны Жэчы Паспалітай ужо звыкліся з радасьцю аб уваскрошаньні бацькаўшчыны свае, калі ўжо гэтая іхняя айчына як мае быць улягавалася па маёнтках і фальварках, калі ўжо толькі ўспаміны асталіся аб страшным бальшавіцкім маршы пад Варшаву, а над гарадамі і гарадкамі патрэсаўся ад ветру на сьцягох бялы ожал і абуджваў магнацкія мары аб Дняпры, на ўсходняй ускраіне гэтай маладой дзяржавы от што было.

Бітым гасьцінцам ішло двое людзей. Паабапал дарогі густа сталі вёскі, значыцца, дарога была вельмі выгадная старцом і ўсім бяздомным вандроўцам. На гэтых вандроўцаў, або на старцоў і былі падобны гэтыя два мужчыны. Адзін быў зусім стары, гэтакі стары, што, здаецца, мала што бачыў навокал сябе. Прынамсі ён часта пытаўся свайго спадарожніка:

— Што гэта, Сымоне, чалавек унь стаіць, ці гэта бяроза гэтак убок адскочыла ад гасьцінцу?

Або:

— Гэта едзе унь хто, ці кусты?

Барада была ў яго нізка, але няроўна, выстрыжана—чалавек, відаць, ня любіў насіць барады. Адзеты ён быў у нейкія транты, апіраўся на кій, адно што ня было торбы ў яго цераз плечы. Другі яго таварыш быў маладзейшы, вышэйшы ад яго ростам, ішоў бяз кія і ня быў у лапцях, як яго стары спадарожнік, а ў вылатаных юхтовых ботах. Транты на ім былі крыху зграбнейшыя.

Быў дзень халодны—позьняя восень. Хмурна было, суха, дзьмуў вецер. З мерзлае зямлі ўзьнімаўся пякучы пыл і калоў твар як голкамі. Часта да пылу дамешваліся сухія крупы з сьнегавых хмар, тады стары, небарак, аж стагнаў, перастаўляючы ногі, але йшоў, не падаваўся. Ён быў, відаць, вельмі цягавіты і да ўсяго звыклы.

— Ці далёка? Га, Сымон?

— От яшчэ крыху. Вежаў ня відаць яшчэ.

— То можа яшчэ вельмі далёка? Нічога я ня бачу, пазнаць месца не магу.

— Не,—пацяшаў яго таварыш,—з трэйцяга ўзгорку павінна ўжо відна быць ратуша.

---

[1]) Гл. Узвышша №№ 4, 5, 6-7.

Яны абодва йшлі як нехаця. Адно добра было, што скавыш біў ім у плечы, а ня ў твар.

Поле ўсё было шэрае ад мерзлае зямлі, рухавае ад ветру і сьнегавых круп.

Двое міналі вёскі, хутаркі, паглядалі ўсё наперад, як-бы чакалі там чагосьці гэтакага, што адразу паможа ім забыцца на гэтакую нялюдзкую дарогу. Скрозь, паабапал дарогі, упоперак да яе ішлі палосы поля, вузкія як грады і доўгія як сама гэтая дарога. На частых межах шастаў пад ветрам быльнёг, на гарбох загонаў тырчэла незазябленае іржышча, часамі гаспадар, відаць было, пачаў быў зябліць, але чамусьці ня скончыў—так і пярэсьціліся даўжэзныя стужкі запалавелае ральлі то там, то сям.

Жытняя рунь часамі была ля дарогі. Вецер паразганяў па ёй салому, што гаспадары пацярусілі кожны на сваім загоне, каб паказаць, што тут пасеяна і што тут ужо нельга пераганяць быдла. А некаторы гаспадар, дык старэнна выцярусіў з саломы крыж—хай, зна чыцца, пан-бог паможа чалавеку гараваць з гэтым загонам, з гэтым шчуплым насеньнем, з гэтым канём, з гэтаю драўлянаю бараною...

А тут от была й жывёла гэтая: дзе-ні-дзе па ўмерзлай руні хадзілі дробныя каровы, выхвастаныя за лета сурамцам коні—дробнае стварэньне, нявольніцкія нявольнікі.

— Нешта-ж канца няма дарозе,—абазваўся стары.—Га, Сымон?

— Канца няма? Будзе канец. Так-жа ня будзе. Унь за тым узгоркам, здаецца, павінна пайсьці панскае поле, а там і ратуша блісьне перад вачыма.

— Ой, ды здаецца-ж раней ня было ў гэтай старане гэтакіх дробных загонаў. От народ распладзіўся!

— Ну, пэўна.

Але Сымон адказваў нехаця. Вельмі можа быць, што ён нават злаваў крыху на свайго старэйшага спадарожніка, бо той, ведама зусім стары, ледзьве перастаўляў ногі, а Сымон—ці ня мог гэта ён перамагчы сваю змардаванасьць гэтак, што ў дзьве столкі паддаць ходу? Прынамсі ён ішоў увесь час на крокаў тры ўперад за старога, а часамі й на крокаў дзесяць выпярэджваў, дык тады спыняўся і чакаў, пакуль той падклыбае пад яго.

— Позна ўжо, ці што? Га, Сымон?

— От можа цераз паўдня.

— Прыгледзься, гэта ня ратуша відна? Га, Сымон?

— Не яшчэ.

— А можа нам у гарадок і ўвайсьці не давядзецца!

— Чаму?

— Як-то чаму. А можа-ж ён па той бок мяжы?

— Не, ён па гэты бок мяжы. Колькі-ж людзі папагаварылі табе, а ты ўсё адно чаўпеш.

— То вёска наша па той бок.

— От гэта дык будзем бачыць... Хто яго ведае... Можа й па той.

— А божа мой, божа, дзе-ж тады прытуліцца!

Цяпер стары раптам паддаў ходу. Застукаў кіем па мерзлай зямлі, дробна закалываў плячыма.

— От так, от гэтак,—падбадзёрыў яго Сымон, але ўжо хвілін праз пяць стары йшоў зноў гэтак, як і раней. Зноў ён глядзеў адно сабе пад ногі, тады як ягоны спадарожнік не прапускаў вокам ніводнага дрэва навокал, ніводнага ўзгорку.

От і панскае поле, добра ўбаранованы палетак і на ім добра паўзыходзіла жыта.

— Унь, стары, відна ратуша.

— Дзе? дзе? ага! Дык ніякае мяжы, Сымоне, ня відаць?

Сымон не адказаў.

— А, цяпер я пазнаю. Гэта-ж унь двор нашага пана?

— Але.

— Ага, от як, шпарчэй хадзем. У гарадку спыняцца ня будзем, гэтак-ж зараз наша вёска.

Стары зноў на хвілін пяць шпарчэй рванўўся.

Як увайшлі яны ў горад, як прайшлі першую драўляную вуліч-ку, прыселі ля трухлявага дамка, нізкага, крывога, да якога была прыбудавана доўгая стадола. Неўзабаве адчыніліся ў стадоле дзьверы; і адтуль выехала некалькі сялянскіх фурманак. Пасьля загрукаў ка-лясьмі адтуль балаголскі воз. Сымон глянуў у стадолу. У прастор-най цемені ўбачыў ён старога гэбрэя. Ён падграбаў каліва сена, што асталося пасьля фурманак. Убачыўшы ў варотах чалавека, ён пачаў прыглядацца.

— Ага-а-а, гэта Чуйка, Сымон?

— Што ты, не пазнаў мяне, ці што?

— Хто гэта мог думаць, што ты на сьвеце жывы яшчэ.

— Я й сам ня ведаю, ці жывы я, ці...

— Ай, яй, яй, які ты зрабіўся. Ай, ай, ай...

— Зрабіўся. Бачыш-жа.

— Дзе-ж ты быў дагэтуль? Няўжо?...

Сымон бачыў, што стары гаспадар стадолы спалохаўся і баязьлі-ва зірнуў з-за вушака на вуліцу:

— Увайдзі, Сымон, у сярэдзіну, а то калі сабака ўбачыць які, дык тады будзе мне цераз цябе капут... Бо ты-ж...

— Бо я-ж... Ня бойся, я адседзеў сваё. Цяпер мяне выпусьцілі з астрогу. Ці дрэнны з мяне быў заложнік, ці я за гэтулькі год ад-быў сваю кару за свае злачынствы, што захацеў быў не аддаць пану тых коп трох жыта, што нажаў на скарбовым полі за рэволюцыяй, але мяне зусім пусьцілі. Пехатой іду.

— Зайдзі, зайдзі хутчэй, кажу табе! Сымон!

Дык там на вуліцы яшчэ стары Нямira.

— Дык чаго ён сядзіць там, Гвалт! Гукай яго сюды! Вы згубіць мяне захацелі... Пасталі, як на выстаўку, перад маімі дзьвярыма.

Дык і Стары ўвайшоў у стадолу.

— Ты, Ёсель, скажы адно нам, дзе мяжа прайшла. Па які бок наша вёска?

— Ваша вёска? Сказаць праўду, дык яна і там, і тут.

— Як гэта?

— Як я табе кажу. Папалам пашла вёска. Мяжа йдзе гэтак, як ідзе рэчка. Па рэчцы мяжа пашла. Дык па той бок рэчкі там, а па гэты тут. Ой колькі год ты ня быў тут. Ты мо' забыўся ўжо, дзе твая вёска? І ты гэта ўсё ў астрозе сядзеў? А дзе-ж больш людзі, вас-жа тады больш забралі?

— А от стары са мною прышоў. От табе й больш людзі.

— Што ты кажаш!

— Кажу. Рэшта—то памерлі, то ўцякаць спробавалі, дык іх—няма ведама дзе пасьлл гэтага дзелі.

— Ай-ай-ай... Мяжа па самай рэчцы. Па той бок рэчкі поплаў, а за поплавам кавалак вёскі там, а па гэты бок поплаў і за ім кавалак вёскі тут... Я-бо забыў, у якім канцы вашы хаты.

— У гэтым канцы.

Дык невядома, ці гэта стары Ёсель ня ведаў нічога, ці так змоўчаў, але ўжо больш ён мала што гаварыў. А напэўна, дык гэта ён баяўся, каб ня ўбачылі, што ў яго ў стадоле гэтакія госьці.

— І ніякіх я вестак ня меў ад сваіх. Дзе мой Рыгор, можа ты ведаеш, Ёсель?

— Не, ня ведаю... А-а-а, успомніў, ён на лесапільні працуе... Раней працаваў...

— А цяпер?

— А цяпер, здаецца, не. (Ёсель шкадаваў Сымона, каб сказаць яму ўсё адразу.

— А дзе мае?—запытаў нарэшце Няміра.

— Дзе твае? Твае—дык яны, сказаць табе, на тым баку. У бальшавікоў яны. Павал твой там і жонка яго там. А што яны там робяць, як яны там жывуць—хіба я ведаю?

— А божа мой, божа, дык-жа мне няма да каго варочацца. Адзін буду як пень, у хаце.

Ён зусім абязглузьдзеў гэты стары. Ён сабе ўяўляў сваю хату гэтак, як была яна калісьці, адно што нікога ў ёй няма.

Цяпер ужо Ёсель найбольш маўчаў, відаць, ён стараўся, каб не сказаць лішняга; можа нават, жадаючы ўсялякага дабра гэтым людзям, ён усё-ж хацеў, каб яны хутчэй пашлі ад яго. Ён ім вынес з хаты паесьці, яны гэта ўзялі з сабою і зараз-жа засьпяшаліся ў дарогу. Праз гарадок яны прайшлі вельмі павольна—усё прыглядаліся. Яны бачылі, як на ратушы тросься бялы ожал на сьцягу, як паліцыянты стаялі на скрыжаваньнях гэтых глухіх вулічак. На рынку стаяла крыха

сялянскіх фурманак, яны ўдвух прыглядаліся, ці няма тут знаёмых. Нікога знаёмага ня ўбачылі. Зазванілі ў касьцеле, пасьля ў другім.

— Раней-жа тут ня было другога касьцелу,—сказаў сам сабе стары Няміра...—Ага, ці ня кляштар гэта адчынілі... Ага, так яно, гэта-ж адтуль звоняць. Глянь, Сымоне...

Стары перасіліў сваю змардаванасьць, ён-жа варочаўся пасьля гэтулькіх год пакуты дадому! Яго-ж хата недзе зусім блізка чакае яго! Ён хутка забыўся, што нікога ў ёй там няма і ён адзін там будзе. Ён проста як пачынаў дзяцінець у гэтыя хвіліны.

Яны ўдвух перайшлі ўпоперак сустрэчную вуліцу і ў блізкім канцы яе сапраўды ўбачылі, што стары будынак колішняга бэрнардынскага кляштару выбелены нанава; вапна закрыла абшарпаную цэглу.

— Хадзем хутчэй,—тузянуў старога Сымон Чуйка.

— Хадзем.

Яны паволі пашлі з гарадку, але на трэйцім кілёмэтры іх запыніў конны паліцыянты, ці так нейкі вайсковец, яны нават добра й не разабралі. Яны-ж ішлі на самую мяжу і ён паглядзеў іхнія паперы. Тут ім стала вядома, што ім трэба вярнуцца назад, бо так яны ня маюць права йсьці ў прымежную вёску—трэба ў гарадку справіць паперы на гэта. Гэтакім парадкам ім давялося некалькі тыдняў блытацца па гарадзкіх вуліцах, прасіць ласкі ў ва ўсялякіх знаёмых і незнаёмых падпанкаў. Нарэшце старому далі права вярнуцца ў родную вёску, а Сымон Чуйка быў маладзейшы, ён яшчэ цьвёрда хадзіў, моцна гаварыў, дык яму далі права адно выправіць у сваю вёску старога Няміру аднаго. Тады Чуйка кінуўся ў лесапільню шукаць свайго Рыгора. Няміра ў тую самую хвіліну, як атрымаў права быць у сваёй вёсцы, рушыў туды.

Дзень быў хмуры, востры холад за гэтыя тыдні ня зьменшыўся, нападала сьнегу. Стары, хоць не адпачыў, пакуль дамагаўся папераў, але ногі ягоныя адышлі, і ён нешта вельмі хутка пасьля таго, як вышаў з гарадку, убачыў перад сабою хвойнічак і крыху ўлева сваю вёску. Некалькі разоў у яго глядзелі паперы, ён ужо ўразумеў, што гэты хвойнічак, у якім калісьці была тая Гушкава хаціна, цяпер па той бок мяжы і там быць ўжо няма як—значыцца нельга бачыць ні Паўла, калі праўду Ёсель казаў, што ён астаўся ў бальшавікоў і не вярнуўся дадому, ні Марылькі, ні сваяка Леапольда Гушкі.

А от і вёска; гэты кавалак яе, па гэты бок рэчкі. Паабапал рэчкі паплавы, а на рэчцы, дзе была калісьці грэбля і масток, нічога цяпер няма. Нічагуткі! Вада паўз берагі нават змыла і сьляды колішняга мастка. Дарога зусім зарасла травою, і скрозь паўз рэчку стаіць вайсковая варта. Стары Няміра добра ўбачыў у тым месцы пагранічніка.

Гэта ўсё ён убачыў яшчэ з гасьцінцу. І цяпер толькі заўважыў, што на гасьцінцы ў яго пад нагамі мерзлы трыпутнік і спарыш. Ніводнае каляіны. Ніхто тут ня едзе. А куды-ж ехаць? Ён цяпер як прытомнеў, вочы нешта добра пачалі сьвяціць тут у сваёй старане, а

ля свае вёскі. Хмары сплывалі з неба, неба ясьнела, браўся большы мароз. Было яшчэ зусім рана, паўдня яшчэ ня было. Вось і вуліца. Сэрца старога пачало калаціцца, як убачыў ён гэтую вуліцу. Ніводнае хаты не пазнаў. Дый хат было вельмі мала. Стары пазнаў, што хаты гэтыя як-бы нядаўна людзі пабудавалі—яшчэ мох матляўся з пазоў на ветры, але дрэва найбольш было старое, відаць, людзі выпадкова пакуплялі будову і трухлявую папераносілі. Тры ці што хаты былі з новага дрэва, малыя хаты, з малымі вокнамі. А чый дзе пляц, чыя хата? Цяжка было пазнаць старому. Бо паміж хат пазаросталі зельлем печышчы—лебяда і верас схлі на марозе. Што-ж гэта? Стары як-бы варочаўся да страчанае ў думках сапраўднасьці. Мала што чуў ён ад кагосьці некаторага году, што вёска была тады спалена, але-ж ён прывык за век свой да бягучасьці жыцьця! Вёска спалена была, але людзі зноў зьменяць твар попелішча, зноў-жа нейк паасталёўваюцца. І думкі пра спаленую вёску тады ў яго ня вельмі доўга трымаліся ў галаве. Гэтаму яшчэ спрыяла й тое, што самому пра сябе яму трэба было думаць, як не прапасьці ў гэтакай бядзе, у гэтакай астрожнай пакуце. Цяпер ён стаяў у канцы ціхай вуліцы, ня ведаючы, куды падацца. Ён палічыў хаты і попелішчы ад самага канца вуліцы і чацьвёртае пазнаў сваё. Раскіданая печ зусім была размыта дажджамі, усё пазаростала і адзічала. Як аслупянелы стары, доўга стаяў на адным месцы, пакуль стаў заўважаць адзнакі таго што жыцьцё бяжыць. Цяпер ён заўважыў сьляды гэтае бягучасьці.

Трэба было кінуць вокам крыху далей ад гэтых хацін. Там, дзе на разьлегласьці раней яшчэ быў расьсеўся Мазавецкі з сваім новым хутарам, цяпер быў проста-такі цэлы фальварак. Стары Няміра спачатку, пакуль здагадаўся, аж не пазнаваў нават мясцовасьці з-за гэтага. А пасьля ўжо, як памеркаваў і здагадаўся, да яго пачала варочацца ясная думка пра ўсё і кемлівасьць. Ці Мазавецкі забагацеў гэта яшчэ больш, ці панок які асталяваўся на гэтым хутары? Да ранейшага новага мазавецкага дамка быў прыбудаваны яшчэ адзін, большы за той, ранейшы. Навакол дому скрозь стаялі будовы, нейкая хата ля стайні, ну проста-такі, і няйначай, офіцыйна парабком.

Там, ля гэтае сялібы, быў вялікі кавалак поля як скарбовага ўсёадно: бяз меж і загонаў. Там-жа былі раней радавітыя сялянскія палосы, здаецца, нават і самога Няміры поле кратаў цяпер гэты польны абшар! За гэтым фальваркам будаваўся другі. Быў забудаваны ўжо, адно без агароджы яшчэ. Стары Няміра адубеў, стоячы на скавышы, ня бачачы людзей на пустой вуліцы. Недзе блізка, у пуні, чуў ён, шастала церніца, ён падаўся туды. Там яго спачатку не пазналі, пасьля жанчына прыбянтэжылася, пазнаўшы яго—гэтак усё ёй было нечакана. Хто думаў, што ён яшчэ жыве гэты стары? Ён зайшоў у хату; насыходзіліся людзі яго распытваць, а ён ужо ня мог расказаць усё пра сябе як мае быць. Барада яго дрыжэла, рукі трасьліся, пакуль ён адбываў з колішняю суседняю сям'ёю, полудзен. Яго ўсё цягнула

пайсьці зноў глянуць на попелішча свае хаты. Гэта ён зрабіў пасьля таго, як адагрэўся ў хаце, хоць ламата ў касьцёх якраз тады й пачалася. З свайго попелішча ён бачыў цяпер па той бок блізкае мяжы каржакаваты хвойнік, другую палову вёскі, ля яе новы мост цераз рэчку, замарожаныя паплавы. Там недзе Павал! Марылька! Леапольд Гушка з сынамі! Усё гэтак блізка, хоць ты вазьмі ды пайдзі туды. Нейкі ўздым апанаваў яго. Ён як пашоў назад у хату, дзе быў кагадзе, разгаварыўся з людзьмі, пачаў як умеў расказваць, распытваць. Перасільваў ламату ў касьцёх і стараўся сядзець на лаве. Гэтак-жа у хаце, і ўсе суседзі ўжо ведалі, што убачыў ён некалькі астрогаў за гэтая гады: ён нават цяпер сам ня ведаў, ці гэта ён усё чакаў суду над сабою, ці ўжо яго былі засудзілі. Як была яшчэ вайна, дык завезьлі тады ўсіх арыштаваных у адмысловы лягер, а пасьля вайны пашлі яны па астрогах. Сам-жа ён даведаўся, што нездарма ў Мазавецкага цяпер гэтакі фальварак—вёску пагналі на хутары. А тут як ты на той хутар пойдзеш, маючы адну палоску і трухлявую хату? Як ты гэтую хату перанясеш, каб яна цэлая была, і за што ты яе перанясеш? Ды й які там будзе хутар на адным загоне, на якім і так невядома што сеяць—не хапае месца, каб пасеяць усяго, што трэба сеяць гаспадару. Дык народ што робіць! Народ выпускае сваю зямлю ў арэнду, а сам ідзе куды на старану шукаць работы. А работы гэтае нідзе ня чуваць нават. Дык можна сказаць, усе пашлі за парабкоў у панскія двары. А то яшчэ й гэтак: на тутэйшую зямлю папрыяжджалі нятутэйшыя людзі. З сапраўднае Польшчы папрысылалі іх. Унь і той фальварак, што будуецца ля Мазавецкага фальварка, ведаў цяпер Няміра, належыць гэтакаму асадніку. Той хутар, што яму далі, ён размахнуў ва ўсе бакі, заарандаваўшы навакольную сялянскую зямлю, і наняў парабкоў. Гэтакім парадкам тутэйшыя людзі пашлі за парабкоў рабіць на сваёй уласнай зямлі. Гэта ня тое, што багацейшыя, хоць сабе й тутэйшыя людзі! Тыя дык могуць пайсьці на хутар і там не гараваць. Гэтакі—дык яшчэ й прыдбаць больш можа. А от тут гэтыя хаты, яшчэ ўсё чакаюць, няма ведама што ім рабіць. На вясну таксама мусіць давядзецца ў парабкі падавацца. А некаторыя нават пасьля таго, як калісьці ў вайну вёска згарэла, дык нават і не пазабудоўваліся—лес дарог, помачы—ніякае, дык так і парассыпаліся па сьвеце няма ведама куды за ўвесь гэты час.

Няміра нарэшце стаміўся слухаць. Ён папрасіў, каб яму паслалі дзе. Гэтак ён перабыў, перастагнаў некалькі дзён у гэтай хаце, пасьля перайшоў да іншага суседа. А пасьля яшчэ да аднаго... І гэтак ён перабываў у ва ўсіх вяскоўцаў. Нарэшце перайшоў у суседнюю вёску, жывячыся паміж людзей. Пасьля падаўся яшчэ далей, страшна нудзячы па сваім попелішчы, па сваім Паўле, па сваіх блізкіх. Праз некаторы час ён ня вытрымаў і пашоў у той бок, дзе за рэчкаю астаўся другі канец вёскі. Ён нават ужо нейк дайшоў амаль што не да самае драцянае загарадзі, як яго спынілі і пагналі назад. У

гарадку ён сядзеў у новым, нядаўна забудаваным, астрозе шмат нешта часу. Некалькі разоў яго дапытвалі, ён ужо ледзьве жыў, ледзьве гаварыў. Яго зноў варочалі ў астрог і ён ужо як у няпрытомнасьці адно разглядаў людзей навокал сябе. І ці сапраўды ён нікога знаёмага ня бачыў, ці не пазнаваў. А пасьля пачалі трапляцца яму знаёмыя. Першы—дык гэта Сурвільчык. Яго ён не пазнаў адразу (вядома, прайшла маладосьць у чалавека), а пасьля як пазнаў, дзівіўся ўсё—ён-жа ў другую рэволюцыю пашоў быў ваяваць зусім не за Польшчу, а за Расію, гэта стары цяпер успомніў. Памяць яго ўсё добра трымала ў сабе, ня гэтак, як цяперашняе ўсё, што не магло ўжо надоўга і глыбока аставацца ў галаве; толькі сэрца ягонае не пакідала сьціскацца ад нуды, бяды й гора. Сурвільчыка ён убачыў у жандарскай канцэлярыі, адкуль выводзілі яго пасьля допыту. Сурвільчык яго не пазнаў. Стары можа й пачаў-бы прасіць яго, каб той памог яму што, але той вельмі шпарка прыйшоў, адно нейкія жандарскія шнуркі бліснулі на ім. Другі, каго Няміра пазнаў, быў сам Мазавецкі. Яго як войта выклікалі, каб ён пасьведчыў, што гэта сапраўды чалавек з падуладнае яму вёскі. Той пазнаў Няміру адразу і пасьведчыў. Няміра пачаў прасіць яго памагчы яму і ён зрабіў ласку ў імя таго, што калісьці яны разам аралі зямлю ля аднэй вёскі, хоць адзін параконным плугам, а другі нейкаю ламачынаю,—ён расьпісаўся, што Няміра заўсёды жыў у гэтай самай вёсцы, пакуль не забралі былі яго той раз. Пасьля гэтага Няміра яшчэ шмат сядзеў, пасьля, ўбачыўшы, што стары напэўна доўга не пажыве на сьвеце, выпусьцілі і ён расьпісаўся як умеў, што далей гарадку ў бок дзяржаўнае мяжы ніколі ня пойдзе. А цэлы год ня мае права нават і з гарадку нікуды рушыць. Гэтакім парадкам неўзабаве людзі пачалі заўважаць ля касьцельных. кляштарных і царкоўных дзьвярэй, у старэчым натоўпе, новага жабрака. Ён быў зусім сівы, стаяў заўсёды нейк няспрытна крыху наводдалек ад усіх сваіх сяброў, не маліўся, не сьпяваў нічога, а моўчкі трымаў працягненую руку. Зачырвоненыя і мокрыя вочы яго глядзелі ў зямлю, а сівая галава трэслася. У кірмашныя дні ён хадзіў па рыначным пляцы паміж вазоў, і знаёмыя сяляне не давалі яму памерці з голаду.

2. Маладога Чуйкі няма на лесапільні

Не сказаць, каб Сымона Чуйку вельмі аглушыла навіна, што ягонага Рыгора няма на лесапільні ўжо можа больш за тры гады. Чалавек звыкся з гэтакаю справаю, што ніколі ня выходзіць яму гэтак, як добра. Апроч таго, ён як-бы быў да гэтага падрыхтаваны тым, што бачыў навокал сябе. Шмат зямлі ён бачыў пабітае на хутары, шмат бачыў, як выраслі новыя фальваркі, а сялянскія загоны яшчэ больш падрабнелі. Асаднікі сядзелі на лепшых мясьцінах, парабкі цяглі ярмо па панскіх дварох, зьмянялася ўсё, а разам з тым здавалася, што ўсё гэтакае спрадвечнае, улягаванае.

Ён убачыў, што колішняя тая старая лесапільня стала большая, рабочых у ёй пабольшала, лесу яна пераводзіць больш, як калі раней. Лес скрозь паўз гарадок высякаецца, вывозіцца няма ведама куды. Лесавыя высечкі ні новым лесам не засяюцца, ні пад поле не выраблюцца—хіба гэтак хапае людзям зямлі тут?

Поліцыянты, жандары стаяць у кожнай вёсцы, панскія стражнікі езьдзяць па лесавых каморах, паплаўнічыя з бізунамі пазаціскалі ў сівец вясковыя паплавы і ў камяніцы і ў лагі сялянскія загоны. Вецер круціцца ў быльнягу на ўдзірванелых межах; натоўпы старцоў стаяць на касьцельных цьвінтарох.

Ён усё агледзеў, убачыў усё, пасьля астрогу, Сымон Чуйка. А ў вёску сваю ён так і не папаў, ня мог нават глянуць на яе. Яму сказалі, што нічога ён там, што хацеў-бы, ня ўбачыць, нічога ня знойдзе. Хлопец яго з лесапільні не пашоў туды, ён гэта ведаў. А сям'я яго—недзе на тым баку мяжы, людзі ведалі гэта і сказалі яму. Як тады загналі яго былі разам з усімі кудысьці далёка, і як мяжа пачала праходзіць, сям'я збаялася, што й за яе возьмуцца з-за яго. І яна падалася на той бок. А дзе яны там, і што яны там робяць? А Рыгор яго так і прабыў польскім абозьнікам нешта вельмі доўга, ніяк нельга было яму выбрацца з самае гушчырні польскае арміі. А як вярнуўся ён дадому, попелішча ўжо зарасло травою, некаторыя людзі ўжо думалі, з чаго тут пачаць забудову; а нікога свайго тут ён ужо не знайшоў. Можа ён тут і ня быў-бы, каб ня думка пра бацьку. Недзе ў астрозе астаўся бацька, і можа яму ўдасца што небудзь памагчы яму? Як гэта можа быць, нельга было сказаць, але таксама нельга было і пакінуць „старога аднаго". І Рыгор Чуйка, падумаўшы крыху, як узяцца за бацькаўскае кодлішча, як паставіць яго на ногі з попеліщча, махнуў неўзабаве рукою, ні да чога не дадумаўшыся, і пашоў на лесапільню. Яму работу далі былі—а як-жа, ён-жа ваяваў за Польшчу, ён-жа вельмі доўга прабыў у абозе польскае арміі. Гэтак ён умеў паставіць справу. Нельга сказаць каб там ён спаткаў шмат рабочых—пільня ня была вельмі вялікая. Але ўсё-ж, людзі з блізкіх вёсак нашлі тут сабе сякі-такі галодны заработак. Найбольш тут былі людзі тыя, што не маглі ўжо аніяк пражыць на сваіх загонах, былі і такія, што выпусьцілі сваю зямлю суседу хутаранцу, ня могучы выбрацца на хутар, або за якія даўгі аддалі сваю зямлю на час, ці й назаўсёды пану асадніку. Былі панскія парабкі, звольненыя з працы. А найбольш, дык тут церліся людзі і з вёсак, і з гарадку, якім не хапала работы. Гэтая глухая мясцовасьць больш як якая іншая не магла даць ім заработку. Яны трымаліся блізка пільні, маючы надзею, што яна стане большая і больш запатрабуе людзей.

Цесьляры не знаходзілі работы—ніхто нідзе не будаваўся. Лес, апрацаваны на пільні, некуды йшоў. Гэтак гінуў лес ля гарадку. Мясцовасьць зьменьвалася дарэшты. Скрозь мясцовасьць то драбілася на яшчэ меншыя загончыкі, то зьбіралася ў асадніцкія фальваркі і

заможніцкія хутары. Восенны вецер гнаў па дарогах пыл, шастаў у быльнягох на шырокіх межах, плыў па верхавіньні старасьвецкіх бяроз на пустым гасьцінцы. Ваўкі вылі начамі ў кустох, дзе пад месячным сьвятлом бялявіліся адно сьвежыя пні ад лесу. Там адбываліся панскія і паўпанкаўскія паляваньні. Рысістыя коні жавалі цуглі, гонячы пыл з пад-колаў панскіх фаятонаў, скарбовыя прыганятыя, стоячы ля дарогі над парабкоўскім каркам, зьнімалі шапкі перад гэтымі фаятонамі, з кляштарных і касьцельных амбонаў гаварылася казань, званы праводзілі сваімі галасамі ў вечнасьць кожны дзень. Парабкі цягнулі вужыжча свае працы на панскім полі праз каторы ўжо век, праз доўгія вякі, ад бацькоў, дзядоў і далей з глыбі цёмнага часу. Каравыя анучы, вечнае зрэб'е, лыка; гора и бяда—спрэс засланялі сьвет і ніякае прасьветласьці за імі ня відаць у гэтым панстве. Жэч Паспалітая асталявалася тут у фальварках і панскіх маёнтках, з магнатамі, лёкаямі, падпанкамі, войтамі і падвойтычамі, і скарбовымі прыганятымі і калі ня з прыгоннымі нявольнікамі, дык з галоднымі спрацованымі парабкамі. Рыгор Чуйка прайшоў шмат мясцовасьці і пазнаў усё гэта гэтак выразна, як пазнаваў цяпер тое самае ў зьмене твару зямлі тут ягоны бацька. Ён знайшоў тут, на панскай пільні, сваіх людзей. (Панская пільня! Яна належала пану, а трымаў яе ад пана і багацеў з яе нейкі падпанак з гарадку).

Сымон Чуйка і сам ля пільні чакаў няма ведама чаго, разам з усімі тымі, што церліся ў гэтай мясцовасьці, у гэтым кутку, поблізу свайго аселішча. Цесьляры з сякерамі выходзілі кожную раніцу да гарадку, чакалі там на рынку, калі хто-небудзь з гарадзкіх мяшчан пакліча іх раскалоць шурку дроў, муляры дык нават выходзіць нікуды не адважваліся—нашто яны каму трэба? Кожны, хто меў дзе работу, дрыжэў за яе, трымаўся яе.

Аднойчы Чуйка перабыў ля пільні аж да канца работы на ёй. І тады, перад змрокам, пачаў распытваць у людзей:

— Ці магу я знайсьці тут Чуйку Рыгора? Ён тут недзе ці працуе, ці працаваў.

Яму адразу адказаў хтосьці з рабочых:

— Э, яго тут няма цяпер.

— А дзе ён?

— Дзе ён? (Чалавек паглядзеў на Чуйку нешта вельмі пільна. Ён убачыў перад сабою высокага чалавека, абарванага, змучанага, але з жывым бляскам у ваччу).—А на што вы пра яго пытаеце? Вы ведаеце яго?

— Ці ведаю яго? Гэта мой сын.

— Вы Рыгораў бацька? А вы дзеля яго прышлі, ці самі работы хочаце дастаць? Вы недзе значыцца зблізку адсюль? Рыгор-жа быў тутэйшы.

— Скажэце мне, дзе мой Рыгор. А тады можна й пра работу пагаварыць. Калі можна—я стану на работу.

— Работы тут няма, а Рыгор ваш няма ведама дзе цяпер.

— Як гэта?

— Так што ў нас была забастоўка, мы спрабавалі дамагчыся, каб падбольшылі нам заработак. Пільня стаяла два тыдні. Мы гэта пачалі наўмысьля тады, калі пачалася была забастоўка лёдзінскіх ткачоў, і калі былі забастоўкі ў Вільні і ў Беластоку...

— Ну дык што...

— Дык Рыгор Чуйка тут пачынаў усю справу, а канчалі мы ўжо без яго. Ён быў за старшыню забастовачнага камітэту, а канчалі забастоўку мы ўжо без старшыні...

— А дзе-ж ён?—ня сьцерпеў Сымон Чуйка.

— Яго арыштавалі. Недзе, кажуць, іх усіх разам сабралі ў адным месцы, і з Вільні кіраўнікоў забастоўкі, і з Беластоку, і...

— І нічога ня чуваць больш?

— Члены таго камітэту напэўна ведаюць. (Чалавек зноў пільна агледзеў Чуйку, пасьля падумаў). Але тых камітэтчыкаў не забралі, бо ня ведалі, што яны ў камітэце былі. І цяпер ня ведаюць... Вы сапраўды Рыгораў бацька?

— Дзівак, чалавек,—аж пакрыўдзіўся Чуйка, а пасьля сьціх, хмурна ўспомніўшы сваю астрожную практыку.

— Хадзем сюды, —сказаў чалавек.

Яны пашлі ўбок залеснае вёскі, дзе адно абшары скарбовага поля.

— А як-жа ты, чалавеча, дагэтуль пра сына свайго ня ведаеш, гэтая-ж справа была даўно ўжо? Гэта добра, што ты на мяне нарваўся якраз, я тут даўно працую і ўсё тут ведаю. І Рыгора твайго добра ведаю.

Тады Чуйка Сымон расказаў пра сябе.

— Нічога пра бацьку свайго нікому Рыгор не расказваў.

Чуйка ўсё йшоў моўчкі, чакаючы, пакуль чалавек пачне яму гаварыць пра штосьці, пра Рыгора пра тых, хто яго ведае, або прывядзе яго да тых людзей.

— Я сам,—гаварыў чалавек,—ня тутэйшы. Я сам таксама з гэтае стараны, але далёка адсюль. Нейк адразу пасьля вайны з немцамі, калі з прычыны рэвалюцыі вярнуўся я быў дадому з фронту, дык тады й падумаў сабе—гаварылі ўсё, што я ваяваў за бацькаўшчыну, і генэралы, і палкоўнікі; усё ўгаворвалі нас увесь час ваяваць за яе. А якую я меў бацькаўшчыну з самых малых дзён? Што меў гнілую хату, дык гэта ўжо й бацькаўшчына? Што яна мне дала гэтая іхняя бацькаўшчына? Няма ў мяне гэтакае, як у іх бацькаўшчыны. У таго бацькаўшчына, у каго маёнтак, або хутар добры, або от гэтая пільня, з якое мы йдом. Дык я й пашоў у рэвалюцыю, у самую рэвалюцыю падаўся. Мы маёнтак былі падзялілі, мы былі лесу ўхапілі панскага сабе на новыя хаты. Мы думалі, зямля нам будзе. Ажно-ж, як тут усталявалася гэтая Польшча, дык і тую хату, што быў паставіў з

панскага лесу, разабралі і перавезьлі ў двор, бо пан там сабе сьвірні новыя пачаў будаваць, а я ня меў чым сплаціць пану за гэтае дрэва. Хата, значыцца, вышла не мая, а панава... А мы цяпер, ведаеш, куды йдом? Я табе, чалавеча, зараз раскажу, да каго мы йдом... Дык я тады, як пан хату забраў і ягонае вышла права, я пашоў па сьвеце, забраўшы жонку. Яна недзе цяпер у гарадку ў нейкага аптэкара служыць, а я тут на пільні сяк-так уліпеў праз каторы год. А што далей будзе, дык няма ведама... Дык мы йдом да майго кватэрнага гаспадара, я ў яго ўжо другі год жыву. Таксама прышлося яму хоць жывому ў зямлю лезь. Я то хоць толькі з жонкаю, а ён дык з малымі дзецьмі. Ён ніколі свайго нічога ня меў. Заўсёды быў за парабка. А цяпер узяў ад пана кавалак лясное высечкі на раскарчоўку. Там ён, як яны ў скарбе згадзіліся, мог на гэтай раскарчоўцы паставіць сабе хату, раскарчаваць кавалак зямлі й за гэта карыстацца гэтаю зямлёю колькі год, а пасьля колькі год трымаць у пана ў арэндзе гэтую зямлю, але таксама не за лішне высокія грошы. Гэтакая была ўмова. Ну добра. Чалавек зрабіў, што ад яго трэба было, зямлю выкарчаваў, вырабіў, сама што яе прышла пара сеяць, а пан узяў ды й выгнаў яго адтуль. Баіцца, каб даўнасьць не зайшла, ці што. А тымчасам якая там даўнасьць, калі чалавек яшчэ толькі першы год яе пасеяў, гэтую зямлю. Чалавек, небарак, і туды, і сюды кідаўся, біўся як рыба аб лёд, а нічога не памагае. Куды ні павернецца, усё на панскае выходзіць. Што рабіць чалавеку! З торбаю па сьвеце йсьці? Ён за парабка-б пашоў, дык і так цяпер з двароў парабкоў выганяюць—работы няма. А так работу дзе знайсьці—дык адкуль яна тут тая работа. У горад куды падацца, дык там, добра вядома, і так паўнютка людзей без работы, проста з голаду ўміраюць.

Яны йшлі ня лішне шмат ад лесу. Вёска стаяла на ўзгорку, а пры кустох, дзе пачыналіся сьвежыя пні ад высечанага лесу, стаяла хаціна з старога дрэва, з дробнымі гаспадарскімі прыбудоўкамі. Чуйка згадаў пра колішнюю Гушкаву хаціну.

— Гэта як Гушка той, калісьці,—сказаў Чуйка.

— Гушка? У мяне да Гушкі ліст ёсьць. Ужо другі год ляжыць у кішэні. З Нямецкае Сілезіі прыслаў нейкі Эдвард Лявэр. Адрасаваў сюды. Ён думаў, што ўся гэтая мясцовасьць пад Польшчаю, ажно-ж ня ўгадаў крыху. Ліст тады былі забралі на пошце вясковыя, а пасьля хтосьці прынёс на лесапільню. Мы гэты ліст разабралі ў гарадку—там у нас ёсьць чалавек, што можа прачытаць. Увесь ліст з прывітаньняў да Леапольда Гушкі і з гэтакімі словамі, з якіх, хто гэтак думае так, як той Эдвард Лявэр, дык адразу здагадаецца—„Няхай жыве рэвалюцыя“. Гэты ліст нам усім надаваў адвагі, калі пасьля таго яшчэ ў нас былі забастоўкі. І там, значыцца, людзі думаюць гэтак, як мы і робяць тое самае.

Яны прышлі ў хату. Гаспадар хаты быў чалавек год пад сорак. Ён нядаўна вярнуўся з гарадку.

— Ну што?—запытаў яго чалавек з пільні.

— Ну нічога. Апошні раз я быў там. Нічога ўсёадно ня будзе. Я надумаўся.

Тут ён паглядзеў на Сымона Чуйку.

— Нічога,—сказаў чалавек з пільні,—гэта свой. Гэта, калі памятаеш, Рыгора Чуйкі бацька.

— Ага,—сказаў чалавек нейк, здалося Чуйку, абыякава—гэтакі халодны й спакойны быў твар гэтага чалавека, звыклага да няспынае цяжкасьці таго, што завецца—жыць на сьвеце. І тады, азірнуўшыся на хату, загаварыў пошапкам:—Што-ж, як яно робіцца!? Я надумаўся, я паслухаў людзей, я наслухаўся людзей... Я падамся туды.

— Куды?

— На той бок. Колькі людзей цяпер пашло туды—страх. Што-ж, калі гэтак прышлося—дык чаго я тут буду. У горадзе там людзі казалі, што за гэтыя дні колькі туды народу перайшло мяжу, дык адно некаторых злавілі. А там, кажуць, работы кожнаму хапае, там кожны як дом сабе знаходзіць. Не дадуць мне там зямлі, дык так на работу стану. Або ў калгасах работу мець буду. Унь, мне выразна казалі ў горадзе, што нават наўмысьля недзе ля Вільні, ці ў самай Вільні шмат рабочых папрасіліся каб пусьцілі іх туды ў заработкі. Іх-то ня пусьцілі, а я й прасіцца ня буду. Што мне рабіць больш? Дзе мне дзецца тут? А унь з Амэрыкі, кажуць, туды людзі едуць. Даўней дык у Амэрыку ўсё ехалі, а цяпер з Амэрыкі, і да бальшавікоў. Калі толькі палавіна гэтага праўда, дык і то—чаго мне тут быць, чаго пільнаваць! Што я страчу, калі кіну гэтае пекла? Што-ж, зараз-жа прыдуць з панскае, значыцца, хаты выкідаць. Дык няхай выкідаюць!

— А хто табе казаў пра ўсё гэта?

— Хто мне казаў пра ўсё гэта? Што каму рупіць, то той пра тое й жупіць. Калі мне што трэба пачуць, дык я да таго й прыслухоўваюся. А калі што каму трэба пачуць, дык ён знойдзе каго слухаць. Што-ж, цяпер народ жыве як на пораху. Спадыспаду, значыцца, порах, і сухі вельмі. Народ чакае нечага. Народ рабіць нешта зьбіраецца. Ці на тое гэта вайна гэтакая на галаву ўсяго народу ўсьсела была, каб народ і дагэтуль дурны астаўся? Што, гэта на тое рэвалюцыя была, ды й не адна, каб пан з войтам правілі на маёй галаве сваё права? Унь маю дзяўчынку ня прынялі вучыцца, бо вучылішча ў нас малое. А й што там вучаць. Калі дзіця скажа слова гэтак, як са мною ў сваёй хаце гаворыць, дык значыцца—што?! па-хамскі, па хлопскі загаварыла? А па-польску ня хочаш?! Ну добра, калі ты паляк, дык я-ж табе не затыкаю рота, каб ты пасвойму казаў. Што-ж ты мне мой рот затыкаеш!.. А гэта—дзе я ні быў, усё адно на панскае з гэтаю зямлёю выходзіць. Чаму-ж унь хутаранцам, дык як чорт ім дзеці калыша! І гміна, і бог за іх. Чаму-ж асадніку якому, дык усялякі закон (каб яго ня ведаць!) памагае!

Ён скардзіўся, ён горніўся перад людзьмі, перад сабою, гэты чалавек. Ён ужо ня меў іншае думкі, апроч гэтае.

—А што-ж, чаго чакаць!? Каб-жа гэта са мною адно гэтак? А то-ж куды ні глянь, каго ні паслухай. Усюды гэтак. Няма куды народу падацца, няма за што ўзяцца. Я пражыў век свой ціха з усімі, спакойна з кожным, я адно рабіў заўсёды як чорны вол на сябе, ці на нейкага? Дык-жа й рабіць не даюць. Жыць на сьвеце чалавеку няма як. Хто дужшы, той прутшы. Дык можа й я дужы, а калі гэтая дужасьць у ланцугох? У аднаго во колькі, як у пана, напрыклад, або ў багатыра кожнага, а ў другога—во колькі, аж ня відаць, хоць ты праз шкло глядзі, колькі ў яго там ёсьць чаго. Ды яшчэ я й вінен тут у нечым! Што, гэта з дабра забастоўкі ня спыняюцца па гарадох на фабрыках? Што, гэта з дабра людзі галодныя ходзяць, шукаючы работы? Што, гэта з дабра парабкі ў паноў на работу ня выходзяць, а бунтуюцца? Заціснены ўсе? І каб-жа гэта адно са мною, каб гэта адно тут, а то куды ні глянь, у каго ні папытай, куды ні кінься...

Сымон Чуйка чуў сябе гэтак, што нібы ён і ня прыходзіў дадому адтуль, дзе ў арыштанцкіх лягерах рабіў некалькі год. Сэрца яго нудзела, змучаны, прыбіты, прыглушаны, ён нічога перад сабою ў гэтую хвіліну яснага ня бачыў.

У той вечар ён ведаў, што нездарма прышоў сюды: ён пачуў выразна пра свайго Рыгора. Той самы чалавек з пільні сказаў яму, што Рыгор яго ўжо на волі. Ён, гэтаксама як і раней, кіруе забастоўкамі парабкоў па дварох і рабочых па тутэйшых гарадох і гарадкох. Што ён цяпер, здаецца, тут, чалавек або не адважыўся, хоць і ягонаму бацьку, адразу сказаць гэтакую праўду, або можа й сам дакладна ня ведаў—Рыгор Чуйка цяпер, здаецца, зараз будзе тут поблізу.

3. Ратуша

У нядзелю зранку касьцельныя званы ззывалі народ на мшу. На рыначным пляцы зьбіраўся кірмаш. Да гарадку споўзваліся сялянскія фурманкі з дробным і ня дробным (як у каго) сялянскім набыткам. Да паўдня, пакуль пачалася ў касьцёлах і ў царкве адправа, народу на рынку наэьбіралася ніштавата.

Перад ратушаю на пляцы быў прачышчаны ад вазоў шырокі праход. Поліцыянты аглядалі вазы, выстройвалі ў рад іх на праходзе, узьнімалі крык, калі каторы воз вытаркаў крыху на праход. На ратушы тросься сьцяг з белым арлом, перад самаю ратушаю стаялі людзі, апраненыя ў добрыя ватоукі, у суконныя, добрае работы, буркі. Кажушкі і выцертыя халаты мясьціліся ззаду, прыслухоўваючыся да гутаркі ў натоўпе паважаных гаспадароў у бурках і ватоўках. Нейкі чалавек у кароткай бравэрцы, у глянсаваных ботах—дробныя вусы ўгару, сіняя варшаўка нізка над вачыма—цёрся ўсё ў самай сярэдзіне шляхтаватага натоўпу і ўсё падвільваў ля вусатага чалавека

ў старасьвецкім футры. Гэты вусаты чалавек трымаў рукі ў рукавох, відаць прыемна адчуваючы цяпло, выгоднасьць адзежы. Твар яго рабіў часамі спробы ясьнець ад усьмешкі, калі гэтага вымагаў момант з трапяткое гаворкі чалавека ў кароткай бравэрцы і глянсаваных ботах:

— ...не падыходзь да законнэго ложка! Так закрычала мнішка.

— Што, што гэта было? — усадзіў раптам, і паважна нейк бараду ў натоўп вусаты шляхціц, занепакоены, што спазьніўся на пачатак гутаркі.

— А, пане Мазавецкі!—прывітаў яго хтосьці з паважных людзей Апроч Мазавецкага, яшчэ больш падышло, і кароткай бравэрцы давялося яшчэ лішні раз спачатку расказаць.

— ...Значыцца ўкраліся яны да мнішак і давай шукаць дабра. Грошай шукалі. Рабаваць кляштары ўзяліся. А іх чалавек можа з дваццаць усіх. Ноч, цёмна, а навокал заўсёды дагэтуль было спакойна, дык каму гэта ў голаў, васпане! А мнішка, як толькі падышоў адзін да яе, дзе яна спала, спакойна сказала яму—ня сьмей падыходзіць да законнэго ложка.

— Дык ён што?

— Дык ён што? Дык ён, васпане, і адышоў адразу.

— Не пасьмеў там грошай шукаць? А можа яны там якраз і былі,—падала нецярплівы голас нейкая простая душа, захопленая ня так сілаю слова мнішкі, як романтычнасьцю і прыгодніцтвам усяе справы, і гатовая можа нават пашкадаваць, што ня вышла да канца таемная, а значыцца і цікавая работа нейкага адважнага чалавека, напэўна гэроя.

— А можа яны там і былі? Галава, васпане ў вас!—Перакрывіў яго той, што расказваў,—ведама што яны там былі, гэтыя кляштарныя грошы. Над ложкам у старэйшае мнішкі ўкрыжаваны Езус, а пад ложкам грошы ў гэтакі час якраз хаваліся.

— А што, хіба раней было вядома, што рабаўнікі прыдуць у кляштар?—ня сьціхала простая душа.

— Вядома было. Галава ў вас, васпане! Цяпер гэтакі час, што заўсёды трэба сьцярэгчыся. Што-ж, пад бокам бальшавіцкая мяжа. Мала сюды бальшавікі сваіх людзей перакідаюць рабаваць?

— А хіба-ж гэта ў нас было?

— У нас! У нашым кляштары! А дзе-ж!

— Ай, ах, ах-ах,—адно заахкаў хтосьці.—Гэта-ж трэба, у кляштар увабрацца.

— І то скажэце, васпане, што якраз ад аднаго слова адышоў, як яго хто гарматаю адкінуў. І чаму гэта?

Тут ужо той, што расказваў, і сам ня ведаў, што сказаць, і зрабіў самае лепшае, што мог у гэтакім выпадку—зусім нічога не гаварыў больш, а значыцца дагаворваць прымушаны былі тыя, што слухалі, і гэтакім парадкам неўзабаве стала вядома тут перад ратушаю,

а адгэтуль пашло сярод некаторых засьцянковых жанчын і дайшло аж да касьцельнага цьвінтару, што некаторае ночы на горад меўся быць напад нейкіх грабежнікаў, а мнішка з кляштару мела ад бога шчасьце наперад усё ведаць і, вышаўшы ўночы за кляштарную браму, адным словам сваім выратавала горад ад вялікага няшчасьця. А няшчасьце магло быць вялікае, бо гэтыя грабежнікі былі пасланы бальшавікамі з таго боку мяжы.

— А нікога не злавілі?—пыталі там ужо, ля касьцёлу.

— Злавілі,—знашоўся гэтакі нехта, што ведаў.

— А дзе іх злавілі?

Дык тут пачаліся дакладнасьці. Перш за ўсё знашоўся гэтакі чалавек, што сам бачыў, як сёньня зранку „яшчэ пан пробашч не пачынаў імшы, а толькі пан арганісты граў на арганах гадзінкі, вялі аднаго злоўленага грабежніка. Ён быў пераадзеты за абарванца, і да твару яго была прыклеена барада зусім сівая".

— А куды яго павялі?

— Ну куды-ж яго павінны вясьці. Ведама куды.

— Аааааа!

— Айяйяйяяяяяй!

— От-жа бачыце!

Тымчасам ужо хтосьці гаварыў тут, што бальшавікі больш пана-сылалі сюды сваіх людзей угаворваць народ, каб ён пераходзіў на іхні бок цераз мяжу. Што яны там дакляроўваюць, рай, а ня жыцьцё, а як толькі чалавек туды пяройдзе, дык там адразу становяцца ў яго па бакох два салдаты і гоняць чалавека сеч лес. Гэтак чалавек працуе, пакуль богу душу аддасьць. Дык нават і варона тады ягоных касьцей ня знойдзе.

— Дык чаго-ж народ, дурны, слухае?!—абурылася на народ жонка нейкага гарадзкога паўпанка.

— Што-ж ты з народам зробіш. Народ дурны.

Відаць у гэтым натоўпе не знашлося ніводнага чалавека, які-б прылічаў-бы сябе да народу, бо ніхто не пакрыўдзіўся на тое, што народ дурны.

Тымчасам скончылася імша, і натоўп пачаў разыходзіцца з-пад касьцёлу. Якраз у гэты час з новага гарадзкога астрогу кудысьці павялі некалькі чалавек. Натоўп кінуўся ў той бок глядзець.

— А што, гэта можа тыя самыя?

— Напэўна тыя. Недарма казалі.

Арыштаваных было чалавек чатыры. Сярод іх сапраўды быў стары з сіваю барадою. Пра яго адразу і загаварылі:

— А што! От і той самы стары, што казалі барада прыклеена!

— Э, дык гэта-ж той самы стары, што стаяў заўсёды ля касьцельнае брамы, з працягненаю рукою.

— Што, ён заўсёды стаяў ля касьцельнае брамы? А божачка мой, гэта-ж гэтулькі часу ён быў у нашым горадзе, выглядаў усё, што тут робіцца, і паведамляў на той бок бальшавіком.

— Дык гэта-ж шпіён, калі гэтак

— Шпіён. Дзе шпіён? Каторы?!

Арыштаваных вялі рыначным пляцам проста да ратушы. Сяляне адрываліся ад вазоў і праводзілі іх зіркам. Раптам хтосьці гукнуў з воза:

— Гэта-ж унь Няміру павялі; старога Няміру павялі!

І некалькі чалавек, пакінуўшы вазы, пашлі сьледам. Арыштаваных павялі ў ратушу. Каб прапусьціць іх, натоўп ля ратушы падаўся ўбок і стары сівабароды чалавек, якога вялі, убачыў ля самага праходу вусатага чалавёка ў старасьвецкім футры. Ён трымаў рукі ў рукавох і ня спускаў вачэй з арыштаваных. Стары чалавек раптам загаласіў:

— Пане, паночку Марцынкевіч! Ці пазнаеце мяне! Ласкі прашу, зьлітуйцеся!

Ён ледзьве гэта выгаварыў. Яго штурхнулі далей і праз момант ён ужо, задыхваючыся, паднімаўся ўгару па ўсходах цёмнага карыдору. Натоўп стаяў перад ратушаю. У натоўпе гаварылі зноў пра ўсё тое, пра што гаварылі тут раней і пасьля каля касьцёлу. Цяпер ужо і іншыя думкі тут падаваліся—народ сабраўся сюды і з кірмашу. Хтосьці моцна сказаў:

— Які-ж гэта шпіён! Гэта-ж стары з нашае вёскі! Ён ледзьве ходзіць!

Кароткая бравэрка ў глянсавых ботах зноў штосьці тлумачыла ў натоўпе.

З ратушы вышаў белавусы пан. У карыдоры ён разьмінуўся з арыштаванымі. Стары Няміра, як ужо быў прыбіты і прыглушаны, а ўсё-ж не пасьмеў абазвацца перад знаёмым панам пра літасьць. Можа-б ён гэта і зрабіў-бы крыху пасьля, каб пан гэтак шпарка не прайшоў паўз яго. Цяпер, вышаўшы на ганак і сыходзячы з яго, пан акінуў вокам натоўп ля ганку і пашоў яшчэ шпарчэй.

— Быдла,—мармынуў ён, гледзячы на натоўп.

(Канец у наступным нумары).

Віктар Казлоўскі

Збожжам запахла зямля

І чаму-ж
я так занепакоены?
Не ўсядзець на месцы,
не заснуць.
Не таму, што кроплямі
ў пакой мой
Налівае май
вішнёвую вясну.
Я ўстрвывожан
думамі пра далі,
Дзе зямля
прапахла потам сёл,
Дзе сястра быдлячы гной
рукамі раскідае
І варочае сахой
сыры пясок.

* * *

Не магу я сягоньня заснуць.
Я сягоньня замучан бяссоньніцай,
Я хачу паглядзець на вясну,
Што цьвіце на калгасных ваколіцах.

Усю ноч я ў раздум'і ляжу.
Мне палеткі далёкія мрояцца.
Адзінокую ў полі мяжу
Прамінула сталёвая коньніца.

Будзе маці стаяць і журыць
А сястра за сахой увяродзіцца.
Ля іх ніў запяюць трактары
Пераможную песьню гордасьці.

Будуць дружныя косы зьвінець,
Падпяваючы вострым касілкам.
І узьнімуцца дужасьцю плеч
Копы траў на хаўрусных насілках.

А вы будзеце горам жанчын
Праклінаць не па сілах работу.

І тужлівы ваш сьпеў прагучыць
Над Узьдзенскім адцьвіўшым балотам.

Маці, маці, ня лёгка табе
Валачы на плячах сена копы.
У калгасе вам будзе ляпей:
Калектыўная сіла і клопат.

* * *

Я і сам бадзяўся паміж межамі,
У жытох губляючы тугу.
Быльнягу сярпамі горла рэзалі
Палыном палілі прагу губ.

Дні-стагодзьдзі швэндаліся, посьцячы,
Над матыгамі гадуючы гарбы,
У каляскаx плакалі ля постаці,
У жалейку граючы з вярбы.

Ці-ж сягоньня песьнямі даўнейшымі
Будуць жнеі жніва услаўляць.
Не распальваць сёньня цыр іржавым крэсівам,
Раскладаць на комінку смаляк.

* * *

Сытым
сокам
вясны
упіліся палі.
Запахла
сасновай смалой,
аміячнымі квасамі.
Струны пастронкаў
плугі
напялі.
Рукі па локці
работай закасаны.
Тарпяны закружыўся
над кузьняю дым.
Паветра набрэнкла
драўлянаю гараю.
Акоўваюць
кол кавалі
абады:

— „Д“-ЫХ.
Мы
маладая гвардыя“.

Сталі упоравень
трыццаць мужчын...
І...
скалыхнуліся
дужыя
постаці.
Неабсяжны прастор
палыновых
лагчын
Мерным,
няўтомным
праходзяць поступам.
Дружныя
роўныя
рухі
рук
Расьсякаюць
паветра
золкае.
Сорак чатыры
плугі аруць,
Выварочваюць
боразны
глыбокія.
Гострыя зубы
жалезных
барон
Вантробы зямлі
разгрызаюць
тлустыя.
Асыпаюцца грывы
крутых
баразён,
Пакроеных
стройнымі
лустамі.
На карках ардэнак
рыпяць
хамуты,

Цуглі бражджаць
па напеневых сківіцах.
Топчуць купінаў
пыл
тупыя
капыты.
Стаенныя коні
на
месцы
ня ўрымсьцяцца.

Растапілася
сонца
ў сіняй
высі,
Рассыпалася
пырскамі
сытнай
расы.
І... шырокая
плошча
палёў
калыша

Вясёлыя
песень
галасы.
Стала
матуля мая
на ўзвышшы.
Разьбегліся вочы
ўздоўж абшараў...
І...
яшчэ адзін плуг
на работу
вышаў.

І...
палі прыбылі
на чатыры
гэктáры.

Менск—31 г.

Эдуард Самуйленак

Насустрач будучыні

Нарыс—аповесьць

У пад'ездзе клюбу артбрыгады, у сьвятле дугавога ліхтара, вясёлай чырваньню прыгожых літараў мяняўся плякат. На горад асядаў крыху зімнаваты, звычайны для пачатку верасьня, вечар. Сінія цені клаліся ў бязьлюдных вуліцах ускраіны.

Клюб зьзяў агнямі. Палала чырвань хварбаў плякату і вабіла да сябе. На тле змрочнай вуліцы быў ён вясёлай ільсьнянай плямай. І таму, адусюль, па адным і гурткамі падыходзілі да клюбу людзі. Некалькі хвілін затрымліваліся каля плякату і зьнікалі ў шырока расчыненых дзьвярах.

Згасла зара за дахамі пабудоў. Зьмерклася.

І тагды, у цемры вечара мядзянымі галасамі зычна ўскрыкнулі трубы. Пераможны тэмп маршу нечакана зруйнаваў сонную ціш вуліц. Удалячыні роем сьветлякоў замігцелі агні і пачалі набліжацца. Гэта, разганяючы ноч, пырскалі сьвятлом шматлікія паходні. У іх сьвятле бяззычна плылі сьцягі. Грукат сотняў ног мерна ўстрасаў зямлю. Стройна адна за аднэй ішлі колёны. Паміж рабочых кепак макам цьвілі хусткі работніц. На яснай медзі труб іскрыліся воблікі шматлікіх агнёў.

З дзьвярэй клюбу, сьпяшаючыся, выбягалі чырвонаармейцы навыперадкі беглі па пляцу. У асьветленым чатырохкутніку перасеклі дарогу колёнам два роўныя шэрагі.

Бліжэй капэля. Набліжаюцца паходні і сьцягі.

Над пляцам прагучэла выразная команда:

— Зва-жай!

І над чырвонаармейскай застыглай колёнай затрапяталася шырокае палотнішча. Глянулі выразныя, старэнна выпісаныя словы:

„Гарачае прывітаньне адпускнікоў рабочым шэфам".

Раптоўна змоўк марш. Галаву першай калёны тых, што прыйшлі, ахінаў шырачэзны транспорант:

„Прывітаньне рабочых шэфаў адпускніком 1905 году".

Над колёнамі зноў раскацістым рэхам прайшла команда:

— Воль-на-а-а!

Выбухнуў гоман, колёны зьмяшаліся, хіснуліся і нырнулі ў натоўп сьцягі, транспоранты і бліскучыя трубы. Па залітых сьвятлом усходах жывым, бурлівым струменем пацёк натоўп.

* * *

Дванаццаць байцоў-адпускнікоў выстраіліся за сталом прэзыдыуму. Яны адчувалі на сабе таварыскую ўвагу прысутных у залі, і да іх зьвяртаўся з прамовай ваенком. Дванаццаць стаяла ў застыглай нярухомасьці.

— Вам прыдзецца вытрымаць жорсткую барацьбу,— гаварыў ваенком,—з шматлікага нашага партыйнага колектыву вы зараз выходзіце падрыхтаванымі да работы, вы зьяўляецеся ўжо самастойнай партыйнай адзінкай, і ваша задача зараз, ва умовах напружанай гаспадарчай будоўлі, арганізоўваць масы батрацтва, беднякоў і серадняком адсталага Махіроўскага сельсавету на барацьбу за генэральную лінію партыі, за вырашэньне сёньняшніх задач. Ваша задача—ня толькі пабудаваць комуну. Ваша задача—вырваць шматлікія масы з-пад варожага ўплыву, пераключыць іх жыцьцё і барацьбу на новыя рэйкі. Ваша задача—біць па кулаку, яго зброяносцах, правых і „левых" яго агентах. Партыйная ячэйка павінна кіраваць палітычным жыцьцём сельсавету. І таму вам давядзецца вытрымаць жорсткую барацьбу і ня толькі вытрымаць, а выйсьці з яе пераможцамі. Памятайце, вораг будзе выкарыстоўваць усе сродкі і мэтады.

Так гаварыў ваенком. Ен паказваў на ўсе моманты, якія маглі вынікнуць у працягу самага цяжкога пэрыоду, пачатку. Узброены ведамі і вопытам барацьбы, стары баец-камуніст, імкнуўся перадаць у кароткія хвіліны прамовы ўсё, што набывалася шляхам гадоў змаганьня.

— Вы прайшлі двухгадовую школу, у якой вас вучылі змагацца і перамагаць,—закончыў ваенком,—і я ведаю, што вы энэргіяй сваёй і бальшавіцкай воляй пераможаце. Будзьце ўпэўнены кожны ў сабе, адзін у ва ўсіх і ўсе ў адным. Захоўвайце дысцыпліну, бо яна маці перамогі. Упэўненасьць-жа—гэта моц, а ў барацьбе перамагае той, хто мацнейшы. Ад імя партколектыву і командваньня брыгады вітаю комуну „Чырвоны артылерыст"!

Воплескі заглушылі апошнія словы ваенкома.

Ад шэфаў выступіла дзяўчына-камсамолка.

— Таварышы!—сказала яна маладым, тонкім голасам. Мы, рабочыя шэфы, упэўнены ў вас. Вы сьмела пойдзеце насустрач соцыялістычнай будучыні. Памятайце, што мы з вамі, і дапамога ў патрэбны час заўсёды будзе намі забясьпечана.

Бура воплескаў вырвалася з залі.

Адказнае слова ўзяў сэкратар парт'ячэйкі комуны Воўчанка:

— Я коратка,—сказаў ён,—усяго толькі некалькі слоў. Мы ў сабе ўпэўнены. Дысцыпліна ў нас на першым пляне. Мы бяз хістаньняў

ідзем насустрач будучыні, як выказалася таварыш шэф, і, пабальшавіцку перамогшы цяжкасьці, дасягнем мэты, як азначыў таварыш ваенком. Усё.

І зноў выбух воплескаў.

Доўга, да самай амаль раніцы, гарэлі агні клюбу. Чырвоная казарма праводзіла на гаспадарчы фронт падрыхтаваных байцоў.

На верасьнёвых палетках

Лясы акрываліся жаўцізной. Драмаў пагодны верасень. У паўдні па-летняму грэла сонца, і нават было горача часамі.

Таму на пяшчаных узгорках сяла Махірова заўчэсьне прысьпела бульба, і хаця досыць было часу да зімы, найбольш рупныя махіроўцы яе выкопвалі. На вузкіх гонях паўз дарогу сядзелі і капаліся ў пяску цэлыя сем'і.

Было ціха, і лагодна грэла сонца. Зрэдку даносіла лёгкім павевам урывак далёкіх сьпеваў, альбо прыплываў нудны брэх сабакі, што засумаваў у мёртвай цішы вясковых вуліц. Лянівы спакой панаваў на полі.

Сядзелі махіроўцы і выкопвалі бульбу. Так яны рабілі дзесяткі гадоў, гэтак рабілі іх бацькі, і кожны з іх, мабыць, быў упэўнены ў тым, што выкопваньне бульбы з-пад удзірванелай мяжы з абдзіраньнем пазногцяў прыдзе на будучы год, на наступныя за ім і гэтак далей. Справа будзе прымаць некалькі інакшае адценьне толькі ў тым выпадку, калі будзе дажджыстая восень, і зямля расплывецца знобкай гразьзю. Аб тым, што неяк інакш капаюць бульбу, махіроўцы ня чулі і разьвязваньнем гэтага пытаньня не займаліся.

І так, як у даўнія гады іх дзяды, сядзелі махіроўцы і капалі сыпкі перасохлы пясок, даставалі з яго дробныя, як арэхі, бульбіны. Драмалі верасьнёвыя палеткі, прыляталі срэбныя ніці павуцінья і заблытваліся ў сухабыльлі надзейна ўдзірванелых межаў.

— Чырвонаармейцы едуць!—крыкнуў нехта пры дарозе.

Усе, хто ўчуў, азірнуліся.

Некалькі верхавых ішло шпаркай рысьсю ў напрамку да Махірова, і за імі ня менш шпарка пасоўвалася параконная павозка.

— Па фураж мусіць,—сказаў нехта.

Чырвонаармейцы параўняліся з сялянамі і стрымалі коняй.

— Добры дзень, таварышы!—сказаў пярэдні, высокі смуглявы хлапец.

— Бліжэйшыя да дарогі адказалі і некалькі хвілін разглядалі чырвонаармейцаў. У працягу гэтых кароткіх хвілін сяляне дакладна агледзелі людзей, коняй, нагружаную даверху павозку і вясёлага хлапца, які на ёй сядзеў у якасьці пасажыра. Той сядзеў на брэзэнце, якім была накрыта павозка і, трымаючы гармонік напагатове, падмігваў у бок бліжэйшых дзяўчат. Шапка яго была зьбіта на патыліцу, і вочы іскрыліся сьмехам.

Першым парушыў маўчаньне Хвёдар. Гэта быў адзін з заможнікаў Махірова і меў аўтарытэт хітрага і пранырлівага чалавека. Загадзя яшчэ, як толькі паказаліся з лесу чырвонаармейцы, Хвёдар адаслаў сваіх дзьвюх батрачак далей ад дарогі і зараз, уласнаручна высыпаючы ў мех кошык бульбы, сказаў.

— Дробная бульба, сьвіньня яе еж. Каб сказаў-бы, вам ад мяне бульбы купіць, дык аж сорамна. Сьвінячая бульба...

Ён агледзеў суседзяй і ўжо сьмела сказаў:

— І, акрамя таго, ня надта яе шмат. Так што на продаж не выпадае.

— Мы ня купляем,—з усьмешкай адказаў пярэдні,—Непатрэбна.

— Вось тут,—сказаў хлапец на возе,—усялякага харчаваньня хопіць.

Махіроўцы зьдзіўлена пазіралі на чырвонаармейцаў.

— Ну, дык мы паехалі,—абвясьціў усё той-жа пярэдні смуглявы чорнавалосы, з кплівымі вачыма,—прыходзьце да нас увечары. Газэт і часопісаў маем шмат. Прыходзьце.

— Прыбывайце!—крыкнуў хлапец з воза, і пыл засланіў павозку.

Людзі зьбянтэжана пераглядаліся.

— Куды прыходзіць хаця спыталіся-б,—зазначыла адна з жанчын,—а то няма ведама куды ісьці.

— І пытацца ня было чаго,—адказаў Хвёдар.—І таксама ісьці няма куды. Выскаляюць зубы супроць дзяўчат! Вось пакопвалі-б бульбы, альбо памалацілі-б раньне, дык ведалі-б, як выскаляцца. Што ім хлеба не хапае?

— Ён і чорта з зямлі выдзярэ—зазначыў нізенькі дзядок,—Ня то, што...

— Забіяцкія хлапцы.

— Жвавыя!

— Нашым не дарасьці...

— Навучаць і нашых.

Так перамаўляліся сяляне. І ў гэты час падышоў хлапец з абрацямі цераз плячо.

— Ну як спадабаліся камунары?—спытаў ён на хаду.—Пра іх гамоніце?

— Камунары?—у адзін голас перапытала грамада.—Як камунары?

— Ды так камунары,—адказаў хлапец. — Прыехалі камунары ды ўсё.

— Я, браткі, успомніў—азваўся адзін—камунары і ёсьць. А той смуглявы наперадзе, дык іх старшыня. Ён прыяжджаў гэтак месяц таму назад, а я бачыў ды забыўся.

— Ну, ды ну-у?

— Што і казаць, сустрэлі суседзяй варонамі.

— Суседзі!—перадражніў Хвёдар.—Суседзі!.. Прысуседзіўся...

— Раз у Махірове будуць жыць, дык і суседзі—сказаў дзядок. Што яны ня людзі?

— Крыху не такія, як мы, лапці,—адрэзаў Хвёдар.—Наплачашся зараз ад іх. Пачакай.

— А нам, Хвёдар, асабліва і плакаць няма чаго,—прыжмурыў вока дзядок.—Гэта іншы мо‘ хто пацярэбіцца.

— Заткніся, Апанас!— раззлаваўся Хвёдар.—Нічога ты не разумееш.

— Што ў яго сын у арміі, дык ён думае, што яны яму ўсе радня,—гугнява дадаў прысадзісты, руды, з нібы абпечаным чырвоным тварам.

— У арміі, Піліп, ды не ў бандытах—прышла на дапамогу Апанасу адна з жанчын.—Абараняе савет, ды не рабуе.

— А што, мо‘ ты дакажаш, што мой сын у бандытах быў?—грозна завярнуўся Піліп, абмацваючы вачыма ў грамадзе ворага. Мо‘ які доказ маеш?

— Яно зразумела і бяз доказаў,—не сьпяшаючы ўставіў Апанас. Рэч простая, шыла, брат, у мяху не схаваеш.

Піліп лыпнуў вырачанымі вачыма і наліўся яшчэ гусьцейшым румянцам. Рудыя вусы, што стаялі, тарчма, рухаліся. Але ён змоўчаў.

— Разарве Піліпа злосьць,—з жартаўлівым спачуваньнем сказаў хлапец з аброцямі.

Грамада грымнула рогатам.

Піліп падхапіў пусты кошык, крута завярнуўся і пашоў прэч, мармычучы лаянку. Пазіраючы яму ўсьлед, ўсе, акрамя Хвёдара, сьмяяліся.

Калі Піліп зьнік, тэма размоў была, здавалася, вычарпана, і пара было разыходзіцца на свае нівы. Але кожнаму здавалася, што ён яшчэ нешта ня выказаў і нечага не даведаўся, і таму мужчыны і жанчыны, што ўтварылі асобны гурток, парассьядаліся на межах і, перагаворваючыся аб тым ды іншым, нарэшце, зьвярнуліся зноў да пытаньня прыезду ў Махірова камунараў.

— Трэба было-б і за бульбу брацца,—сказаў адзінокі Халімон, што адвёз нядаўна жонку ў бальніцу.—Але, як гэта кажуць, цікава было-б даведацца, куды самыя гэтыя камунары падзенуцца тут у Махірове... Які куток, і той, як кажуць, клоп пад кватэру заняўшы-

— У папоўскім доме,—адказаў хлапец, што прынёс вестку.

— Пустым?

— Пустым.

— Дык ён-жа разбураны. Ні дзьвярэй, як кажуць, ні вакон.

— Уставяць новыя.

— Уставяць!—крывіў усьмешку Хвёдар—з гармонікам нагаспадараць.

— Праўда...

— Гармонік да зямлі няздатная рэч. Што і казаць—падтрымлівалі Хвёдара.

— Нічога,—супярэчылі іншыя.– Прыстасуюць і гармонік

— Аж ты з плугам ня ўгонішся!

— Паглядзім, мо‘ парафія патрэбуе арэндныя грошы ад іх!—пагражаюча сказаў Хвёдар.—Вось тагды ня сплацяцца за сто гадоў. Усё, што заробяць, на арэнду пойдзе.

— Якраз, заплацяць яны табе за дзякаў дом арэнду... Чакай!

— Заплацяць, аж чэрці з воч пасыплюцца.

— Гаворыш, Хвёдар, як малое дзіцянё.

— Чакайце, разблытаюць грыву папу,—гаварылі іншыя.—Аброс ён тут салам у Махірове.

— Ну, заткнецеся вы. Камсамольцы ліпавыя,—сыкалі на іх другія.—Ужо бог стаў непатрэбны?

— Бог, як бог, а поп напрыкрыў. Яйка не зьясі. Баба ўсё да папа цягне.

— Бацюшку ў крыўду не дамо!—стаяла сьцяной большая частка жанчын.

— А яны вашага бацюшкі і не чапаюць.

Выбухалі спрэчкі, якія зьнікалі гэтак-жа скора, як і завязваліся. Высоўваліся ўсё новыя пытаньні, і усім здавалася, што зноў-ткі нешта ня высьветлена, чагосьці не даведаліся, нешта трэба вырашыць. І вырашалі, і ў вырашэньні таго ці іншага пытаньня зьбіваліся людзі ў асобныя групоўкі, варожыя адна да аднэй. Раптоўна абуджалася тое, што драмала гадамі, не знаходзячы выйсьця, і зараз выбівалася ў словах, поглядах, жартах і пагрозах.

Гоман ня сьціхаў... Работа была спынена.

У барознах дном угору ляжалі пустыя кошыкі.

Прылятала верасьнёвае павуціньне і аблытвала сухабыльле межаў.

Былое Махірова

У самым цэнтры сяла, над блытанінай крывых і цесных вуліц, узьнімаецца ўрывісты, абточаны вятрамі, што асыпаецца па ўскраёх, узгорак. Над сялом устае стромкая сьцяна з аголенымі напластаваньнямі земляных пародаў, і далёка ўжо за межамі сяла узгорак адложыста спадае і амаль няпрыкметна пераходзіць у роўнае поле. Паўкружжам расшохраных, шэрых дахаў сяло абвінае ўзгорак.

На ім строма ўзьнесьліся ўгору некалькі дзесяткаў маладых бяроз і скрозь іх сакавітую зеляніну, скрозь густое спляценьне гальля прасьвечвае панурая постаць царквы. Гэтая царква ёсьць гісторыя былога Махірова.

Вежы яе абрасьлі мохам і цьвільлю, пахіснуліся. Галоўны фасад глыбока ўціснуў у зямлю фундамант і намерваецца зьехаць з узгорку ў бок супроцьлеглы вежам. Кірпатыя цыбулькі шматлікіх купалоў

нахіліліся кожны ў самастойным кірунку. Панура глядзяць вузкія ваконцы, стаіць царква на высокім узгорку і цяжка згадаць, куды яна менавіта паваліцца. Роўнавага пакуль што захоўваецца рознастайнасьцю нахілаў яе асноўных частак.

Царкве 300 гадоў з лішкам. Некаторы з расійскіх цароў, аб'яджаючы заходнія межы перад чарговай вайной з Польшчай, заснаваў у Махірове штаб-кватэру. Тагды-ж была зрублена сякерамі гэтая царква і, прастаяўшы дзьве сотні гадоў, не зьвярнуўшы на сябе нічые асаблівай увагі, на правох „древлей святыни" гатова была ўжо развальвацца. І раптам пра яе ўспомнілі. Гэты пэрыод зьяўляецца золакам Махіроўскай гісторыі.

У царкву прыехаў і адслужыў архірэй. За ім аддалі ўвагу царкве шэраг ня менш знакамітых асоб. Затым была выпушчана маленькая кніжачка, што абмалёўвала Махіроўскую царкву, як сродак самага надзейнага і хуткага дасягненьня нябесных вышынь.

Пасьля гэтага з усіх куткоў блізкіх і дальніх, па ўсіх сьцежках і дарогах адзінкамі і гуртамі пацягнуліся багамольцы, і разам з гэтым зазьвінела ў царкоўных скрынках звонкае срэбра і заскарузлая медзь

Малінавым звонам залілася царква, цыбулькі купалоў атрымалі натуральны колер, царкву зьлёгку пераахварбавалі жоўтай вохрай асабліва не парушаючы яе згрыбелых асаблівасьцяй зьнешняга выгляду, і навокал, на ўзгорку, былі пасаджаны маладыя дрэвы. За царквой выраслі два папоўскія дамы, за імі прыладзілася манополька, супроць яе вырасла ўтульная карчма, шэраг крам адціснуў ад узгорку убогія хаціны, а на схілах узгорку зьявіліся паходнага тыпу дамы гандляроў абразамі і сьвечкамі.

Справа набыла гандлёвы характар. Пад царкву была падведзена моцная эканомічная база і разам з гэтым новы фундамант.

Гандлёвы капітал гнаўся за нажывай. Паасобныя галіны прадпрыемства ў барацьбе за пяршынства глыбока ўкліняліся ў ачмурваныя масы. Шчупальцы гандлёвага дому ашуканства і эксплёатацыі, ніці яго нэрваў абмацвалі кожную дробязь у жыцьці, з пачатку і да яго канца.

Нават мярцьвяк ня мінаў гаспадарскіх рук. У крамах набіралі тавар для хаўтураў, у царкве адпявалі, і завёзшы нябожчыка на могілкі, што тэрмінова былі перанесены бліжэй да царквы, заходзілі ў манопольку, каб было з чым спраўляць памінкі.

У папоўскіх дамох, што, хаваючы шырокія свае азадкі ў зелень садоў, выставілі на царкоўны пляц быччыя ілбы, гадаваліся пакаленьні царскіх слуг. Выходзілі адтуль бравыя зубадробы-афіцэры, праныр-лівыя чараўнікі царскіх канцэлярый чыноўнікі, выплывалі пышнацелыя папоўны—сродак працягненьня слаўнага папоўскага роду, аматары

выдатных налівак і славутых пірагоў. Гандляры ў карчме, манополькы, крамах пераводзілі на рублі сялянскія медзякі, куплялі гільдыі і зямельныя вучасткі.

Пазбаўленая зямлі беднота адыходзіла ў горад, ішла бурлачыць, наймалася ў батракі. Паступова разблытваліся махіроўскія крывыя вуліцы. Адступалі ад узгорку, зьнікалі з твару зямлі крывабокія хаціны гарапашнай беднаты.

Расквітнела махровым цьветам ажырэўшых пакаленьняў кулацкапапоўскае гняздо і званіла ў ва ўсе званы, цэнтр прадпрыемства, яго сілавая ўстаноўка—трохсотгодняя царква, славіла на ўвесь сьвет бойкае, гандлёвае сяло Махірова на Полаччыне.

. . . . . .

Гняздо драпежнікаў атрымала першы штуршок у лютаўскую рэвалюцыю. І канчаткова было зьмецена ў кастрычніку. Бухнула гняздо з самадзяржаўнага дрэва, разьбілася ў шмацьце, і папаўзьлі жарлочныя птушаняты па ўтульных куткох, схаваліся, чакаючы спрыяючага выпадку.

Прайшлі яшчэ гады. Махірова ўжо не адрозьнівалася ад іншых сёлаў і вёсак. Але барацьба, што адбывалася ў ім, была глухой, стлумленай.

Шмат варожага хавалася ў Махірове. Птушаняты разбуранага гнязда не здаваліся адразу, гублялі сілу і зьнішчаліся паступова.

І, нарэшце, на рашучы бой з недабіткамі зьнішчанага варожага стану прышла комуна „Чырвоны артылерыст"—дванаццаць чырвонаармейцаў N-скай артбрыгады.

„Так сказаў ваенком"

На прасторным дварэ стаялі ў шэраг паўз плот прывязаныя коні. Перад імі ў насьпех зьбітыя з жэрдак ясьлі было накідана сьвежа-кошанай атавы. Сярод двара, на цаглінах, пастаўленых кантам, пыхкаў парай аблізваны языкамі агню кацёл. Навокал яго хадзіў, памешваючы чарпаком, той самы вясёлы хлапец, што атрымаў ад махіроўскіх дзяўчат непарушны аўторытэт.

Надыходзіў вечар. Сонца, што страціла праменьні, зімным, чырвоным дыскам павольна зьніжалася над далёкім, зацененым туманамі краявідам. Чырвань зары расьцякалася над жаўцізной наўкольных лясоў. Прыгожы быў вечар.

Махірова засыпала. Дзе-ні-дзе лёгкім сінім дымам курылі шэрыя стрэхі. Скрыгалі вароты хлявоў, ды зрэдку гулка грукалі дзьверы, што зачыняліся нанач.

У кутку двара пад кустамі бэзу, што ўжо павяў і зжоўк, хто дзе папала, разьмясьцілася дзесяць чалавек. Адзінаццаты стаяў. Гэта быў Воўчанка. Ён рабіў даклад агульнаму сходу комуны.

— На адказнасьці дзяжурнага па комуне,—гаварыў Воўчанка,—будзе ляжаць выкананьне комунарамі парадку работ, зацьверджанага праўленьнем комуны. Затым, дзяжурны адказвае за цэласьць інвэнтару комуны, уключаючы і хатнія прылады. Дзяжурства ўстанаўліваецца па чарзе на суткі. Гэтым апошнім мерапрыемствам і вычэрпваецца покуль што хатні распарадак комуны. Заканчваючы даклад, я лічу, што кожны разумее карысьць гэтага мерапрыемства, і таму адразу-ж можна будзе прыступіць да яго зацьвярджэньня.

— Хто жадае выказацца?—запытаў з-пад куста старшыня сходу.

— Я выкажуся ў тым сэнсе,—азваўся адзін з камунараў,—што гэта абавязкова патрэбна і супроць ніхто ня будзе.

— Гэта дапаможа падтрыманьню дысцыпліны, а дысцыпліна неабходна,—сказаў другі.

— І пры гэтым, так сказаў ваенком,—дадаў трэці.

Пры галасаваньні ўзьняліся адзінаццаць рук.

— Наступнае пытаньне,—абвясьціў старшыня,—зацьвярджэньне вытворчага пляну комуны на васеньні пэрыод. Слова мае Феданенка.

— Плошча пасеву комуны,—сказаў Феданенка,—агулам складае 78 гэктараў. У гэты лік уваходзяць 12 гэктараў папоўскага поля, што было дагэтуль у яго карыстаньні. Астатняе—цаліна, таксама папоўская зямля, якую махіроўцы, відаць з-за неўраджайнасьці глебы, зусім не аралі. На гэтай зямлі мы пачынаем работу комуны, пабудову гаспадаркі. На прырост плошчы ў самы бліжэйшы тэрмін мы не разьлічваем. Таму трэба разьмеркаваць плошчу так, каб на вясну засталася патрэбная колькасьць зямлі, здольная здаволіць гаспадарчыя патрэбы комуны на нявызначаны час. Вось контрольныя лічбы вытворчага пляну: жыта, на мінэральным угнаеньні з патрэбнай апрацоўкай глебы, засеяць у колькасьці 10 гэктараў. У выпадку перавышэньня пляну: засеў жыта можа быць павялічаны да 12 гэктараў. Пасадка саду—5 гэктараў на спэцыяльна адведзенай плошчы. Зябліўнае ворыва: 50 гэктараў цаліны. Астатняе—на вясну. Гаспадарчыя работы: адрамантаваць дом, стайні і хлявы, пабудаваць павець для прыладаў. Гэта пакуль што ўсё, што мы павінны зрабіць у першую восень. Набыцьцё жывёлы будзе залежаць ад таго, калі і колькі нам будзе прадастаўлена крэдытаў. Крэдыты будуць выкарыстоўвацца выключна па мэтавых прызначэньнях: на набыцьцё машын, прыладаў і жывёлы, а таксама будаўнічых рамонтных матар'ялаў. Наймовая рабочая сіла на будаўніцтве выкарыстоўвацца ня будзе. Мы ўсё павінны зрабіць сваімі рукамі. Плян выпрацаваны саветам комуны, разгледжаны парт'ячэйкай, і зараз ставіцца на зацьвярджэньне сходу.

І калі Феданенка скончыў, адзіным узмахам ўзьнялося дзесяць рук.

Феданенка абвёў поглядам твары комунараў, што сталі суровымі. На дварэ стала ціха. Чуваць было, як глымаюць коні, схаваныя прасьцірадлам асеўшага ад вогнішча дыму.

— Апусьцеце рукі,—сказаў старшыня сходу.—Вытворчы плян зацьверджаны. А пытаньняў на парадку дня, апрача бягучых спраў, няма. Як быць, дык проста ня ведаю.

— Зачыняй сход,—параіў адзін з комунараў.

Усе засьмяяліся.

Ад вогнішча цьвёрдым крокам падышоў хлапец.

— У чым справа Алесь?—спытаў Феданенка.

Алесь прыклаў руку да шапкі.

— Даводжу да ведама сходу,—адрапартаваў ён,—што каша зга-тавалася. Лыжкі ды іншыя прылады ў поўнай спраўнасьці. Коні хар-чаваньнем здаволены ўключна па горла. Поп пазірае насупроць з-пад фіранкі крайняга вакна левай паловы дому. Ўсё ў парадку. Здарэньняў ніякіх не адбылося.

У засыпаючай цішы вечара зычна разьлёгся дружны сьмех.

* * *

Комунары вячэралі, пасеўшы на зямлі навокал агню. Зьмяркалася ўсё больш, і воблескі агню пачыналі лёгкімі адценьнямі прабя-гаць у паветры.

— Сёньня ніхто і ня прышоў да нас,—сказаў адзін з комунараў.

— Для таго, каб прышлі,—адказаў Паўлаў, член савету,—па-трэбна папрацаваць. Прынамсі настолькі, каб давесьці людзям, што ты ня зьвер. Кулакі, брат, размалююць!

— Нічога, тут шмат беднаты.

— Гэта факт, але беднату трэба вывесьці з-пад кулацкага ўплыву.

— Праўда, відаць, агітнула кулаччо. Жанчыны, дык ледзь не пад плот хаваюцца.

— Хлапцы,—спытаў Алесь,—а як з папом абыходзіцца?

— Ніякіх абыходжаньняў і адносін,—адказаў Феданенка.—Поп нас непасрэдна не датычыцца. Мы будзем біць па ім культурнай работай, а прыватныя адносіны з папом, нават самыя бяскрыўдныя, ні з якога боку нам карысьці не прынясуць. Таму ўчынак кожнага, хто так ці інакш зачэпіць папа непасрэдна, будзе разглядацца як шкодніцтва. Ворагам ня трэба даваць поваду ў рукі.

— Гэтак заўсёды гаварыў і ваенком,—зазначыў нехта за вогні-шчам.

Алесь нахіліўся над кашай. На хвіліну ўсе змоўклі.

—Вунь яна стаіць,—паказаў Феданенка.—Парахня. А зубы, як у шчупака. Неасьцярожна ткні рукой,—пальцы прэч. А падыдзі з таго боку, з якога патрэбна, толькі сьмецьце з яе пасыплецца.

Усе азірнуліся ў тым кірунку, куды паказваў Феданенка.

Дагасала зара і яе чырвань нібы, кроў, прасочвалася скрозь спля-ценьне гальля бяроз, якія ахіналіся ў жаўцізну. На тле золата і крыві

была выразна акрэсьлена чорная, панурая здань царквы. На шматлікіх пахілых купалох вострымі і прарэзьліва-тонкімі рыскамі застыглі ў чырвані зары крыжы.

Згрыбелае дзіцянё змрочных стагодзьдзяў, цьвілая гнілая пабудова, пагражаюча ўставала над крыжамі могілак, жоўтагрудымі бярозамі на ўзгорку, над раскудлачанымі стрэхамі Махірова, яна пакуль што не здавала сваіх позыцый.

— Скруцім галаву,—паабяцаў маўклівы, пахмурны Ільля,—у нас надта доўга не патырчыш!—

— А ў сярэдзіне абсталюем клюб!

— Ну і клюб! Сабакі праз вуглы ўлазяць.

Да вогнішча падышоў Паўлаў, дзяжурны:

— Абвяшчаецца адбой!

Паміж іншым

Калі роўнае дыханьне людзей, што паснулі, запоўніла цёмную скрыню пустой хаты, комунар Сняжко падтаўхнуў зьлёгку таго, хто ляжаў побач:

— Сьпіш, Скараходкін?

Той, пачакаўшы, адказаў паўсонна:

— Вось ужо засынаю. А ты чаго?

— Я паміж іншым,— зашаптаў Сьняжко,—пасоўваючыся на локцях бліжэй.

— Мне цікава даведацца, як табе ўсё спадабалася...

Скараходкін, памаўчаўшы, адказаў таксама шэптам:

— Ня надта, брат, спадабалася. Селі, як варона на кол, чорт яго ведае.

— Праўда,—падхапіў Сьняжко.—І гэтулькі работы перавярнуць за якія паўтара мёсяцы. Звар'яцець трэба!

Скараходкін не адказаў.

— Ведаеш, Скараходкін,—пряцягваў Сьняжко,—скажу табе, як старому сябру. Калі толькі будзе дрэнна, вазьму і пайду з комуны. Досыць мне гэтае дысцыпліны. Пайду на завод альбо ў такую комуну, дзе хаця на цябе ня будуць кулакі з-пад вугла гыркаць.

— Зразумела,—пацьвердзіў Скараходкін,—з міліцыяй не затрымаюць.

— Дык ты таксама думаеш?—

— Ня іначай!—

— Добра, Скараходкін, добра!

— А зараз будзем спаць. Сьпі.

— Добра...

Шопат змоўк. Роўна дыхалі сплючы комунары. На дварэ фыркалі коні, і чутны былі крокі дзяжурнага Паўлава. У мутныя вокны глядзелі зімныя васеньнія зоры. Плылі адна за аднэй хвіліны сну перад пачаткам цяжкай упартай работы, якую прыносіў надыходзячы дзень.

Выхад на позыцыю

Раніцай вільготныя космы туманаў аблыталі зямлю, зьліліся ў шчыльную не прабраную масу, і застыгла знобкае прасьцірадла васеньняй ночы, што акрыла зямлю ў чаканьні сонца. Яно ўставала недзе, і бляск яго праменьняў раставаў у тоўшчах туманаў, ствараючы шэрую каламуту золкіх васеньніх досьвіткаў.

Паўлаў шырока расчыніў дзьверы ў сенях, абмацаў на сьцяне кароткі цьвік і павесіў на яго вільготны ад расы кавалак паперы, на якім ён за хвіліну пісаў хэмічным алоўкам, распасьцёршы ліст на дне старой перавернутай дзяжы на дварэ. Потым Паўлаў пахукаў на пальцы рук і таўхнуў нагой дзьверы ў хату:

Уставай, хлопцы!

Гэты воклік быў блізка знаёмым. Ён гулка разьлягаўся ў раніш-няй цішы чырвонай казармы кожны дзень тых двух гадоў, што праляцелі няпрыкметна, і кожны раз, як толькі ўбіваўся ў вушы звонкі голас, зьнікалі млявасьць і сон, бадзёрасьцю і сілай налівалася цела.

— Ўста-вай! –

Па куткох зашалясьцела салома, у мутным змроку хаты пасьпешна завіхаліся постаці комунараў. За хвіліну хата апусьцела.

На размоклай паперы, што павесіў дзяжурны, комунары чыталі

1. Феданеяка Якуб . . . едзе ў Полацак па справах комуны.
2. Паўлаў Авер'ян . . . дзяжурны.
3. Воўчанка Пятро . . . едзе на ст. Варавуха па плугі і насеньне.
4. Абычайкін Алесь . . едзе з Воўчанкам. Па прыезьдзе абудва далучаюцца да ворыва.

5. Дадзека Ільля
6. Гаравацкі Эдмунд
7. Пракопаў Янка
8. Ёрданскі Кастусь

Першая зьмена па ворыву працуе да 12 гадзін дню.

9. Сьняжко Антось
10. Крупко Янка
11. Мацюк Пятро
12. Скараходкін Кастусь

Другая зьмена па ворыву працуе з 12 гадзін дню.

У в а г а. Вольныя ад работы зьмены павінны знаходзіцца на полі. Работа—ачыстка поля ад каменьняў і хмызьняку.

Дзяжурны Паўлаў.

Цераз некалькі хвілін, звыклая да пастронкаў пара рослых коняй дружна ўзялі рысьсю, і павозка з мяккім туркатам зьнікла за варотамі.

Паўлаў раскладаў агонь і меркаваў:

— Да станцыі тры кілёметры. Туды і назад—шесць. Туды рысьсю, назад ступою сорак хвілін найбольш. Пагрузка—пятнаццаць хвілін. За гадзіну вернуцца напэўна. За гэты час будуць вычышчаны коні, накошана атавы і згатуецца сьняданьне. Таксама падрыхтуецца запрэжка, і ўсё будзе ў парадку. Ёсьць такая справа!

Сонца перамагала. Ясьнеў усход. Яго блеск пранізваў напластаваньні туману. На дварэ камуны фыркалі і ржалі коні, гаманілі маладыя галасы, трапятаў агонь вогнішча. Раніца была вясёлая, прасяк-нутая бадзёрым халадком і абяцала пагодны, цёплы дзень.

Частка комунараў падрыхтоўвала запрэжку. Іншыя старэнна, пастраявому чысьцілі коняй, падганяючы шэрсьць „пад блеск", так, як гэта вялося па брыгаднай стайні. Астатнія некалькі чалавек, накіраваліся па атаву.

Вышла так, як разьлічыў Паўлаў. Калі адзін за адным на дварэ пачалі зьяўляцца комунары, нагружаныя пластамі сьвежай, пахучай атавы, ў шырока расчыненыя вароты ўехала павозка.

— Паўлаў, прымай плугі—крыкнуў Алесь.

Паўлаў зьбіў шапку на патыліцу і разьвёў рукамі:

— Ну, і вышла. Аж самому дзіўна!

На сьняданьне пашло ня больш за дзесяць хвілін. Коні былі запрэжаны і дапасоўвалі гладкім бліскучым целам да новай збруі і новых таксама, пахварбаваных на зялёнае, надзейна зробленых, параконных плугоў.

Ільля ўзяўся за ручкі пярэдняга плуга.

— Паехалі?

— Пачынайце адразу-ж за могілкамі,—сказаў дзяжурны.—Ну яжджайце, мітынгаў непатрэбна.

— Пры выезьдзе на позыцыю мітынгаваць некалі,—адказаў Ільля.

Чатыры пары коняй дружна загрукалі капытамі. Бразнулі па бруку двара лемяшы. Адзін за адным выходзілі плугі за вароты.

Комуна „Чырвоны артылерыст" распачала работу.

„Зробім, бацюшка, што ў нашых мажлівасьцях..."

У вакно моцна, адрывіста пастукалі.

Хвёдар нехаця расплюшчыў вочы і прыслухаўся. Было ціха. Праз вокны паглядала мутнаватае сьвятло раніцы.

— Яшчэ сонца ня ўзышло,—падумаў Хвёдар,—І туман. Мусіць здалося са сну, што пастукалі...

Ён адвярнуўся да сьцяны, але вакно забарабаніла зноў з настойлівасьцю і нецярплівасьцю. Хвёдар ускочыў і падышоў да вакна.

—Бацюшка,—ўскрыкнуў ён,—што здарылася?!

Постаць хіснулася ад вакна і зьнікла. Хвёдар кінуўся ў сені, спатк-нуўся на работніцу, якая там спала, вылаяўся і нарэшце абмацаў клямку.

Заходзьце, бацюшка!

А сам зноў уляцеў у хату і скомандваў:

— Марыля, накрый дзяцей. Бацюшка прыйшоў!

І ўжо на парозе ў хату сутрэў папа і падтрымаў яго пад локаць:

— Заходзьце калі ласка, бацюшка, заходзьце.

Поп нясьмела пераступіў цераз парог, азірнуўся, зьняў шапку і прысеў на край лаўкі. Хвёдар тупаў навокал яго, пасьпешна зашпільваючы каўнер сарочкі.

У папа быў змучаны выгляд. Рэдкая абсмоктаная бародка абвісла хвосьцікам, валасы зблыталіся ў бязладзьдзі, і шафранавы твар яго азызлы з адвіслымі шчокамі здрыгваўся нэрвова, і вочы спужана бегалі.

— Што здарылася, бацюшка?—нарэшце спытаў Хвёдар.

Поп крыва ўсьміхнуўся:

— Няпрыемная рэч, Хвёдар, здарылася. Мой гарод заворваюць.

— Комуна?

— Так.

Поп пабарабаніў пальцамі па стале.

— Прышоў вось.. Бег навокал, гародамі каля рэчкі, прамок па хмызьняку да ніткі. Буду прасіць у парафіян дапамогі і ў першую чаргу...

Поп не дагаварыў і лісьліва паглядзеў у вочы Хвёдару.

— ...у першую чаргу ў цябе. Дапамажы, Хвёдар!

Хвёдар задумана паскуб вус:

— Зробім, бацюшка, што ўнашых мажлівасьцях. Але як гэта яны так скора завінуліся? Скуль плугі ўзялі?

Поп заёрзаў па лаўцы:

— Усю ноч ня спаў я, Хвёдар. Да дня іх чорт, даруй божа, падняў і плугі са станцыі прывёзьлі і праз цэлую ноч цягаліся... Ня людзі, а нячыстая сіла. Зараз ужо з паўгадзіны будзе, як выехалі і заворваюць проста ад могілак паўз дарогу. Самая лепшая зямля...

— Нічога, гэта яны ўпяршыню бяруцца,—сказаў Хвёдар. Потым супакояцца.

— Дапамажы, Хвёдар,—ўздыхнуў поп.—Пагавары з парафіянамі, няхай заступаюцца за свайго сьвяшчэньніка.

Хвёдар устаў, прайшоў па хаце і зноў спыніўся каля стала.

— Ты ідзі, бацюшка, дадому паціху,—сказаў ён.—Ідзі так, каб цябе жывая душа ня бачыла. А я пайду, мо' ўдасца нашых Махіроўцаў узьняць на гутарку з комунай. Ідзі, бацюшка.

Поп замармытаў, дзякуючы, ускочыў з лаўкі і, прабегшы дробным трухам, зьнік у сенях. Сьледам за ім, пачакаўшы, вышаў і Хвёдар і накіраваўся да бліжэйшае хаты.

* * *

Калі ўзьнялося сонца, Піліп вышаў на двор і ўзяўся прыладжваць лапатку да сахі. Ён цясаў тонкую дошчачку і гугняў пад нос нешта незразумелае. У галаве варушыліся няпрыемныя думкі. Вынікалі яны паміма волі Піліпа і браліся ўвесь час з аднэй крыніцы: існаваньня ў Махірове комуны.

— Чорт яе ведае,—думаў Піліп,—як яно цяпер пойдзе. Раней жылося ніштавата, а зараз горш ды горш і, нарэшцэ, вось зусім на клін зьяжджае. Наляціць гэтае гавяды, стануць падскубваць з боку аднаго ды другога, і нарэшце голенькі застанешся, як маці нарадзіла. Яшчэ і з Махірова, прычапіўшыся, выжывуць, хай іх чорт гэткія справы...

Піліп ня ўчуў, як ззаду падышоў да яго Хвёдар, і азірнуўся толькі тагды, калі той паклаў яму на плячо руку.

— Чаго ты?—перапалохана спытаў Піліп.

Хвёдар прысеў на калоду і выцяг капшук.

— Дрэнныя, брат Піліп, справы. Дальбог дрэнныя.

— Ну, што здарылася?

Хвёдар памяцкаў паперыну і завінуў цыгарку.

— Папоў гарод заворваюць.

— Ужо?—выдыхнуў Піліп.

— Поп да дня прыпёрся, зуб на зуб не пападае. Дапамогі прасіць. А як тут дапаможаш, калі ніхто пальцам крануць ня хоча. Альбо яны баяцца комуны, альбо за гэтую ноч у новую скуру ўшыліся. Яшчэ ўчора так ды сяк было, а сёньня, хто кажа часу няма, хто зусім адмаўляецца. Ты, кажа, царкоўны стараста, дык табе аб гэтай справе і турбавацца. А іншыя кажуць, што гэта ім зусім не баліць, калі папоў гарод заворваюць. Хадзіў, хадзіў з хаты ў хату, нібы той жабрак... Абрыдла. Сьмяюцца табе ў вочы, асабліва гэтыя галадранцы. Эт!—Хвёдар плюнуў і моцна злаяўся.

— Дык што зараз рабіць?—спытаў Піліп.

— Ісьці ў комуну і справіць там лаянку,—адказаў Хвёдар Зямля парафіяльная, якое яны маюць права!

— А ў сельсавеце ты ня быў?

— Ну, я ня здурнеў настолькі, каб у сельсавет яшчэ торкацца. Сельсавет гэта, брат, не для нас з табой. Сельсавет учора праз увесь вечар тырчаў у камуне, а зараз ісьці ды скардзіцца? Ня варыць у цябе галава, Піліп. Сельсавет у іх пад командай, бо яны парт'ячэйка. Зразумеў?—

— Я ў комуну не пайду,—адказаў Піліп.—Ня будзе з гэтага сэнсу.

— Я і не кажу, што будзе сэнс. Але прынамсі мы пакажам, што нас ня гэтак лёгка ўзяць за жабры.

— Не пайду,—закруціў галавой Піліп.

Дурань!—злосна крыкнуў Хвёдар.—Калі нас усадзілі ў мех, дык трэба чакаць, пакуль яго завяжуць?

Хвёдар устаў.

— Я пайду адзін.

Піліп паскроб у барадзе.

— Эт, чорт яе... Хадзем ужо разам.

Зайшоўшы за ўзгорак, яшчэ здалёк яны ўбачылі чорную пасму сьвежай ральлі, што цягнулася паўз дарогу, упіраючыся канцом у сенажаць і другім у высокі насып магільнае агароджы. Па краі ральлі шпарка ішлі чатыры пары коняй. Відаць было, як вернуць зямлю шырокія адвалы плугоў.

— Эх, добрая зямелька,—уздыхнуў Піліп.—Эх, зямелька!..

— Вунь пры дарозе іх старшыня стаіць,—паказваў Хвёдар.

Яны накіраваліся нацянькі цераз ральлю да комунараў, што зьбіралі каменьне.

— Добрая раніца!—сказаў Хвёдар, на хаду дакранаючыся да шапкі.

— Добрая раніца!—адказалі комунары.

Хвёдар ступіў яшчэ некалькі крокаў. За ім, не адстаючы—Піліп.

— Мы прышлі сказаць,—пачаў Хвёдар,—каб вы кінулі араць гэтую зямлю.

— Бо яна парафіяльная, дадаў Піліп.

Феданенка адказаў з усьмешкай:

— Вось таму мы яе і заворваем.

— Як гэта так?

— Вельмі проста,—адказаў Феданенка.—На тэй падставе, што па нашых законах царква, альбо яе прыслужнікі ня маюць права карыстацца зямлёй. І, нарэшце, грамадзяне, мне некалі з вамі гутарыць. Сьпяшаюся на станцыю. З прэтэнзыямі зьвяртайцеся ў сельсавет і перадайце папу загадзя, што яго справа ўсёроўна ня выграе.

Феданенка завярнуўся і пайшоў.

— Чуў?—спытаў Піліп.

— Войстры, сукін сын!—адказаў Хвёдар,—разжаваў адразу. Ну, пачакай. І мы розум у карты не прагулялі. Хадзем.

Піліп і Хвёдар, азіраючыся на комунараў, што сьмяяліся ўсьлед, пабрылі да дарогі. Зайшоўшы за могілкі, Хвёдар спыніўся і пацягнуў Піліпа за рукаў.

— Сядзем вось на канаве ды пакурым,—запрапанаваў ён. Можа, што прыдумаем. Хвіліну сядзелі моўчкі. Піліп нецярплівіўся і ёрзаў па зямлі.

— У хаце сядзяць без мяне, рукі склаўшы. Чортавы справы!

— Піліп,—спытаў Хвёдар,—яны, здаецца, будуць заворваць цаліну ў жытнім полі.

— Ты гэта ведаеш?

— Будуць. А што?

— А тое, што мы заўтра ўсім Махіровым узаром гэтую цаліну.

— Ты звар'яцеў Хвёдар? Зямля-ж ім адведзена акругай.

— Ты сам звар'яцеў!—Хвёдар нахіліўся да Піліпа і прыглушаным голасам сказаў:

— Ты зразумей. Галадранцам дамо падвойную норму і хаця яго падла па тэй цаліне і ног не пацягне, кожны на падвойную норму

паквапіцца. А сабе мы можам зусім нічога ня браць. Як толькі комуна ўбачыць, што яе зямлю аруць, зараз-жа ўзьніме гвалт, пацягне сельсавет і каго хочаш. Вось тагды мы і скажам: „вам падабаецца комуна, дык ёй і пацяшайцеся зараз". Зямлю комуна, зразумела, адбярэ, але я тагды хацеў-бы пабачыць, хто на іх спагадліва будзе глядзець. З Махірова прагоняць! А што зямля ім акругай адведзена, дык яна ім застанецца ў цэласьці. А Махіроўцаў нашых яны ўжо ў рукі ня возьмуць.

— А мы скажам: вось вам комуна, сукіны сыны,—падхапіў Піліп, у якога заіскрыліся вочы,—цацкайцеся з ёй зараз... Залатая ў цябе галоўка, Хвёдар!

— Будзе гвалт, а мы застаёмся ў баку, закончыў Хвёдар.—Доўга не пасядзяць! А зямлі гэтае мы ні драбінкі ня возьмем. Няхай яны тагды прычэпяцца. Ідзі зараз, Піліп, ды шапні там катораму дурней шаму. Скажы: вось скардзіцеся, што зямлі малавата, а дзірваны стаяць. Падзялеце, малазямельныя, паміж сабой, а, калі хочаце, дайце і серадняком, толькі сабе падвойную норму. Няхай, як хочуць, так робяць. Вынікі аднолькавыя.

— Сёньня ўвечары будзё сход, на гэтым сходзе і вырашым.

— Які сход?

— Пастуху ссыпшчыну ссыпаць.

— Добра. Прыватны сход. Толькі, каб яны не зьявіліся. Тагды прыдзецца памаўчаць.

— Што-ж, тагды назаўтрае адкладзем.

Доўга абгаварвалі пытаньне з усіх бакоў Хвёдар з Піліпам. Нарэшце Піліп устаў, азірнуўся і пашоў паўз плот, абыходзячы Махірова гародамі. Хвёдар праводзіў яго вачыма, і, калі зьнікла за плотам у лагчыне рудая Піліпава галава, устаў і пашоў дарогай у сяло.

Вораг дзейнічае

Прайшло два дні. Гэтак-жа ў тумане, зімнае ўставала сонца, а потым рассоўваўся туман, рабілася яснай далеч і золатам адцьвітань-ня палымнеў пагодны дзень. Комуна заўсёды сустракала сонца на рабоце. З кожным днём шырэў абшар тлустай ільсьнянай ральлі, і на трэці дзень ворыва набліжалася да канца. Чатыры пары коняй імклівай хадой праходзілі па вучастку, глыбока зануралісяплугі, і комунары ня раз чулі, як, праходзячыя дарогай, сяляне гаварылі:

— Вось гэта дык работа! Вось дык дзяруць!

— Акуратная работа, што і казаць!

Комунары разумелі, што да іх прыглядаюцца, і таму зьмены што раз з большым запалам браліся за ручку плугоў.

— Ідзеце, дзядзькі, да нас працаваць комунай,- сказаў Феданенка, сустрэўшы на дарозе двух Махіроўскіх беднякоў.—Бачыце, як у нас гладка выходзіць!—Абодвы вясёла ўсьміхнуліся:

— А што-ж, і пойдзем, калі ў вас будзе лепш.

Пагутарылі, Феданенка пачаставаў дзядзькоў, якія прыветна ўсьміхаліся, махоркай і разышліся. Такія сустрэчы і гутаркі адбываліся даволі часта, і кожны раз комунары і сяляне заставаліся здаволенымі. Лёгкая недаверлівасьць, праяўленая махіроўцамі ў першы дзень прыезду комунараў, зьнікла. Комуна адчувала на сабе агульную зацікаўленасьць і зусім выразную сымпатыю бяднейшай часткі сяла.

Увечары другога дня Алесь, што выконваў абавязкі брыгаднага запявалы, надумаўся ўспамянуць старое і прымасьціўся з гармонікам на ганку комуны. Яго абкружылі іншыя, і над раздольлем ціхіх палёў паплыла родная камуне чырвонаармейская песьня.

Праз некалькі хвілін да іх нясьмела наблізілася, пашчэплівaўшыся за рукі, грамадка моладзі, што праходзіла па вуліцы, зараз-жа адбывалася знаёмства, а яшчэ цераз хвіліну гармонік перайшоў у рукі іншага музыкі, а няўтомны Алесь аддзіраў на мураўчатым узгорку сярод двара танец, які называўся так:

„Танец на чатыры сукі, шэсьць жыл і адну ператычыну".

Пасьля таго, як Алесь пад трэск воплескаў зрабіў апошні нябачаны ў сьвеце выкрут і абвясьціў, што гэта якраз і ёсьць „ператычына", кіраўніцтва гульнямі было аднагалосна аддадзена яму. Гэткай гнуткасьці і спрытнасьці стану і нечалавечай пругкасьці ног яшчэ ніхто ў Махірове ня бачыў.

І да самага золаку амаль на дварэ комуны разьлягаліся выбухі сьмеху і выкрыкі. Раніцай комунары выехалі ў поле, як і заўсёды, да сонца і ў паўдзён трэцяга дню дванаццаць гэктараў ральлі ляжала чорным бліскучым чатырохкутнікам.

Комунары выехалі на дарогу і накіраваліся да сяла.

У гэты момант з-пад коняй Паўлава, што ішоў першым, з воблака ўзьнятага коньмі пылу, вынырнуў, вымахваючы шапкай, басаногі хлапчук. Адкуль ён зьявіўся, комунары ня прыкмецілі.

Хлапчук на момант затрымаўся на месцы і, спуджана выpачыўшы вочы, задыханы, крыкнуў:

— Дзядзькі... Вашы дзірваны махіроўцы аруць!

Паўлаў схапіў лейцы, і коні, стрыманыя моцнай рукой, падаліся назад забразгаўшы капытамі па ворчыках.

— Што-о-о?

— Аруць махіроўцы вашы дзірваны!—паўтарыў хлапчук, што выкручваўся з боку дарогі,—дзірваны вашы махіроўцы аруць!

Ён яшчэ раз перакруціўся на аднэй назе і кінуўся бегчы ў бок з дарогі, накіроўваючыся да бліжэйшых хмызьнякоў. Зьдзіўленыя комунары некалькі часу стаялі ў маўчаньні.

— Трэба затрымаць,—нарэшце схамянуўся Паўлаў,—даведацца, чый гэты хлапчук.

— Дзе там ужо затрымаеш,—адказаў Кастусь.—Паскакаў, як блыха. Чортам не дагоніш.

Хлапчук, схіліўшы набок галаву, разьдзімаючы пузыром сарочку, пранёсься па ўзьмежжы сенажаці, пераскочыў цераз канаву, мігнуў у рэдкіх зараслях бярэзьніку, узьляцеў на ўзгорак і зьнік.

— Вось гэта дык нумар!—сказаў Паўлаў.—Давай хутчэй у комуну. Зараз-жа праверым, што ды як. Ува ўсякім разе вораг дзейнічае.

Комунары ледзь ня трухам рушылі ў сяло.

* * *

Дабегшы да хмызьнякоў, што суцэльным гушчаром разаслаліся па ўскраі лесу, хлапчук спыніўся і пастаяў. Упэўніўшыся, што яго ніхто не даганяе, ён вузкай няпрыкметнай сьцяжынкай прабраўся ў гушчар і, зрабіўшы далоні трубкай, звонка крыкнуў:

— Кось, кось, ко-о-о-сь!

Праз хвіліну хлапчук паўтарыў воклік. І тагды зусім блізка ад яго нехта зашамацеў і, крышачы грузнымі крокамі гальлё, пачаў набліжацца. З гушчару высунуўся Піліп.

— Ну, як, сказаў?—запытаў ён, азіраючыся.

— Сказаў.

— А яны што?

— Нічога. Я кажу: махіроўцы вашу зямлю аруць, дык адзін спытаў, „што“. Я паўтарыў, ды ходу.

— Не даганялі?

— Не. Нават не крануліся.

— Добра,—сказаў Піліп.—Спрытна вышла... Няхай яны зараз з махіроўцамі пагутараць. Гы-гы-гы...

Ён загугнявіў глухім, гыркаючым сьмехам.

Цень здрады

На гэты раз сход комуны адбыўся ў памяшканьні. Комунары сядзелі маўклівым колам за новым, зьбітым са сьвежых дошчак, сталом, накрытым чырвоным паркалёвым прасьцірадлам. Дарэчы, гэты стол быў адзінай аздобай памяшканьня комуны. Сьцены хаты былі чорнымі ад вільгаці, столь і падлога дзіравымі, з іх былі вышчэрблены лепшыя дошкі. Рамы вокнаў невядома кім выняты, і зараз вокны былі застаўлены далёка меншымі рамамі. У куце чорным правалам закураных чалесьнікаў разьзявалася няскладная печ. Гэта было ўсё, што ня здолеў прадаць поп. Абсталяваньне дому камунары адкладвалі на пазьнейшы час.

— Ёсьць зьвесткі аб тым,—гаварыў Воўчанка,—што пастанова зямельнай комісіі не абвешчана, дзякуючы нядбайніцтву члена сельсавету, які адкладваў абвяшчэньне з дню на дзень. Кулакі скарысталі гэты промах, і мы апынуліся ў наступных умовах. Калімы забаронім махіроўцам карыстацца зямлёй, дык становімся перад фактам надзвы-

чайнага абвостраньня адносін з бядняцкай часткай сяла. Памятайце што беднякі атрымалі падвойную норму, і самая нязначная частка, перапала на долю маламоцных серадняко̆ў. Такім чынам у нас на няві вызначаны тэрмін зьнікаюць пэрспэктывы вызваленьня беднаты ад кулацкага ўплыву і разам з гэтым пэрспэктывы росту. Калі-ж мы аддамо цаліну, дык мы робімся проста анэкдотам, комунай бяз зямельнай плошчы, бяз усялякіх гаспадарчых мажлівасьцяй. Памятайце, што там 60 гэктараў зямлі. Гэтым-жа мы здаём кулацтву позыцыі бяз бою.

— Воўчанка памаўчаў. У хаце стала зусім ціха, і ў працягу хвіліны ніхто не парушыў гэтае цішы.

— Таму,—працягваў Воўчанка,—парт'ячэйка і савет комуны вынесьлі пастанову: зьвярнуцца да адпаведных органаў аб канчатковай забароне карыстаньня незаконна захопленай пасеўнай плошчай комуны. Мы гэтую зямлю ўзаром і ўвясну засеем, чаго-б гэта ні каштавала. Я скончыў.

— Хто жадае выказацца?—азваўся старшыня сходу.

Устаў Сьняжко.

— Я хачу сказаць у тым сэнсе, што савет вырашыў няправільна. Калі мы забаронім узорваць цаліну, беднота стане да нас варожа адносіцца, гэта створыць найлепшую глебу для агітацыі кулаком. Пачнецца цкаваньне, бо нас усяго дванаццаць чалавек, а іх сотні...

Сьняжко памаўчаў хвіліну і дадаў:

— І калі мы яшчэ ў дадатак ня справімся з вытворчай праграмай, дык... канчаткова страцім усялякую вартасьць, як комуна.

— Далучаюся да погляду Сьняжко—заявіў Скараходкін.

— Абудва вы дурні!—азначыў рашучы на слова Янка.

— Цішэй,—спыніў старшыня,—табе не давалася слова.

— Пытаньне да Сьняжко,—ўзьняў руку Феданенка.—А што будзе, калі мы пакінем справу так, як яна ёсьць зараз?

За сталом прыціхлі.

— Вельмі проста,—адказаў Сьняжко,—адносіны з беднатой застануцца ранейшыя, кулацтва будзе пазбаўлена падставы для большменш грунтоўнай агітацыі, і нарэшце зямля гэтая, нават яшчэ не засеяная, вернецца разам з іншай у комуну.

— Вернецца, разьзяўляй рот.

— Размаляваў, як пальцам па талерцы. Кулацтва будзе пазбаўлена агітацыі. Хіба тагды, як камуна аддала-б кулаку сваю пасеўплошчу поўнасьцю.

— І Сьняжко ў прыдачу,—крыкнуў Янка.—Апартуніст!

— Цішэй, таварышы!

— Якім чынам зямля зьвернецца?

— Увясну будзе прыліў,—адказаў Сьняжко.

— А калі ўвясну ды ня будзе?

— Прынамсі ўвосень, абавязкова будзе!

— А ты на гародзе комуну пабудуеш?

— Садзіся, Сьняжко!

— Засыпаўся!

— Я выказваюся, каб не забараняць махіроўцам заворваньне цаліны,—павысіў голас Сьняжко.

— І я яго падтрымліваю,—скончыў Скараходкін.

— Ці не папалі вы, хлапцы, як хадзілі малако купляць, у хату да рудога Піліпа?—пацікавіўся Алесь.—Неяк абудва гугнявіць пачалі.

Усе засьмяяліся. Сьняжко, крыху зьбянтэжаны, сеў і пачаў перашэптвацца са Скараходкіным.

— Хто яшчэ?...

— Я,—азваўся Ільля.—Я коратка. Здацца кулаку такім агідным чынам, як гэта рабіў Сьняжко, гэта папросту прадаць ворагу вучастак соцыялістычнага будаўніцтва. Пры інакшай формуліроўцы і крыху інакшых абставінах за гэткія справы расстрэльваюць. Савет пастанавіў правільна, і сход павінен прыняць пастанову савету, даўшы гэтым самым рашучы адпор усялякім дэмобілізацыйным настроям, якія тут пачаў выяўляць Сьняжко. Я скончыў.

— Стаў на галасаваньне!—запрапанаваў Алесь.

— Сьняжко скрывіўся ўсьмешкамі і зноў нахіліўся да вуха Скараходкіна.

— Хто за пастанову савету?

— Адзіным рухам узьнялося дзесяць рук.

— Большасьць,—сказаў старшыня.—Гэтае слова парадзіла слова—„бальшавік".

Пытаньне было вырашана.

За сталом, у самым яго канцы, засталіся сядзець: панурыўшыся, хмуры Скараходкін і насьмешлівы Сьняжко. Комунары выходзілі і кожны дапытліва аглядаў абудвых. Комунары бачылі прамільгнуўшую на тварах двух таварышоў цень здрады.

Канец будзе.

Паўлюк Ананьнеў

З цыклю „шахта буніць[1])“

Яму пашоў нядаўна восьмы год,
Восьмая мінае толькі восень;
А зрок вачэй сапсуўся ў яго
І ногі хілкія
Ўжо адпачынку просяць.
...Так... мала год...
І ў памяці нямнога
Зьбярог дагэтуль ён
Жыцьця абрыўкаў:
Вось ён ледзь-ледзь
Становіцца на ногі
Гарэзьлівы жарэбчык-чорнагрыўчык.
Устаў...
Нясьмела паглядзеў вакол.
Абнюхаў гной.
Пажваў зялёны быльнік.
Ды стаў адшукваць
Інстынктам малако
У сваёй матулі—рыжае кабылы.
...А потым іх з матуляю праз вёску
Павеў у стэп задумлівы Грыцько...
...Ён помніць Дона ціхага усплёскі
І табуны стэповых рысакоў.
...А дні расьлі і сьпелі
Сакавітай дыняй.
Як прамінула два гады яму,
Грыцько тады, пагладзіўшы
па сьпіне,
Надзеў ласкава
вазавы хамут.
..Цяпер бывай
начэй дзіцячых радасьць
І стэп,
дзе ўчора маладосьць расьціў...
Ён няпрывычным бегам па загаду
Дарогу пыльную

---

[1]) Буніць—шахцёрскі выраз—працуе напружана.

Ускапыціў.
...Калі Грыцько з сваёю маладзіцай
Сабраў з бахчы ў сьвіран
кавуны,
Падрадчык Нохэн
У бліжнюю станіцу
Прыехаў з шахты набіраць „каніў".
Прадалі многія—
Тым сена будзе мала,
А той наважыў лепш купіць валоў;
І Нохэн самых
Лепшых і трывалых
Забраў з данскіх стэповых
табуноў...
На Чорнагрыўчыка зірнуў ён ззаду:
—Ламай, Грыцько,
Чырвонец напалам!
...Цяпер бывай
Начэй дзіцячых радасьць
І стэп,
дзе ўчора маладосьць плыла!

* * *

Містэр Піцерс у краіне бальшавікоў
Меў вугальную концэсію...
Нохэн у яго быў
Правай рукой
І абодвым жылося весела.
К Піцерсу фунты
З-за меж плылі,
Ды з шахты вялікі прыбытак.
Кожны месяц ён з нетраў зямлі
Даставаў сотні тон
антрацыту.
З фунтамі разам
атрымліваў ён
І лісты сакрэтнаю поштай.
Заўжды адзін прыяжджаў
„паштальён"
І ў лістох
знаёмы росчырк:
„Містэр Піцерс,
Трэ' фінансаў шмат:

Набівай туга каліту.
У клясавых бойках
перапыну няма,
Як няма супакою
нам тут.

Савецкі урад
З адбудоўкай шахт
Праляціць нямінуча ў дым...
..Містэр Піцерс, а покуль шш-ша...
Містэр Піцерс, ну а тады...
Ну, а тады мы Данбас
Загонім у фінансавы капкан.
Адрэжам ад „Савеціі“
Донвугаль ураз:
У Брытаніі —магутная рука.

А спатрэбяцца танкі, газ,
Строй гармат, штыхоў;
Мы з Брытаніі рушым ураз
На Савет
з усіх бакоў!..“

...Містэр Піцерс выконваў плян
Сваіх аднадумцаў
грывінсаў, рахцераў...
А Нохэн паехаў коні купляць
Для эксплёатацыі
новай шахты.

* * *

Зьмяіцца чыгунка...
На сотай вярсьце
Цягнік супыніў рытмы колаў.
У апошні раз паглядзелі
на стэп
З трывогай і больлю
казацкія коні.

Пачулася злоснае коньнікаў
НН-НО...

І пугі у сьпіны ўселіся груба.
Іх потым пагналі туды табуном,
Дзе чмыхаюць дымам
чырвоныя трубы.

А далей—адно вокамгненьне
і клець

Кінула ўніз іх
у глыбокія нетры...
Горача. Брудна.
Шахцёрка ледзь-ледзь
Кідае сьвятло на паўмэтра...
Зьмяіцца дарога...
І днём і ўначы
З забою ідуць вагонэткі
па штольні.
Забыўшы пра стэп,
пра начлег-адпачын,
Іх возяць сьляпыя панурыя коні...
Так месяц...і год...
І жыцьцё усё тады
Ня ведае зьмены ў шахце
ніякай...
...Уздрыгнуў Чорнагрыўчык
нутром маладым
І так заірзаў,
бы заплакаў...
Прышоў канагон у пыле і гразі
І з ласкай і з нейкай гразьбою:
— Ну, зараз, мілок,
Антрацыт павазі;
А гэтых сьляпых—
мы на бойню!..
Штрэкі...і штольня...
Вугаль... руда...
Кіркі,
зубкі
і шахцёркі...
Хіба-ж за гэтае можна аддаць
Стэпы
і Дон
і жыцьцё усё?!..

* * *

Я ня бачыў вас,
Містэр Піцерс,
Калі працавалі вы
ў нас.
Але, нават, у ночны прыцем
Мне ня цяжка вас спазнаць.

Вы на фордзе гайсаеце
з пэнтам,
Горда ўзьняўшы галаву...
...Вы былі адзін з тых агентаў,
якія інструктавалі С. В. У.
Вы кружыліся
чорным воранам,
Каб што-кольвек
ў нас скарыстаць,—
Пакуль край наш
быў разьбіты і змораны—
І на ногі
надзейна ня стаў.
А цяпер у нас не дваццаты—
Трыццаць першы
наблізіўся год:
Мы вядзём край у новае заўтра
Цягліцамі рабочых когорт.
Змагаемся сёньня упарта
За вугаль,
руду
і за нафту...
А вам—Містэр Піцерс—
у дваццаць пятым
Загадалі мы пакінуць шахту.

* * *

...Цяпер гэта шахта—
Адзін арганізм,—
Юнацкі, дужы, поўнакроўны...
Я сёньняшняй ноччу праходку буніў
І чуў вось такую размову:

. . . . . .

. . . . . .

„Мне пэўна нядоўга цяпер ужо плыць,
Старасьць год за годам
Акунвае ў хвалі;
Таму я ўласнага сэрца цяплынь
Сягоньня ў гэтым вуглі
захаваю.
Галубчык мой, Паша,
Вось ты на плітах
Вугаль, пароду цяпер
гатункуеш—

Прашу я цябе,
не затрымлівай там;
Каб трапіў хутчэй, як мага,
на гару ён...
Стаіць шмат вагонаў
цяпер ў тупіку.
Стаіць паравоз, поўны сілы і рымсту,
Чакаючы вугалю з шахты—
пакуль
З выбаркі, мыйкі
ня прыдзе ён чысты...
. . . . . .
. . . . . .
І пойдзе нагружаны поезд тады
Далёка...
праз стэпы, балоты і горы.
Завязе майго сэрца цяплынь
у гарады
У мільёнах малых і вялікіх калёрый...
І грузчык-ударнік—
на плечах загар—
Вагоны разгрузіць
з юнацкім спрытам;
А потым асмуглы, як я, качагар
Насыпле у топку шмат
антрацыту...
Абудзіць энэргію
сіла і тэмп—
Крывёю па вэнах яна разальлецца:
І пойдуць заводы,—
запрацуе мартэн
ЭНЭРГІЯЙ
МАЙГО
СЭРЦА...
. . . . . .
. . . . . .

Стары...
А колькі у жылах яго
ўсё жыцьцё
Вось гэтай самай энэргіі пеніцца!
Недарма-ж за трыццаць першы год,
Як ударнік шахцёр,
АТРЫМАЎ ЁН ОРДЭН ЛЕНІНА...

* * *

Не пазнаць жыццьцё у новым разгоне.
Не пазнаць віхрамётныя дні.
Учора вугаль адвозілі коні—
Сёньня іх рухавік замяніў;
І таму лятуць клеці ўздагонку—
З шахты коні вязуць „на гара“.
...Разважаў Чорнагрыўчык
па-конску:
„Пэўна зноў у хамут і... араць.
Толькі нешта ня слухаюць ногі,
Сапсаваўся зарана пагляд;
Аксамітнай шырокай дарогай
На ўвесь лоб сівізна ўжо лягла.
Маладосьць мая сьціснута крэпам,
Нават цяжка аб тым прыгадаць;
Што пайду я ў любыя стэпы,
Дон умчыць хваравітасьць у даль.
Ня сумуй: Дон і стэпы, і воля,
Табе сілу дадуць,
любы конь.
Пойдзеш ты на колгаснае поле
У колёне данскіх рысакоў.
...А ў адказ рытмы,
звоны
і грукат.
Усюды новая праца буніць.
Аджывае старое ў муках—
Нараджаюцца новыя дні.
Глянь—зубок,
што калісьці стагодзьдзі
З чорных жыл антрацыт цярушыў,
Зараз лёг мерцьвяком на пародзе
Між старых непатрэбных машын.
А учорашні саначнік Гаеў
Скінуў лямку з плячэй у крыві;
А пароду, што ў санках
цягаў ён,
Будзе зноў-жа вазіць рухавік.
...Электрычнасьць у штрэкі,
на пліты
Нацякае
крывёй
з правадоў.

Ад магутнага узрыву дынаміту
Антрацыт узьлятае з рудой...
Гэта нашы вялікія будні,
Успамін пра наказ ІЛЬЛІЧА...
Гаспадар прышоў новы на руднік—
І па-новаму справу пачаў...
...Глянь па штольні—вялікім тракце—
Цячэ вугаль пад сьпеў гарнякоў.
...І буняць штрэкі, пліты ў шахце,
Што трымаў калісь Піцерс і К°...
Толькі з вугалём у Туле няладна.
Рапартуе таксама Растоў...
І ў адказ нашай шахты брыгады
Перавыканалі плян на сто тон...
Гэта нашы вялікія будні.
Успамін пра наказ ІЛЬЛІЧА...
Гаспадар прышоў новы на руднік—
Па-ударнаму працу пачаў...

8-4/VIII—31 г.
Менск.

Цім. Гарбуноў

Конзавод

(*Нарыс*)

У двух кілёмэтрах ад Гомелю, паміж смалістых сасонак і пладавітага саду, раскінуўся конны завод.

Слова „завод“ гучыць для нас знаёмым словам. Мы прывыклі бачыць заводы з вялікімі камінамі, якія задымліваюць блакітнае, або дажджом заплаканае, неба. І абавязкова прывыклі слухаць на заводзе грукатаньне машын. На гэтым-жа заводзе вы ўбачыце зусім другі малюнак. Паміж маладых дрэў вы прачытаеце над варотамі заводу шыльду:

ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ КОННЫ ЗАВОД БЕЛАРУСІ №59

А за воратамі, гэта значыць у дварэ заводу, ніякіх каміноў, ні дыму, ні грукатаньня машын вы ня ўбачыце і не пачуеце.

Куды ні паглядзіце, вы ўбачыце коняй рознай масьці. Шэрых, вараных, гнядых. Рысакоў, скакавых, цяжкавозаў. Старых і маладых.

Тутака сапраўднае конскае царства. Вы папалі ў конскі край.

Людзі, з якімі мне прыходзілася гутарыць на конзаводзе, на 95 процантаў гавораць пра коняй. Аб чым бы вы ні вялі гутарку— аб транспорце, аб колектывізацыі, аб будаўніцтве, аб памідорах, яблыках, і вы заўсёды пачуеце адно і тое-ж самае: „конь“.

Рабочыя конзаводу жывуць у вельмі добрых умовах. Прыгожыя домікі, раскінутыя ў сасновым бары. Чыстыя, сонечныя кватэры. У кватэрах электрычнасьць і ўсё як мае быць у цяперашняй рабочай кватэры.

Але запэўняю вас, што конскія „кватэры“ нікольк ня ўступаюць людзкім. Папершае, кожны „Васька“, „Інтарэс“ або „Мазэпа“ мае самастойную з вялікімі сьветлымі вокнамі і пры тым электрыфікаваную кватэру. Падлога ў калідоры і ў кватэрах чыста вымыта. „Ваські“ і „Мазэпы“ патрабуюць самага культурнага абыходжаньня з сабою, „Мазэпы“, „Ваські“, „Інтарэсы“ зьяўляюцца тут фактарамі палітычна гаспадарчага жыцьця. Людзі літаральна ахвяравалі сябе гэтым „Мазэпам“ і „Васькам“. Ахвяравалі сябе, каб выгадаваць моцнага цягавітага каня для нашых саўгасаў і колгасаў.

Што да культурна-санітарна-бытавых умоў „Васькаў“ і „Мазэпаў“, дык павінен сказаць, што яны лепш пастаўлены, чым на многіх нашых прадпрыемствах. Па-першае, кожны конь мае чыстую „пасьцель“. Сьнеданьне, абед і вячэра „Васькам“ і „Мазэпам“ даюцца ў

строга ўстаноўленыя гадзіны, а самае важнае—па нормах. Пры тым ні „Мазэпа“, ні „Васька“ (ня кажучы ўжо пра „Інтарэса“) і ні адзін з 314 коняй не дазваляюць сабе выйсьці ў „людзі“ нячышчанымі. „Ваські“ і „Мазэпы“ купаюцца, пасьля купаньня іх выціраюць. Так ужо заве дзена. Так патрабуюць самі коні. Коні маюць і час забавы.

Некаторыя коні, скажам як „Інтарэс“, „сядзяць“ на спэцыяльнай дыэце. У „гогалі-могалі“ „Інтарэс“ разьбіраецца ня горш, як які небудзь кухар.

Добры харч, кватэрныя ўмовы, правільны дагляд даюць моцнага выносьлівага каня.

І калі выехаць на такім кані, дык ня ўсякі „форд“ з вамі згоніцца.

Пару слоў пра „мэдыцынскае“ абслугоўваньне коняй. Па-першае, я многім раённым урачом параіў-бы так адносіцца да хворых людзей, як вэтэрынары адносяцца ў конзаводзе да здаровых коняй.

Вялікае, прасторнае сонечнае памяшканьне служыць шпіталем для лячэньня коняй. Сьцены афарбаваны алейнай фарбай. Чыста вымытая падлога. Чысты стол і прылады для розных опэрацый.

Усе коні маюць спэцвопратку.

Не пасьпеў я добра пазнаёміцца з гэтым конскім краем, як хутка паклікалі ісьці ў канцэлярыю конзаводу. Прыходжу. Даюць чытаць тэлеграму. Чытаю:

„Масква. Гомель. Прудок. Конзавод. Іваноў.
„Інтарэс“ узяў прыз рэспублікі. Прабег
1600 мэтраў за 2 мінуты 8 сэкунд. Завод
прэм'яван 3.000 рублёў.
Вітаем. Мальвінскі. Семечаў“.

— Вы разумееце, што гэта значыць?—запытвае ў мяне тав. Шаўцоў Макар, старэйшы конюх.

Мне, прызнацца, сорамна. Хоць я і вельмі люблю коняй, але я ня ведаю самых элемэнтарных правіл догляду за канём. Я толькі ведаю запрэгчы каня, кінуць яму ў куток сена, сьцебануць пугай і праехаць. А дзе мне да гэткіх рэчаў, як вылічваньне конскага бегу мінутамі і нават сэкундамі. Маё маўчаньне выдае мяне з галавой.

— Гэта значыць, што мы неўзабаве перагонім Амэрыку,—падказвае тав. Сафронаў,—адзін з арганізатараў конзаводу, шэф конскага маладняка. Толькі ў Амэрыцы ёсьць конь, які прабягае гэткую-ж адлегласьць—1600 мэтраў у адну мінуту 58 сэкунд. Яшчэ нацягне 10 сэкунд „Інтарэс“, і мы перагонім Амэрыку! Зразумелі?

— Таварышы, адных толькі 10 сэкунд, і мы перагонім буржуйскую Амэрыку.

— Мы яе, таварышы, абавязкова перагонім! Яна адступае назад, а мы ідзём наперад. Мы становімся першай краінай у сьвеце па будаў-

ніцтву сельскагаспадарчых машын. Па вугалю, па мэталю, па нафце мы даганяем і пераганяем перадавыя капіталістычныя краіны!

— Капіталізм адступае!

Перамогу „Інтарэса“ рабочыя конзаводу сустрэлі радасна. Загаманілі з усіх бакоў старыя. моладзь, дзяўчаты, хлопцы.

Тутака, паміж кудлатых сасонак, гэтыя людзі жывуць аднэй ідэяй: „дагнаць і перагнаць“.

Даведваюся пра „Інтарэса“. Гэта адзін з улюбёных выхаванцаў конзаводу, адзін з двух лепшых коняй Савецкага саюзу. Спрабую што колечы запісваць. Тав. Шаўцоў дапаўняе мае запісы.

За „Інтарэса“ яшчэ да банкруцтва Нямеччына прапанавала СССР 400 тысяч марак золатам. Гэта каля 200 тысяч рублёў золатам.

— А калі гэтыя грошы перавесьці на трактары, дык будуць сотні трактараў,—дабаўляе адзін з канюхоў.

— Але „Інтарэс“ прададзен ня будзе,—растлумачвае тав. Шаўцоў. Савецкая краіна сама вырабляе трактары. Нам патрэбны сотні тысяч трактараў, нам патрэбны мільёны лепшых у сьвеце коняй.

Першы дзень майго прыезду на конзавод я цалкам прысьвяціў абгляду коняй. Больш усяго мне спадабаўся маладняк, а яшчэ больш яго шэф—лепшы ўдарнік тав. Сафронаў. З-пад чорных броваў Сафронава радасьцю сьвецяцца вочы. На зморшчаным гадамі твары вялікая ўпэўненасьць. На грудзёх красуецца „ордэн Чырвонага працоўнага сьцягу“.

Пачынае зьмяркацца. „Мазэпы“ і „Ваські“ атрымалі вячэру. Лянівa шалясьціць лісьцём сад. З гароду нясецца пах сьпелых памідораў. Вячэрнюю цішыню патрывожыў галасісты гармонік. У руках музыкі гармонік засьпяваў пра слаўную коньніцу Будзённага. Гэта хлопцы ішлі сустракаць дзяўчат, якія варочаліся з работы. Панеслася песьня:

— Ах конь мой з доўгай грывай,
Мы паедзем з табой за савет ваяваць...

Задрыжэла вячэрняя цішыня ад маладых і задорных галасоў.

* * *

А цяпер бяз лірыкі. Аднак некаторыя лірычныя грахі будуць мець месца.

Ў 25 кілёмэтрах ад Гомелю, на руінах панскага маёнтку, у трывогах, у вагні жорсткай клясавай барацьбы нарадзіўся першы конны завод Беларусі. Ініцыятарамі ў організацыі конзаводу былі гомельскія бальшавікі.

Яшчэ расьсьцілаўся густы дым ад спаленых белапалякамі вёсак і мястэчак, яшчэ не зажылі раны, нанесеныя Гомельшчыне бандай Стракапытава, а гомельскія бальшавікі ўжо па-баявому браліся за адбудову разбуранай гаспадаркі.

Хрыпла гулі гудкі заводаў. Раздаваліся першыя ўдары малаткоў. Нібы старыя дзядулі, кашлялі цягнікі.

Стаяла баявая задача—адбудаваць разбураную сельскую гаспадарку. Сельскай гаспадарцы патрэбны былі ня толькі плугі, сельскагаспадарчыя машыны, але патрэбны былі і коні.

Раней немцы, а потым белапалякі ўзялі з краіны лепшых коняй. Гомельскі губком партыі і губвыканком парашылі будаваць у былым маёнтку Шарсьціна конны завод. Парашылі і зрабілі. Дырэктарам заводу быў прызначаны тав. Іваноў.

Тры дзесяткі вясковых пролетараў прышлі на руіны панскага маёнтку, каб хутка пабудаваць конны завод. Пачалі зьбіраць племянны матар'ял. На крутых берагох ракі Сажу знайшлі 2 кані. Гэта былі коні, пакінутыя Кіеўскай ЧК пры эвакуацыі Кіева праз Гомель. Кабылу празвалі „Граза" а жарабца„—Кобзар". Пара каросьлівых коняй—вось і ўсё багацьце конзаводу. Але будаваць конны завод былі закліканы лепшыя вясковыя пролетары. Тры дзесяткі вясковых пролетараў зьмяшчалі ў сабе нязьмерную творчую сілу. Гэта творчая сіла ўступіла ў жорсткую бойку за гаспадарчае будаўніцтва конзаводу. Тры дзесяткі вясковых пролетараў усю энэргію, увесь свой энтузыязм накіравалі да таго, каб перамагчы клясавых ворагаў, каб выгадаваць савецкага моцнага каня.

Такі быў загад комуністычнае партыі.

Т.т. Іваноў, Сафронаў, Шэліх, Бычкоў, Кавалёў, Кузьмін, Шэвель —першыя арганізатары конзаводу на загад партыі ўпэўнена адказалі

Дамо краіне сотні моцных цягавітых коняй!

Дзе жарабца, а дзе кабылу знаходзілі гомельскія бальшавікі і накіроўвалі на конзавод. У большасьці гэта былі змучаныя грамадзянскай вайной і разьедзеныя каростай коні.

— Іваноў вылечыць каросту!

Год упартай барацьбы і колектыўнай працы даў такія вынікі, аб якіх нават і ня думалі. Учарайшыя каросьлівыя маткі і жарабцы пачалі раджаць здаровых дзяцей.

Потым атрымалі другі баявы загад—гадаваць скакавых і верхавых коняй.

—Ёсьць!—адказалі вясковыя пролетарыі і ўпарта ўзяліся за работу.

Клясавы вораг ня спаў. Ня раз бандыты рабілі спробу зруйнаваць конны завод. Кулакі травілі пакосы, зьнішчалі аснову конзаводу—кармавую базу.

Прышла лютая зіма. Затрашчалі маразы. Над заводам павісла трывога:

— Няма корму.

Рабочыя конзаводу рассыпаліся па вёсках зьбіраць корм. Зьбіралі жменькамі сена, хунтамі авёс. Ваявалі з лютай зімой, з лютымі клясавымі ворагамі. Ваявалі, каб выгадаваць сотні коняй, каб выйсьці з бойкі пераможцамі.

...Красавік ішоў к канцу. Сонца гнала сьнег з палёў. Зьявіліся чорныя праталіны. Конзаводу прырэзалі зямлі. Перад заводам стаяла баявая задача—стварэньне моцнай кармавой базы. Трэба было пашыраць плошчу, паляпшаць якасьць лугоў.

Калі падсохла зямля, нібы мурашкі зашавяліліся рабочыя. Упарта ўзяліся за работу. Дзякуючы энэргіі Сафронавых, Івановых, Кавалёвых, конзавод з гэтай задачай бліскуча справіўся. Так у барацьбе за каня, за кармы, у барацьбе з клясавымі ворагамі рос і разьвіваўся конны завод.

* * *

У 1924 годзе конны завод наведаў тав. Будзённы.

Горача рабочыя сустрэлі тав. Будзённага, організатара Чырвонай коньніцы. У кнізе для запісаў наведвальнікаў тав. Будзённы запісаў наступнае:

„Убачыўшы конны завод, лічу, што племянны матар'ял зьяўляецца надзвычайна вялікай каштоўнасьцю ў той час, як у нашай краіны яго засталося вельмі мала. Памяшканьні для коняй абсталяваны вельмі добра. Догляд за коньмі ўзорны. Загадчыку земаддзелу неабходна зьберагчы гэты завод чаго-б гэта ні каштавала.

22 чэрвеня 1924 года. Будзённы С."

У 1926 годзе, у сувязі з далучэньнем Гомельшчыны да БССР, конны завод стаў першым дзяржаўным заводам Беларусі. Пры перадачы конзаводу яго наведалі тав. Галадзед, Крыніцкі, Адамовіч і Будзённы. Прыводзім кароткія запісы аб конным заводзе.

„Гомельскі конны завод організаван узорна. Відаць, што патрачана шмат сіл, сродкаў, зьвернута шмат увагі мясцовымі організацыямі на ўзмацненьне заводу. Скакавое і рысістае аддзяленьні абяцаюць вялікае будучае ў сваім разьвіцьці, тым больш, што сялянства асабліва цікавіцца легкавой пародай. Лічу, што далейшае заводу будзе мець важнейшае значэньне для сельскай гаспадаркі.

Галадзед".

„Конзавод, які зараз перайшоў пад кіраўніцтва ўраду БССР, неабходна ўзмацніць. Гэта неабходна ў інтарэсах сельскай гаспадаркі і Чырвонай арміі.

А. Крыніцкі"

„Конзавод з гэтага часу будзе разьвівацца таму, што ён будзе дзяржаўным заводам Беларускай рэспублікі. Я вельмі рад, што завод зьяўляецца рассаднікам коняй у гэтай рэспубліцы.

Будзённы С."

„Даць здаровага, моцнага каня вёсцы—вялікая справа. Працаваць над гэтай справай павінен конны завод. У гэтай вялікай

справе ўрад БССР заўсёды будзе завод падтрымліваць. Коні, якіх я бачыў тут на заводзе, зрабілі на мяне вельмі добрае ўражаньне.

Адамовіч І.“

„Конзавод у добрым становішчы. Неабходна падтрымка з боку мясцовых організацый.

Комдзіў Чангарскай Каўдывізіі Гарадавікоў“.

У 1926 і 27 гаспадарчым годзе на конзаводзе было: рысістых матак 18, верхавых матак—17. Маткі далі 31 жарабё, ці 88,5 процантаў выжарабкі.

Злучная дзейнасьць вытворнікаў-жарабцоў за сэзон 1927 году паказана ў наступных лічбах: рысістыя—25 жарабцоў-вытворнікаў пакрылі 577 матак, шэсьць цяжкавозаў пакрылі 253 маткі, 2 скакавыя вытворнікі пакрылі 17 матак. Акрамя таго, пакрыта штучным спосабам: трыма цяжкавозамі 150 матак, двума рысістымі—162 маткі.

У гэты час на конным заводзе было: рысістых жарабцоў 31, рысістых матак 61, скакавых жарабцоў 20, матак 35.

Усялякія спробы прышчэпаўцаў разбурыць конны завод з боку мясцовых партыйных організацый сустракалі самы рашучы адпор. Завод удалося зьберагчы. У 1929 годзе на заводзе было: рысістых коняй 113, скакавых 73.

Зараз конны завод налічвае 314 лепшых на Беларусі коняй. Рысістых 144, верхавых 96 і 74 цяжкавозаў. Матак на заводзе 82. За апошнія два гады выгадавана маладняка 151 штука, 76 жарабцоў-вытворнікаў адпраўлены на злучныя пункты ў колгасы.

За дзесяць год існаваньня конзаводу яго жарабцы-вытворнік пакрылі звыш дзесяці тысяч матак. Нарадзілася звыш дзесяці тысячі лепшых коняй.

З 1924 году на конным заводзе ўтвараецца штучнае апладатварэньне матак. Штучным спосабам пакрыты дзесяткі тысяч матак. Дзякуючы існаваньню конзаводу на Гомельшчыне і наогул у БССР значна палепшыўся конскі склад.

З паказаных лічбаў відавочна тая вялікая роля, якую адыгрывае конны завод.

Посьпехі ў працы конзаводу ёсьць вынік доўгай і ўпартай працы вясковых пролетараў. Каня ня так хутка выгадаваць. Маладняк на конзаводзе пачалі гадаваць тады, калі ўжо быў сабраны адборны конскі склад.

* * *

Некалькі разважаньняў пра каня.

Чыстакроўны скакавы конь — нацыянальны гонар Ангельшчыны. Акрамя забавы лёрдаў і „шляхэтных лэдзі“, конь у Ангельшчыне адыгрываў і яшчэ адыгрывае вялікую ролю для імпэ-

рыялістычных мэт. Для прыдушэньня, скажам, паўстаньня індусаў, акрамя танкаў, аэропланаў і ўсіх іншых дасягненьняў тэхнікі, Ангельшчына ў шырокім маштабе скарыстоўвае коняй.

Як вядома, справы Брытанскай імпэрыі надзвычайна дрэнныя, як гэта кажуць, „ахавыя", і таму конягадоўля ў Ангельшчыне пачынае занепадаць.

Яшчэ ў часы Юлія Цэзара Брытанія славілася сваімі коньмі. Пры дапамозе коняй заваёўваліся новыя краіны. І з за-меж ўвозіліся новыя коні. Так, былі ўвезены барбарыскія, арабскія і інш. пароды коняй.

Карл II (1660-1685 г.), вялікі дэспат і вялікі аматар коняй, сабраў у сваіх конскіх заводах усе пароды конскіх матак, якія меліся ў сьвеце. Гэтыя конскія маткі атрымалі назву „каралеўскіх кабыліц". Ад „каралеўскіх кабыліц" Ангельшчына вывела чыстакроўныя пароды коняй. І да гэтага часу Ангельшчына зьяўляецца ня толькі краінай „каралеўскіх кабыліц", але нават краінай каралёў.

„Каралеўскіх кабыліц" у Ангельшчыне трымаюць для забавы, а караля трымаюць для „парадку".

Адзін славуты ангельскі лёрд сказаў крылатую фразу пра каня. „Калі конь будзе ведаць столькі, колькі я, ён перастане вазіць мяне". Мне думаецца, што славуты лёрд мае на ўвазе ня толькі коняй. Справы ангельскіх лёрдаў з кожным днём пагаршаюцца, і таму зусім нормальна, што конягадоўля ў Ангельшчыне ідзе хуткімі тэмпамі да заняпаду.

У Расію чыстакроўныя коні пападаюць у 18 стагодзьдзі.

Чым, скажам, быў горшы за ангельскага лёрда расійскі граф Арлоў, граф Растопчын або князь Русаў.

Што да радаслоўнай каня, дык дасканальнай даты нараджэньня першага каня я не знайшоў ні ў аднэй кнізе, хоць шмат кніжок на гэту тэму я перачытаў. Вядома, што яшчэ за 1200 год да нашай эры асірыйцы ў цяперашнім Туркестане знайшлі вельмі добрых коняй. Войска Аляксандра Македонскага пры ўзяцьці крэпасьці Самарканд ў 336 годзе на берагох мутнай Сыр-дар'і забрала для сваёй кавалерыі звыш 4 тысяч адборных коняй. Гэтыя коні былі белыя, як паўночны сьнег, а на бягу ад іх ня мог уцячы ніводзін зьвер.

Грэцкі гісторык Гэродот, апісваючы пэрсыдзкія вобласьці, гаворыць, што бактрыйцы, сакі, каспіі, хорэзьмійцы і арыйцы—народы, якія насялялі ў тыя часы Пэрсію, былі лепшымі каняводамі. Іх коні былі колеру, як ранішнія зоркі.

У 666 годзе арабскі таленавіты правадыр Рэбі-Ібн-Уль-Хор дайшоў да сьцен старажытнага гораду Балха, які ў тыя часы вельмі славіўся добрымі коньмі.

Вядомы італьянскі падарожнік Марко Полё (1254 і 1323г.г.) расказвае пра вельмі цікавых коняй, якіх ён бачыў у Туркестане.

Вышэй зьмешчаныя разважаньні, па мойму, ня шкодны. А вось ёсьць разважаньні пра коні зусім іншага парадку.

Усім вядомы кулацкі лёзунг: „Конь не патрэбен, дадуць трактары“. І вось опортуністы, напісаўшы на сваіх сьцягох гэты кулацкі лёзунг, усялякім способам імкнуцца давесьці, што сапраўды цяпер конь не заслугоўвае вялікай увагі.

Гэтыя „прыхільнікі“ трактара забываюць, што кулак знаходзіць усё новыя і новыя формы клясавай барацьбы. Аднэй з такіх форм зьяўляецца актыўная агітацыя за зьнішчэньне конскага пагалоўя ў нашых саўгасах і колгасах, за дэзоранізацыю нашай цягавай сілы.

У шмат якіх саўгасах і колгасах каня недаацэньваюць, не берагуць. На гадоўлю конскага маладняка не зварочваецца дастатковай увагі.

Кулак у сваей контррэволюцыйнай агітацыі суцроць каня не заўсёды сустракае рашучы адпор.

6-ты ўсесаюзны зьезд саветаў па пытаньню аб конях запісаў: „Растрату конскай цягі зьезд саветаў лічыць праявай кулацкага ўплыву і прапануе ўсім органам савецкай улады з гэтымі зьявамі весьці самую рашучую барацьбу“.

ЦО „Праўда“ паставіла задачу даць калгасам моцнага каня. У барацьбу за моцнага, колгаснага і саўгаснага каня трэба ўключыцца па-баявому, па-бальшавіцку.

* * *

Некалькі радкоў пра ўдарнікаў конзаводу. Пра тых самых ударнікаў, якія ўжо выгадавалі сотні моцных саўгасных і колгасных коняй і якіх выхаванцы (коні) пабілі рэкорды „каралеўскім кабыліцам „арлоўскім жарабцом“.

Перада мной сьпіс ударнікаў конзаводу. Іх 76 чалавек. Сяроді ударнікаў значыцца прозьвішча Шаўцова Макара Рыгоравіча.

Крыху з біографіі гэтага ўдарніка.

...Ішла грамадзянская вайна. Наступалі белапалякі. Стары Шаўцоў Рыгор, бацька Макара, разам з маладымі хлопцамі добраахвотна пашоў у Чырвоную армію.

У бойцы за савецкую сталіцу Менск Шаўцоў Рыгор загінуў. Белапалякі адступілі. Чырвоная коньніца значна дапамагла перамагчы ворага.

Шаўцоў Макар застаўся круглай сіратой. Дзевяці гадоў хлопчыкам прышоў на конны завод. На заводзе працуе з пачатку яго арганізацыі. За ўвесь час ня мае ніводнага прагулу. Тав. Шаўцоў—лепшы ўдарнік. На яго канюшні вісіць кароценькая таблічка з прозьвішчамі: Таемнік, Мальбрук, Мазэпа, Аматар. Гэта прозьвішчы коняй, прымацаваных да тав. Шаўцова. За іх Шаўцоў адказвае. Ён іх выхоўвае. Тав. Шаўцоў адзін з першых увёў правільны догляд за коньмі. Пачаў карміць па нормах. Па ініцыятыве тав. Шаўцова ячэйка комсамолу ўзяла шэфства па дапамозе двум колгасам у організацыі правільнага догляду за коньмі, у гадоўлі моцнага колгаснага каня.

За энэргічную работу тав. Шаўцоў прэм'яван.

Тав. Шаўцоў зьяўляецца лепшым агітатарам і організатарам за соцыялістычную конягадоўлю, за моцнага саўгаснага і колгаснага каня.

Недарэмна-ж ён член ЛКСМБ з 25-га году, кандыдат КП(б)Б і сакратар ячэйкі комсамолу.

Тав. Сафронаў адзін з тых двух, хто атрымаў ордэн працоўнага чырвонага штандару. З 1913 па 1921 год тав. Сафронаў працаваў у Амэрыцы на аўтомобільным заводзе Форда. У 1921 годзе тав. Сафронаў пакінуў буржуазную Амэрыку і прыехаў ў соцыялістычную баць-каўшчыну. Дзесяць год тав. Сафронаў працуе на конным заводзе.

Прыдзеце самай раньняй раніцай на канюшню і вы заўсёды знойдзеце тав. Сафронава. На яго ўскладзена адказная справа—гадаваць конскі маладняк. Яго канюшня пастаўлена ўзорна. Вечарам пры сьвятле электрычнай лямпачкі тав. Сафронаў вылічвае спажыўнасьць морквы, буракоў, складае сустрэчны плян па сваёй канюшні. За дзесяць год тав. Сафронаў выгадаваў 150 лепшых коняй. Аб тым, што ён лепшы ўдарнік, сьведчыць і гэта грамата:

Грамата

Цэнтральны выканаўчы комітэт БССР у знак выкананьня тав. Сафронавым свайго абавязку перад соцыялістычнай баць-каўшчынай на фронце працы дае ў знагароду—знак ордэну працоўнага чырвонага штандару БССР № 68—сымболь сусьветнай соцыялістычнай рэволюцыі.

Протокол прэзыдыуму ЦВК БССР № 12 ад 15 ліпеня 1931 г.

Старшыня ЦВК БССР Чарвякоў.

Сакратар Гнілякевіч.

Далей ідуць ударнікі Белякоў, Лукашэвіч, Кавалёў, Дземчанка, Шэлех, Залатар, Бычкоў, Майзэль, Кучар, Міронава Ульляна і яшчэ шэраг тых, у каго патрэбна вучыцца, як змагацца, як працаваць на фронце соцыялістычнай конягадоўлі. У адказ на пастанову ЦК Усе КП(б) і СНК ССР аб разгортваньні соцыялістычнай жывёлагадоўлі ўдарнікі конзаводу ўзялі на сябе рад конкрэтных абавязацельстваў. Пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі гэтыя абавязацельствы яны выканаюць.

ЦВК БССР у адзнаку 10-гадовага існаваньня першага дзяржаўнага конзаводу надаў яму назву „імя 11-годзьдзя вызваленьня БССР ад белапалякаў". Дырэктар конзаводу тав. Іваноў і лепшы ўдарнік тав. Сафронаў узнагароджаны ордэнамі працоўнага чырвонага сьцягу. Шэраг ударнікаў конзаводу прэм'яваны.

Прудок, Конзавод.

15 жніўня 1931 г.

Л. Бэндэ

Творчыя задачы пролетарскай літаратуры[1])

На маю задачу прыпадае зрабіць даклад аб тых творчых задачах, якіязараз, на даным этапе соцыялістычнага будаўніцтва, паўсталі перад беларускай пролетарскай літаратурай. Для гэтага трэба будзе, па-першае, прагледзець у асноўным тую творчую продукцыю беларускай пролетарскай літаратуры ў яе найбольш выдатных творах, якая зараз ёсьць, а, з другога боку, у асноўным вызначыць тыя конкрэтныя творчыя задачы, якія зараз паўстаюць перад нашай беларускай пролетарскай літаратурай у час рэконструкцыйнага пэрыоду, у час разгорнутага соцыялістычнага наступу.

Пасьля першага пленуму прайшло ўжо два гады. За гэтыя два гады адбыліся агромністыя зрухі ў соцыялістычным будаўніцтве, у індустрыялізацыі нашай краіны, у колектывізацыі; нарадзіліся якасна новыя зьявы, што характарызуюць і адрозьніваюць даны этап комуністычнай рэволюцыі ад папярэдняга. За гэтыя два гады рабочая кляса дабілася новых агромністых заваёў на фронце культурнай рэволюцыі. Культурная рэволюцыя на даным этапе ўзышла на вышэйшую ступень свайго разьвіцьця, яна набыла масавы характар, яна адбываецца ў форме масавай пераробкі чалавечага матэрыялу, у прыстасаваньні гэтага чалавечага матэрыялу да тых задач, якія зараз паўстаюць перад пролетарыятам. Самае выдатнае на даным этапе культурнай рэволюцыі тое, што справа соцыялістычнага будаўніцтва стала справай мільёнаў, што будаўніцтва соцыялізму адбываецца пры актыўным удзеле ўсіх працоўных, якія ў абсолютнай большасьці ўсьвядомілі задачы, што стаяць перад намі, задачы пабудовы соцыялізму. Гэтыя заваёвы—вынік процэсу тэй вялікай пераробкі чалавечага матэрыялу, людзей, якая адбываецца ў процэсе перабудовы умоў іх існаваньня. У свой час Маркс пісаў:

„Рэволюцыя неабходна ня толькі таму, што нельга ніякім іншым способам зьвергнуць пануючую клясу, але і таму, што тая кляса, якая зьвяргае, можа ачысьціцца ад усяго бруду, старой грамады і зрабіцца здольнай стварыць новую грамаду толькі праз рэволюцыю".

Такім чынам выходзіць, што рэволюцыя патрэбна ня толькі для таго, каб зьнішчыць стары лад, але яна патрэбна і для таго, каб перарабіць людзей, каб людзі маглі ачысьціцца ад таго бруду, тае спадчыны, ад усяго таго, што вякамі, пры панаваньні эксплёататараў, напластоўвалася на іх, што зьяўлялася неадлучным ад прыгнёту, уціску і эксплёатацыі.

---

[1]) Апрацаваная стэнограма дакладу на пленуме БелАПП (май 1931 г.).

У гэтым рэволюцыйным процэсе пролетарыят, кіруючыся Ленінскай партыяй, дасягнуў агромністых посьпехаў. У процэсе актыўнай зьмены экономічных адносін, у процэсе актыўнай зьмены умоў існаваньня мільённых працоўных мас—якасна мяняецца псыхіка людзей, мяняюцца погляды, разуменьні, пачуцьці. Нараджаюцца новыя людзі, якія характарызуюць наступленьне новага пэрыоду ў сусьветнай гісторыі чалавецтва. Гэты рэволюцыйны процэс, які адбываецца нябачанымі тэмпамі і ў нябачанай шырыні і глыбіні, перамагае той традыцыйны, унасьледваны ад старой грамады „узкий горизонт буржуазного права", пра які Ленін у кніжцы „Государство и революция" пісаў, што ён прымушае работніка „высчитывать с точностью Шейлока не переработать-бы лишних полчаса против другого, не получить бы меньше платы, чем другой"... Соцыялістычнае спаборніцтва ў яго розных формах, асабліва ў вышэйшай яго ступені—ударніцтве, захапіўшы мільёны рабочых і колгасьнікаў, нашчэнт зьнішчае ўсе ўнасьледваныя ад капіталізму традыцыі, погляды, адносіны да працы, а замест іх нараджаюцца ў масавым маштабе новыя, комуністычныя.

„Самое замечательное в соревновании состоит в том, что оно производит коренной переворот во взглядах людей на труд, ибо оно превращает труд из позорного и тяжелого бремени, каким он считался раньше, в дело чести, в дело славы, в дело доблести и геройства. (І. Сталін „Політсправаздача ЦК УсеКП(б) на XVI зьезьдзе партыі", стар. 52).

Гэта тое, што па сутнасьці характарызуе даны этап культурнай рэволюцыі, гэта тое, што зьяўляецца вынікам папярэдніх гадоў агромністага упартага змаганьня рабочае клясы ня толькі за перамену ўмоў свайго існаваньня, але і за перабудову саміх сябе.

Рабочая кляса на даным этапе паднялася на такую вышыню культурнага разьвіцьця, што яна ня толькі пераймае старую культуру, ня толькі яе крытычна асвойвае, але рабочая кляса зараз ужо сама ў масавым маштабе ўтварае новую соцыялістычную культуру. Гэты процэс знаходзіць сваё прыватнае праяўленьне ў тым агромністым паходзе за тэхніку, у вынаходзтве, гэта выяўляецца далей у закліку ўдарнікаў у літаратуру і г. д. Заклік ударнікаў у літаратуру ня ёсьць організацыйны прыём для папаўненьня радоў БелАПП. Гэта выяўленьне процэсу аўладаньня, асваеньня рабочай клясай літаратуры.

А ўсё разам узятае сьведчыць аб тым, што мы шчыльна падыйшлі да конкрэтнага вырашэньня зьнішчэньня розьніцы паміж разумовай і фізычнай працай. Асваеньне рабочай клясай літаратуры—заклік рабочых ударнікаў у літаратуру іменна і ёсьць выяўленьне пачатку гэтага процэсу, процэсу зьнішчэньня розьніцы паміж разумовай і фізычнай працай, зьнішчэньня супярэчнасьці, якая зьяўляецца самай глыбокай асновай грамадзкай няроўнасьці.

А ў БССР—частцы Саюзу Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік, у краіне, працоўныя якой у сваім нядаўнім мінулым знаходзіліся пад

падвойным прэсам соцыяльнага ўціску, краіне ў мінулым са слабаю прамысловасьцю і слабым прапластаваньнем пролетарыяту (што зусім не азначала маласьць жабрацтва); краіне, жыхары якой, як кажа П. Галавач у сваім „Спалоху на загонах", да ўсіх „гутараць сваёю моваю і ім ніхто і ніколі гэтай мовай не адказваў"; краіне, працоўны чалавек якой „усе жаданьні збалелай душы сваёй, усе імкненьні свае выказаў толькі ў нязвычайна прыгожых і багатых казках і ўсе пачуцьці свае выказваў у сумных, поўных тугі і роспачы песьнях і ня ведаў вясёлых песень"; краіне, чалавек якой, „калі яго выгналі вайною з свае хаты, ішоў на далёкі ўсход і шлях свой цяжкі і бясконцы ўстаўляў крыжамі над магіламі дзяцей сваіх, каб ня зблудзіць, калі прыдзецца варочацца дадому",—вось у гэтай краіне, у людзей якой „хітрыя і моцныя зброяй політыкі сьцерлі іх уласнае імя і выхавалі ў сэрцах іх сорам для саміх сябе"—што мы маем на сёньняшні дзень? Мы маем агромністыя, нябачаныя яшчэ ніколі ў гісторыі посьпехі, заваёвы рабочае клясы і працоўнага сялянства.

На нашых вачох, пры нашым актыўным удзеле БССР, у сваім яшчэ нядаўнім мінулым рамесьніцкі, саматужніцкі „Северо-Западный край" ператвараецца ў соцыялістычную краіну буйных фабрык і заводаў, у краіну Сталінстанаў, наша напоўпатрыярхальная, напоўжабрацкая вёска, з жыхара якой цягнулі „кроў і жылы" памешчык, кулак, капіталісты і кулакі (а на недахоп эксплёататараў працоўныя Беларусі ніколі ня скардзіліся), зараз, пад кіраўніцтвам рабочае клясы і ў саюзе з ёй, пасьпяхова перарабляецца на соцыялістычны лад, ліквідуецца апошняя эксплёататарская кляса, кляса найбольш шматлікая і з найглыбейшымі карэньнямі.

Ня гледзячы на тое, што нацыянал-дэмакраты лічылі, што ў нас пролетарыяту няма, што ў нас ёсьць толькі сэльтэрскі пролетарыят, мы на справе бачым, як пролетарыят БССР зьяўляецца сапраўдным кіраўніком соцыялістычнага будаўніцтва ва ўсіх галінах, у тым ліку і культурнага будаўніцтва.

Цяпер сярод буржуазнай інтэлігенцыі, сярод нацыянал-дэмократычнай інтэлігенцыі ўжо ня чутны тыя размовы, якія мелі месца 2-3 гады назад, што яна зьяўляецца пупам зямлі, адзіным кіраўніком культурна-нацыянальнага будаўніцтва. Гэты буржуазны, нацыянал-дэмократычны пуп магутнай постацьцю рабочае клясы адрэзаны і, як кажа Мурашка, гэты „пуп закопаны".

На падставе гэтых посьпехаў рабочае клясы, посьпехаў, якія маюць сапраўды сусьветна-гістарычнае значэньне, і разгарнуўся шырокі літаратурны рух. Іменна гэтыя посьпехі абумовілі і нашы посьпехі, нашы перамогі ў галіне літаратуры.

Асноўны вынік, з якім пролетарская літаратура прышла на гэты пленум, дык гэта тое, што пролетарская літаратура набыла ідэйна кіруючую, ідэйна вядучую ролю. Гэтая кіруючая роля нашай літаратурай заваявана праз жорсткае змаганьне з клясава-варожай буржу-

азнай, кулацкай, нацдэмаўскай літаратурай, праз ідэйны ўплыў на лепшую частку папутніцтва і сялянскую літаратуру. Гэты першы і асноўны рашаючы посьпех беларускай пролетарскай культуры.

У сьвятле гэтай перамогі пролетарскай літаратуры бачны і тыя процэсы, якія адбываюцца сярод папутнікаў. Там мы наглядаем пэўныя выразныя зрухі, зрухі, якія характарызуюць сёньняшні дзень папутніцтва і якія ў значнай меры выяўляюць далейшыя яго шляхі. Перш за ўсё аб унутрыБелАППаўскім папутніцтве. Вядома, што БелАПП, як літаратурная організацыя, пры агульным яе пролетарскім напрамку, пры наяўнасьці вядучага атраду пролетарскіх пісьменьнікаў, тым ня менш не зьяўляецца адзінай організацыяй. Побач з асноўным, вядучым ядром выяўленых пролетарскіх пісьменьнікаў у БелАПП ёсьць і папутніцкае прапластаваньне і досыць значнае, не гаворачы ўжо аб сялянскіх пісьменьніках унутры БелАПП.

З аднаго боку, мы мелі сярод папутнікаў нашай організацыі за апошні час надзвычай добрае і характэрнае зьявішча—гэта рух папутнікаў па шляху ператварэньня іх у саюзьнікаў пролетарыяту ў літаратуры, рух, які творчасьць некаторых былых папутнікаў уплатную прывёў да пролетарскай літаратуры, прыкладна: Броўка, Шынклер, Зарыцкі і другія. З другога боку мы маем і такія зьявы сярод папутнікаў унутры нашай організацыі, якія сьведчаць, што частка папутніцкай моладзі яшчэ знаходзіцца пад моцным уплывам буржуазнай ідэолэгіі, што буржуазная ідэолёгія рознымі спосабамі захапляе частку папутніцкай моладзі. Я маю на ўвазе тэндэнцыі, якія выяўлены ў апошніх творах Барыса Мікуліча, Ю. Таўбіна і Астапенкі, аб чым я буду гаварыць потым.

Зрухі ўнутрыБелАППаўскага папутніцтва выяўляюць і адлюстроўваюць процэсы, якія адбываюцца сярод папутніцтва ў БССР. У радох па-за БелАППаўскім папутніцтвам процэсы, выяўленьне якіх мы наглядаем унутры БелАППу адбываюцца яшчэ больш выразна.

Частка пісьменьнікаў, якія ў час аднаўленчага пэрыоду былі папутнікамі, у пэрыод рэконструкцыі, у пэрыод нябачанага абвастрэньня клясавага змаганьня ў яе розных формах скаціліся ў сваёй творчасьці на позыцыі ашалелага кулака, буржуазнага інтэлігента, нацыянал-дэмократаў і сваёй творчасьцю дапамагалі рэстаўратарскім элемэнтам. Мы далі ім адкрыты бой, мы ў асноўным разграмілі іх у адкрытым баі. Мы паказалі працоўным масам сапраўдны твар групы пісьменьнікаў, якія нацягвалі на сябе маскі лёяльнасьці, а часамі нават і пролетарскасьці, як гэта рабіла група „Узвышша". Нашым змаганьнем мы прымусілі частку буржуазных, нацыянал-дэмократычных баянаў і лірыкаў замоўкнуць, а другую частку сур'ёзна задумацца над далейшым сваім лёсам. У выніку мы маем магчымасьць чытаць лісты і заявы, дэклярацыі аб парыве з буржуазным нацыянал-дэмократызмам, аб перабудове і г. д. Але пакуль што гэтая частка былых папутнікаў далей дэклярацый ня ідзе, ня хоча выявіць свайго творчага

твару, а выгляд учарашняга твару на сёньняшні дзень ня зусім прыемны: ён з глыбокімі рубцамі і шрамамі, памяты і пакрыўлены ад нашых удараў і, такім чынам, знаходзіцца яшчэ ў стане буржуазнай ідэолегіі. Пакуль што, акрамя дэкларацый, мы ня маем твораў, якія-б сьведчылі, што гэтыя былыя папутнікі сапраўды перабудоўваюцца, сапраўды становяцца на шлях саюзьнікаў пролетарыяту ў літаратуры. І таму мы сёньня павінны проста і адкрыта сказаць ім: нуль цана тым дэкларацыям, якія не замацоўваюцца рэальнай творчасьцю. Пролетарыят патрабуе ад былых папутнікаў, пішучых дэкларацыі, не дэкларацый, не абяцанак, а твораў, якія-б сьведчылі, што яны сапраўды парвалі з нацыянал-дэмократызмам, што яны сапраўды перабудоўваюцца для таго, каб дапамагчы будаваць соцыялізм. Так стаіць пытаньне, а ня інакш. Выбірай: або з пролетарыятам за соцыялістычнае будаўніцтва, за актыўны ўдзел у ім, і тады табе забясьпечаны рост, запал і імпэт для творчасьці, або з клясавым ворагам супроць соцыялістычнага будаўніцтва, тады крыўдзіся на самога сябе.

Але мы маем ня толькі такіх папутнікаў, мы маем папутнікаў, якія паварочваюць у бок саюзьнікаў пролетарыяту ў літаратуры, якія перамагаюць рэакцыйную буржуазную ідэолёгію, дробнабуржуазную надклясавасьць і суб'ектывізм, што асабліва праяўляецца ў так званым „псыхолёгізьме". У гэтых адносінах характэрнымі зьяўляюцца апошнія творы Кузьмы Чорнага, аднаго з буйнейшых прозаікаў, і Ц. Гартнага. Я не магу падрабязна спыняцца на іх творчасьці. Таварышы ў спрэчках выступяць і прааналізуюць кожны твор. Асноўнае, гэта тое, што Кузьма Чорны тэматычна ўжо шчыльна падыходзіць да задач, якія стаяць перад пролетарыятам, да задач соцыялістычнага будаўніцтва. Часткова ў К. Чорнага, ў апошніх яго творах: „Вясна", „Ідзі, ідзі", „Брыгадзіравы апавяданьні", вызначаецца тэндэнцыя перамаганьня яго ранейшага дробнабуржуазнага псыхолёгізму, які часта даходзіў да патолёгіі, перамаганьне дробнабуржуазнага суб'ектывізму і надклясавасьці, што характарызавала ранейшую творчасьць К. Чорнага, што надавала ёй об'ектыўна варожы характар. Шлях, на які зараз становіцца К. Чорны, зьяўляецца правільным шляхам, і наша задача ўсялякімі спосабамі дапамагчы яму як мага хутчэй вызваліцца ад рэштак буржуазнага і дробнабуржуазнага хламу, які тармозіць разьвіцьцё вялікага таленту, дапамагчы яму хутчэй ператварыцца ў сапраўднага саюзьніка пролетарыяту, бо толькі гэты шлях забясьпечыць К. Чорнаму, як і іншым папутнікам, сапраўдны творчы росквіт.

Значны зрух адбываецца зараз і ў творчасьці Ц. Гартнага. Ц. Гартны таксама апошняй сваёй творчасьцю ўваходзіць у тэматыку рэканструкцыйнага пэрыоду, ідзе на вытворчасьць і там бярэ матэрыял для сваёй творчасьці. Гэта сьведчыць, што Гартны правільна зразумеў шлях для сваёй перабудовы. Аднак, ня гледзячы на гэта, Ц. Гартны яшчэ не пазбавіўся ад уласьцівага яму дробнабуржуазнага, інтэлігенцкага падыходу да об'екту сваёй творчасьці, ён яшчэ і ў

апошнім сваім творы „Напевы сырэн“ не пазбавіўся цалкам ад дробнабуржуазнага, інтэлігенцкага спосабу ўяўленьня і вырашэньня проблемы суадносін асобы і колектыву; у яго і ў апошнім творы ўсё яшчэ „нравственный облик“ асобы часткова затушоўвае вытворчую ролю яе, не гаворачы ўжо аб тым, што схэматызм, які часам дахо-дзіць да спрашчэнства, зьяўляецца неадлучным элемэнтам апошніх твораў Гартнага. Тым ня менш зрух ёсьць, першыя крокі ў справе перабудовы зроблены. Пісьменьніку іх трэба замацаваць, пашырыць, паглыбіць, узброіцца марксысцка-ленінскім творчым мэтодам і тым самым змыць з сябе плямы „здарэньняў з комісарамі“ і па-сапраўднаму служыць справе соцыялізму.

Падобныя зрухі і процэсы адбываюцца і ў творчасьці іншых папутнікаў. Процэсы зруху, процэсы змаганьня тэндэнцый у папутніцкім коле зараз набылі значнае паскораньне і актыўнасьць. Некаторыя зрухі адбываюцца і ў творчасьці Якуба Коласа. Яго прымітыў „Колгаснае“, які па сутнасьці быў формальным адказам на пачатак шырокага масавага руху сялянства на шляху соцыялістычнай рэконструкцыі дробнай вытворчасьці, зараз зьмяняецца больш сталым творам „Адшчапенец“. Праўда „Адшчапенец“ адначасова выяўляе і тое, што Колас яшчэ ня здолеў зразумець усю глыбіню і складанасьць процэсу соцыялістычнай рэконструкцыі, што ён, наперакор сваім намерам, усё яшчэ знаходзіцца над уплывам пачуцьцяў „адшчапенцаў“, што „адшчапенец“ пацягнуў за сабой і аўтара. Тым ня менш гэтая спроба асваеньня тэматыкі рэконструкцыйнага пэрыоду, ня гледзячы на зрыў аўтара, павінна быць ацэнена, як станоўчая, і ўсялікім чынам трэба падтрымліваць імкненьне пісьменьніка пераўзброіцца, стаць пісьменьнікам вялікага часу, часу стварэньня новае соцыялістычнае грамады. У нашай рачаіснасьці ёсьць усе об'ектыўныя прадумовы для гэтага.

Больш павольна перастройваецца Янка Купала. За апошні годпаўтара наша савецкая пролетарская грамадзкасьць мела магчымасьць прачытаць толькі адзін верш Купалы „А ў Вісьле плавае тапелец“. Гэтага бязумоўна мала. Купала можа і павінен даць больш, гэтага патрабуем ня толькі мы, тут з Вамі, але гэтага патрабуюць працоўныя масы і Савецкай і Заходняй Беларусі.

Некалькі слоў аб Бядулі. З чым ён сустрэў рэконструкцыйны пэрыод? Бядуля рэконструкцыйны пэрыод сустрэў „Язэпам Крушынскім,“ а гэты твор па сутнасьці сваёй ёсьць ня што іншае, як выяўленьне капіталістычнай буржуазнай ідэолёгіі ў яе прыстасаваньні да ўмоў пролетарскай дыктатуры. Гэтай ідэолёгіяй твор „Язэп Крушынскі“ фармірованы, а не якой-небудзь другой. Твор „Язэп Крушынскі“ зьяўляецца люстрам, якое выяўляе, адлюстроўвае ідэолёгію пэўнай клясы, варожай клясы, і гэта ня гледзячы на чырвоныя латкі, якія папрышываны, праўда, белымі ніткамі, да разгорнутай сыстэмы. І, сапраўды вазьмеце вы хоць-бы вобраз самога Крушынскага. Там, дзе Бядуля паказвае Крушынскага як чалавека, як гаспадара і нават як куль-

турнага, і нават як чалавека, „ажыццяўляючага“ нацпалітыку савецкай улады, там Крушынскі абмалёўваецца ў глыбока эмоцыянальных танох, там Бядуля—мастак, а вось там, дзе трэба паказаць Крушынскага шкодным, там зусім іншы характар носіць абмалёўка і ўся сыстэма паказу, там Бядуля-мастак ператвараецца ў конструктора схэм. Крушынскі перастае быць тым чалавекам, якім яго паказаў пісьменьнік раней. Рэволюцыйная, на першы погляд, фразэолёгія пісьменьніка, авантурны жыццяпіс Крушынскага, яго антысавецкія ўчынкі—усё гэта толькі прыватныя, прышытыя моманты, каб затушаваць буржуазны зьмест гэтага твору. І зусім невыпадкова, што першая частка роману аддзелена двухгадовым тэрмінам ад пачатку друкаваньня другой, у якой Бядуля імкнецца разьвянчаць Крушынскага. Ды пры гэтым трэба сказаць, што зьяўленьне пачатку другой часткі роману абавязана нашай крытыцы, якая ў апошнія часы ўзяла як сьлед у работу Крушынскага, а гэтым прымусіла пісьменьніка пасьпяшыць з зьнішчэньнем „духа, якога ён выклікаў“.

А гэта ўсё гаворыць, што твор Бядулі „Язэп Крушынскі“, якім характарызуецца ў асноўным яго творчасьць апошніх гадоў, нічога агульнага ня мае з сапраўды папутніцкай літаратурай, што ён знаходзіцца па-за межамі папутніцкай літаратуры, не гаворачы ўжо аб пролетарскай. Апошняе слова я сказаў таму, што Бядуля належаў і належыць зараз да тэй організацыі, якая ў мэтах маскаваньня называла сябе пролетарскай. Праўда, мы заўсёды ім гаварылі, што аб людзях судзяць не па тым, што яны аб сабе думаюць і гавораць, а па тым, што яны робяць, чым яны ў сапраўднасьці зьяўляюцца. Як бачыце, мы памыляліся толькі там, дзе гаварылі, што „аб людзях судзяць не па тым, што яны аб сабе думаюць...“—большасьць узвышшанцаў нават ніколі і ня думала, што яны пролетарскія пісьменьнікі. „Пролетарскасьць“ ім патрэбна была, каб абмануць рабочых і сялян, прытупіць клясавую пільнасьць пролетарыяту, а, з другога боку—завербаваць наіўных людзей з літаратурнай моладзі і зрабіць іх пасобнікамі капіталістычнай рэстаўрацыі праз інтэрвэнцыю.

Вось, коратка гаворачы, тыя зрухі, тыя процэсы, якія зараз адбываюцца сярод папутнікаў. Я не магу зараз ахапіць усю творчасьць папутнікаў, гэта і не ўваходзіць у маю задачу, але тое, аб чым сказана, паказвае нам, што шляхі ператварэньня папутнікаў і саюзьнікаў пролетарыяту ў літаратуры, шляхі перамаганьня дробнабуржуазнай прыроды кожным папутнікам не зьяўляюцца аднолькавымі для ўсіх, што гэтыя шляхі надзвычайна рознастайныя, індывідуальныя. А гэта ў сваю чаргу паказвае, што нам трэба, побач з руйнуючым змаганьнем супроць клясава-варожых вылазак і тэндэнцый, па-сапраўднаму ўзяцца за справу кіраўніцтва папутнікамі, за справу іх перавыхаваньня, за справу іх ператварэньня ў саюзьнікаў.

Мэтоды і спосабы нашай работы з папутнікамі павінны карэнным чынам перабудавацца, праца павінна конкрэтызавацца, індывіду-

алізавацца на аснове партыйнай палітыкі і агульнай нашай літаратурна-палітычнай лініі, якая зьяўляецца ў асноўным конкрэтызацыяй партыйнай лініі. Змаганьне за папутніка, за ператварэньне яго ў саюзьніка павінна быць органічнай часткай нашай штодзённай работы.

Бясспрэчнай перамогай пролетарскай літаратуры трэба лічыць факт утварэньня аб'яднаньня колгасна-пролетарскіх пісьменьнікаў, бо ўтварэньне гэтага аб'яднаньня не зьяўляецца толькі простым арганізацыйным фактам, а мае вялікую палітычную важнасьць. Колгасная-пролетарская літаратура, якая зараз па сваёй продукцыі пакуль што не зьяўляецца шматлікай, але мы маем новыя кадры, якія абуджаны соцыялістычнай рэконструкцыяй сельскай гаспадаркі, ідуць для ўтварэньня пролетарска-колгаснай літаратуры. І таму правільна зрабіла пролетарская літаратура, выдзеліўшы ў паасобную групу наяўныя кадры колгасна-пролетарскіх пісьменьнікаў, паставіўшы перад імі задачу выяўленьня і арганізацыі новых сіл з масы колгасьнікаў. Таксама заваёвай пролетарскай літаратуры трэба лічыць стварэньне літаратурнага аб'яднаньня Чырвонай арміі і флёту (Беллачаф).

Тут ужо таварышы гаварылі, якое мае значэньне літаратура з абароннай тэматыкай на данай ступені нашага разьвіцьця. Я ня буду падрабязна на гэтым спыняцца, аднак трэба проста сказаць, што мы ў гэтай справе зрабілі ня столькі, колькі павінны былі зрабіць і колькі маглі-б. Мы мала, зусім мала зрабілі па лініі стварэньня абароннай літаратуры, па лініі выяўленьня і арганізацыі новых пісьменьніцкіх кадраў з самой Чырвонай арміі. Праўда, за паўгода існаваньня Беллачаф мы выходзім на пленум БелАПП з першым зборнікам, які, ня гледзячы на яго слабасьць, ня гледзячы на ўсю яго недастатковасьць, усё-ж ёсьць сякое-такое дасягненьне. У зборніку 15 твораў, напісаных пра змаганьне і вучобу Чырвонай арміі, з іх 7 твораў, напісаных непасрэдна чырвонаармейцамі і работнікамі РСЧА.

Робячы папярэдняе падсумаваньне бясспрэчных дасягненьняў пролетарскай літаратуры, мы можам ужо цьвёрда сказаць, што літаратурная справа зараз перастае быць справай групкі інтэлігентаў, выабражаючых, што яны „тварэньне бога", што яны пуп зямлі. Гэты пуп захопліваецца агромністым рухам рабочых і сялян, справа літаратуры становіцца справай мільёнаў, усяе рабочае клясы, ажыцьцяўляецца ленінскі наказ. Ленін яшчэ ў 1905 г. пісаў:

„Мы, социалисты, разоблачаем... лицемерие, срываем фальшивые вывески,—не для того, чтобы получить неклассовую литературу и искусство (это будет возможно лишь в социалистическом внеклассовом обществе), а для того, чтобы лицемерно-свободной, а на деле связанной с буржуазией литературе противопоставить действительно свободную, открыто связанную с пролетариатом литературу.

Это будет свободная литература, потому что не корысть и не карьера, а идея социализма и сочувствие трудящимся будут вербовать новые и новые силы в ее ряды. Это будет свободная литература

потому, что она будет служить не пресыщенной героине, не скучающим и страдающим от ожирения „верхам десяти тысяч“, а миллионам и десяткам миллионов трудящихся, которые составляют цвет страны, ее силу, ее будущность. Это будет свободная литература, оплодотворяющая последнее слово революционной мысли человеческим опытом и живой работой социалистического пролетариата, создающая постоянное взаимодействие между опытом прошлого... и опытом настоящего (настоящая борьба товарищей рабочих)“. (Ленін т. VII, ч. I, ст. 24-25). Ленін пісаў далей, што літаратура павінна стаць партыйнай, што яна ня можа быць індывідуальнай справай, незалежнай ад агульнай пролетарскай справы.

„Литература должна стать партийной. В противовес буржуазным нравам, в противовес буржуазной предпринимательской, торгашеской печати, в противовес буржуазному литературному карьеризму и индивидуализму, барскому анархизму и погоне за наживой—социалистический пролетариат должен выдвинуть принцип партийной литературы, развить этот принцип и провести его в жизнь в возможно более полной и цельной форме.

В чем же состоит этот принцип партийной литературы? Не только в том, что для социалистического пролетариата литературное дело не может быть орудием наживы лиц или групп, оно не может быть вообще индивидуальным делом, независимым от общего пролетарского дела. Долой литераторов беспартийных! Долой литераторов сверх-человеков! Литературное дело должно стать частью общепролетарского дела, „колесиком и винтиком“ одного единого великого социал-демократического механизма, приводимого в движение всем сознательным авангардом всего рабочего класса“ (Ленин, т. VII, ч. I, ст. 21—22).

І далей Ленін гаварыў, што „Мы хотим создать и мы создадим свободную печать не только в полицейском смысле, но и в смысле свободы от капитала, свободы от карьеризма, мало того: также и в смысле свободы от буржуазно-анархического индивидуализма“. Развіццё пролетарскай літаратуры зьнішчае беспаваротна „всякую почву у старинного полуобломовского, полуторгашеского российского принципа: писатель пописывает, читатель почитывает“ (Ленін), што мела і яшчэ да гэтага часу мае месца і ў нас у Беларусі, у беларускай літаратуры.

Пролетарская літаратура становіцца сапраўднай зброяй пролетарыяту ў яго магутным змаганьні за соцыялістычную рэконструкцыю ўсіх асноў і ўсіх надбудоў грамадзкага жыцьця. Пролетарская літаратура становіцца магутным сродкам організацыі сьвядомасьці, волі і пачуцьцяў працоўных мас вакол конкрэтных задач соцыялістычнага будаўніцтва, у іх змаганьні супроць сваіх клясавых ворагаў.

Творчы рост пролетарскай літаратуры за два гады пасьля першага пленуму БелАПП характарызуецца творамі П. Галавача—

„Даляры“, „Вінаваты“, „Спалох на загонах“, „Сьвежы вецер“; М. Лынькова– „Апошні зьверыядавец“; А. Александровіча—поэмамі „Цені на сонцы“, „Поэма імя вызваленьня“, „Нараджэньне чалавека“ (нанова пераапрацаваны) і радам вершаў; Р. Кобеца—„Гута“; Р. Мурашкі—„Сын“; М. Чарота – рад вершаў; Бязьмежнага—„Говар машын“; П Броўкі „Каландры“, „Цэхавыя будні“, „Гады як шторм“, радам твораў Шынклера і інш. пісьменьнікаў, творы якіх раскіданы па часопісях і газэтах, якія ў частцы сваёй уваходзяць у фонд пролетарскай літаратуры. Пролетарская літаратура зараз складаецца ня толькі з твораў пролетарскіх „з імёнамі“, а і з раду твораў пісьменьнікаў, якія пакуль што ня могуць цалкам быць аднесены да пролетарскіх пісьменьнікаў. Таксама ня трэба думаць, што пролетарскі пісьменьнік „з імем“, што ні напіша—усё ёсьць пролетарскае. Факты паказваюць, што не заўсёды так. Вазьмеце для прыкладу „Званкі“ Р. Мурашкі, альбо творы Ліманоўскага, які таксама лічыцца і многія яго лічаць пролетарскім пісьменьнікам.

Прааналізаваўшы ўсю гэтую творчасьць, мы пабачым ня толькі колькасны рост, хоць ён за гэтыя два гады відавочна недастатковы, але мы маем і якасны рост, які сьведчыць аб тым, што беларуская пролетарская літаратура ўзышла на вышэйшую ступень свайго разьвіцьця, што пачатковыя крокі, якія былі зроблены да першага плянуму, ужо пяройдзены, і што мы пасунуліся значна ўперад.

У чым выяўляецца якасны рост нашай літаратуры? Перш за ўсё ён выяўляецца ў перамаганьні праз змаганьне нацыяналістычных уплываў на творчасьць нашых пісьменьнікаў, якія няўхільна павінна была паспытаць на сабе рэволюцыйная пролетарская літаратура Беларусі на першых ступенях свайго разьвіцьця. Некаторы ўплыў старых літаратурных нацыяналістычных традыцый на рэволюцыйную, пролетарскую беларускую літаратуру ішоў перш за ўсё па лініі творчага мэтоду. У чым-жа асноўнае гэтага нацыяналістычнага ўплыву? Асноўнае, што характарызуе старыя літаратурныя нацыяналістычныя традыцыі,—гэта ідэолёгічны сьветапогляд, сьветаўспрыйманьне, а адсюль і другая рыса, якая органічна вынікае з першага: звышчалавечы падыход да рачаіснасьці. Суб‘ект—пісьменьнік разглядаецца не як частка клясы, клясы, якая вядзе змаганьне з другой клясай, а як нейкая надклясавая „сверхчувствующая“ сутнасьць. „Звышчалавечы“ падыход да рачаіснасьці, надклясавасьць прыводзіць няўхільна да затушоўваньня клясавага змаганьня, да „тэорыі самабытнасьці“, а адсюль у мастацкай практыцы „обоготворение“ „маці-бацькаўшчыны сьвятой Беларусі“, ідэалізацыя яе з усімі яе атрыбутамі, на ўсіх папярэдніх гістарычных этапах.

Наступнай рысай, якая характарызуе творчы мэтод нацыяналістычнай літаратуры,—гэта наданьне прымату падсьвядомага, інтуіцыйнага над розумам, сьвядомым. А адсюль органічна-вынікае замкнёнасьць унутры асобы, сэнтымэнталізм, сузіральнасьць і пасывізм.

Вось тыя асноўныя моманты, якія характарызуюць старыя нацыяналістычныя літаратурныя традыцыі, пад уплывам якіх значны час знаходзілася група Белаппаўскіх пісьменьнікаў.

Я ня буду тут зараз спыняцца на конкрэтных творах пісьменьнікаў, якія выяўляюць гэты ўплыў. Возьмем хоць-бы М. Хведаровіча. У свой час ён так моцна ўліп у нацыяналістычную ідэолёгію, што нават працоўных Заходняй Беларусі заклікаў вызваляцца ад паноў не пад сьцягам Леніна, а пад сьцягам Кастуся Каліноўскага.

Праўда, у апошні час Хведаровіч пашоў па шляху перамаганьня сваіх нацыяналістычных зрываў. Але Хведаровіч пашоў не па шляху асваеньня марксысцка-ленінскага творчага мэтоду, а па лініі захапленьня і культываваньня конструктывізму. Ён, як гавораць, аднэй нагой вылез з нацыяналістычнага балота, а другой нагой трапіў у дробнабуржуазнае балота конструктывізму.

Альбо возьмем творчы шлях Андрэя Александровіча. Мне здаецца, што крытык, які піша ў „Зьвязьдзе", што ўся творчасьць Александровіча накірована супроць нацыянал-дэмократызму, ня праў. Гаварыць і пісаць так,—значыць, першае, гаварыць і пісаць няпраўду, а другое, рабіць дрэнную паслуту самому пісьменьніку і ўсёй пралетарскай літаратуры. Творчы шлях Андрэя Александровіча ішоў праз выплату даніны нацыяналізму на працягу значнага часу. Я ня буду прыводзіць конкрэтных твораў і дакумантаў, спашлюся толькі на твор „Паўстанцы". Там вы знойдзеце і ўбачыце, што мы правы, а ня крытык са „Зьвязды" т. Лявонны.

Да чаго-б прышла наша літаратура, каб яе разьвіцьцё пашло па лініі нацыяналістычных традыцый, куды-б гэта прывяло нашу літаратуру? Гэта прывяло-б нашу літаратуру да адрыву ад задач рабочае клясы, да супроцьпастаўленьня яе гістарычнаму процэсу, які адбываецца ў форме будаўніцтва соцыялізму.

Пролетарская літаратура, пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, у асноўным перамагла гэтыя ўплывы, вызвалілася ад іх, забясьпечыла самастойны шлях свайго разьвіцьця. І гэта ёсьць першае рашучае творчае дасягненьне беларускай пролетарскай літаратуры.

Якасны рост, творчыя дасягненьні сказваюцца яшчэ і ў частковым аўладаньні нашымі пісьменьнікамі тэматыкай рэконструкцыйнага пэрыоду, у наданьні творчасьці пролетарскіх пісьменьнікаў актуальнага характару.

У коле тэматыкі пролетарскай літаратуры мы маем ужо такія тэмы, як соцыялістычнае будаўніцтва ў горадзе і вёсцы на даным этапе, з належнай, у значнай меры, для гэтых тэм глыбінёю мастацкага паказу. Далей, проблема ўплыву дробнабуржуазнай стыхіі на рабочую клясу, стыхіі, якая зьяўляецца крыніцай усялякіх ухілаў, як правага, так і левага. Абодвы яны маюць аднолькавыя карэньні. Задача нашых пролетарскіх пісьменьнікаў—усямерна выкрыць сваімі мастацкімі сродкамі гэтыя карэньні. Задача ня толькі паказаць кому-

ніста-ўхіліста, опортуніста, але трэба ўмець паказаць і карэньні гэтых ухілаў. паказаць, адкуль яны ідуць, з якога асяродзьдзя, і гэтым самым дапамагчы нашай партыі ў яе змаганьні за генэральную лінію, за чыстату радоў партыі.

Тут некаторыя таварышы выступалі і досыць тэмпэрамэнтна даказвалі, што наша беларуская пролетарская літаратура ня мае твораў, якімі можна пахваліцца. Мне здаецца, а гэта так і ёсьць, што гэтыя таварышы памыляюцца. Мы маем к сёньняшняму пленуму рад твораў, якія адлюстроўваюць процэсы соцыялістычнай рэконструкцыі і ня толькі ў выглядзе фотографіі, а як сапраўдныя мастацкія творы. Мы маем творы, дзе ясна разьвязваецца проблема выкрыцьця шкоднікаў, мы маем творы, якія малююць нам новага чалавека, мы маем творы, якія мастацкі рэпродукцыруюць рэволюцыю 1905 году, маем творы з тэматыкай грамадзянскай вайны і г. д.

Вось прыблізна той комплекс тэм, якія характарызуюць работу беларускай пролетарскай літаратуры, што гэтыя тэмы не актуальны для пролетарскай літаратуры?

У нас яшчэ часта зьмешваюць тэматыку з матэрыялам, лічаць, што актуальным зьяўляецца тое, што напісана на матэрыяле сёньняшняга дню. Часта чутны галасы і нават з гэтай трыбуны, што „нам патрэбна літаратура, якая-б адлюстроўвала ня мінулае, а будучае, штурхала ўперад", а таму лічаць, што толькі тая літаратура будзе штурхаць наперад, якая створана на матэрыяле сёньняшняга дню, ці якая зьяўляецца сваяасаблівай утопіяй. Мне здаецца, што такая пастаноўка пытаньня няправільная. Злабаднеўнасьць тэматыкі некаторыя падменьваюць матэрыялам. Я-б мог прывесьці дастатковую колькасьць прыкладаў, дзе нашымі пісьменьнікамі „ужываецца" гэтая „злабаднеўная" тэматыка, але гэтыя творы ўсё-ж такі не зьяўляюцца актуальнымі. Узяць хоць-бы ўсе 7 зборнікаў таго-ж Юркі Лявоннага. Ня гледзячы на тое, што яны напісаны, як гавораць, на злобу дню, яны нічога агульнага, блізкага з актуальнасьцю ня маюць. Я-б мог назваць яшчэ цэлы рад іншых твораў, якія гавораць аб электрычнасьці, аб колгасах і аб саўгасах, якія гавораць, што мы ўжо цалкам знаходзімся ў соцыялізьме, і ўсё-ж такі гэтыя творы не зьяўляюцца актуальнымі для пролетарскай літаратуры, а, наадварот, шкоднымі для савецкай літаратуры. Тыя таварышы, якія блытаюць тэматыку з матэрыялам, дапусьцілі памылку накшталт памылкі, якую дапусьціў вядомы Барыс Кушнераў, аб якой т. Авэрбах пісаў у „Праўдзе": „материал произведения здесь отождествляется с его тематикой, игнорируется идейный уровень, потому что вообще отсутвует понимание и способность разбираться в актуальности идеи произведения, забывают вопрос о художественном качестве, как будто мера политического действия произведения совершенно не связана со степенью его художественности" („Правда" от 8/V—1931 г.).

Ня гледзячы па памылковасьць такой установкі, некаторыя таварышы ўсё-ж такі ставяць так пытаньне, што толькі той літаратурны твор зьяўляецца актуальным, які напісан на тэму сёньняшняга дню, а калі ўзяць, напрыклад, твор „Сын“ Рыгора Мурашкі, дык ён, па іхняму, зьяўляецца не актуальным, таму што ён малюе рэволюцыю 1905 г. на Беларусі, раскрывае мастацкі змаганьне партый і кляс ва ўмовах Беларусі, краіне эканомічна адсталай, краіне са складаным нацыянальным пераплётам і г. д.

Альбо вазьмеце тэматыку грамадзянскай вайны. Ці не зьяўляецца яна зараз жыватрапечучай тэматыкай? Мастацкі паказаць, як рабочыя і сяляне змагаліся супроць капіталістаў, супроць памешчыкаў і кулакоў, паказаць, што было ў аснове іх паражэньня і перамог, якія былі памылкі і моцныя бакі, шго забясьпечыла іх перамогу над клясавымі ворагамі—ці-ж гэта не зьяўляецца актуальным? Праўда, нічога агульнага з актуальным ня мае опортуністычны паказ бездапаможнага інтэлігента, які ў стромкім руху рэволюцыйных здарэньняў хвалюецца проблемай „асабістага і рэволюцыйнага доўгу“, які адшукоўвае скарб каханьня. Такі паказ ня толькі няздольны дапамагчы нам у сёньняшнім нашым змаганьні, але ён і ўчарашняе наша рэволюцыйнае скажае. А далей,—паказаць радаслоўную беларускага контррэволюцыйнага нацыянал-дэмократызму, ці гэта ўсё разам не зьяўляецца актуальным, нават у сэнсе перадачы вопыту для рабочае клясы іншых краін, нават у сэнсе выхаваньня нашага падрастаючага пакаленьня, не гаворачы ўжо пра „эмоцыянальны“ бок гэтага факту.

Справа ня ў тым, які матэрыял бярэ мастак, пісьменьнік (хоць і гэта важна; выбар матэрыялу вызначаецца творчым мэтодам, сьветапоглядам, ідэйным узроўнем пісьменьніка), а як ён матэрыялізуе ў сваім творы ідэю, з якога пункту гледжаньня, наколькі ідэйны ўзровень твору адпавядае ідэйнаму ўзроўню пролетарыяту і яго задачам. У гэтым галоўнае. Няма такіх тэм, няма такіх проблем, якія-б не зьяўляліся тэмамі пролетарскай літаратуры. Гэта трэба запомніць усім тым, хто выступае і гаворыць аб тэматыцы і яе актуальнасьці.

Той, хто гаворыць, што пролетарская літаратура не павінна займацца проблемамі мінулага, той дрэнную паслугу робіць пролетарскай літаратуры; кіравацца гэтым рэцэптам—значыць аддаць наша мінулае на расьцярзаньне буржуазнай сволачы, а мы добра ведаем, што ў нацдэмаў мінулае было ня чым іншым, як практычнай програмай будучага, але прыкрытай архаічнай мішурой мінулага, якая на першы погляд, як быццам, адрывае ад сучаснага творы буржуазнага нацыяналізму. А ўсё гэта разам узятае зьяўлялася зброяй нацдэмаў у іх змаганьні супроць соцыялістычнага будаўніцтва. Навошта, не пачынаючы бою, аддаваць ворагу зброю, якой мы яго павінны паразіць? І іменна, тыя таварышы, якія гавораць нам, што пролетарская літаратура не павінна займацца мінулым, яны аддаюць наша мінулае на зьядзеньне буржуазнай сволачы.

Тым ня менш, калі мы гаворым, што мы не адмаўляемся ад тэматыкі нашага рэволюцыйнага мінулага, якая на першы погляд ня ўкладваецца ў рамкі сёньняшняга дню, мы павінны са ўсёй сілай тут, на пленуме, падкрэсьліць, што тэматыка, тэмы, матэрыял эпохі соцыялістычнай рэконструкцыі павінны быць у цэнтры творчай увагі нашых пісьменьнікаў.

Іменна па гэтай лініі мы можам констатаваць нашы посьпехі, але па гэтай-жа лініі знаходзяцца і нашы вузкія месцы, наша адставаньне.

Наш рост далей выяўляецца ў тым, што пролетарская літаратура пачала выцясьняць буржуазны халтурны хлам з нашых тэатраў. Тут ужо гаварылі аб п'есе тав. Кобеца „Гута". Гэты твор ня толькі ўзьняў на вышэйшую ступень Першы Беларускі тэатр, але давёў, што пролетарыят здольны тварыць сваё нацыянальнае мастацтва. Праўда, у нас часамі чуюцца такія размовы, што гэты твор Кобеца не зьяўляецца беларускім творам, таму што Кобец пісаў свой твор напоўрасійскай, напоўбеларускай моваю, бо ён не ўладаў цалкам беларускай мовай у час напісаньня гэтага твору. Гэта няправільна. Таварышы, якія сьцьвярджаюць, што твор Кобеца не зьяўляецца творам беларускай пролетарскай літаратуры і беларускай пролетарскай драматургіі, выходзяць з няправільнага разуменьня нацыянальнай формы. Яны ўсю нацыянальную форму, падобна Ваганьяну, зводзяць толькі да мовы, ня ўлічваючы ўсяго комплексу ідэй, пачуцьцяў, вобразаў, характарызуючых мотываў і г. д., якія ў еднасьці даюць „Гуту", робяць яе творам беларускай пролетарскай літаратуры і драматургіі. Твор „Гута" зьявіўся першым найбольш выдатным, найбольш цэльным, найбольш праўдзівым творам аб пролетарыяце БССР,—пролетарыяце, які ў складаных прымежных умовах, ва ўмовах складанейшага нацыянальнага і клясавага пераплёту, ва ўмовах складанейшых форм клясавага змаганьня будуе соцыялізм, замацоўвае форпост Савецкага саюзу. Творам „Гута" пролетарская беларуская літаратура і драматургія нанеслі першы і сур'ёзны, калі не сказаць сьмяртэльны, удар па буржуазнай, нацыянал-дэмократычнай драматургіі, а таксама па рознай абывацельскай, мяшчанскай „сцэнічнай" халтуры. Той, хто адмаўляе „Гуце" ў праве быць творам беларускай пролетарскай літаратуры, той об'ектыўна гаворыць вуснамі нацыянал-дэмократаў, якія ўбачылі ў „Гуце" сур'ёзную небясьпеку і ўжывалі і ўжываюць розныя спосабы для компромэтацыі яе. І найбольш „ходкім таварам" у іх зараз зьяўляецца „утка", што твор Кобеца не беларускі таму, бачыце, што Кобец рабочы-качагар скончыў пачатковую школу яшчэ ў старыя часы на расійскай мове, і што ў час напісаньня свайго твору ён яшчэ ня цалкам аўладаў беларускай літаратурнай мовай.

„Гута" Кобеца ёсьць ня толькі ўдалы літаратурны, драматычны твор, „Гута" ёсьць вялізарнай важнасьці політычны докумэнт, докумэнт, які сьведчыць аб якасна новым этапе разьвіцьця пролетарскай

літаратуры, які сьведчыць аб пачатку масавага процэсу выяўленьня творча-мастацкіх сіл з нетраў вытворчасьці, процэсу аўладаньня рабочай клясай літаратурай, аб пачатку таго масавага процэсу, які зараз разгортваецца ў выглядзе закліку рабочых ударнікаў у літаратуру.

Усяго гэтага нельга сказаць пра твор Гурскага „Качагары", аб якім тут ужо гаварылі. Мне здаецца, што гэты твор ня ўзьняў нашу беларускую пролетарскую драматургію на вышэйшую ступень, што гэты твор, у параўнаньні з „Гутай", зьяўляецца крокам назад.

У чым асноўныя зрывы аўтара і тэатру?

На сцэне тэатру ў п'есе „Качагары" адсутнічае рабочая кляса, жывы, сапраўдны рабочы колектыў. На сцэне, у ходзе ўсёй п'есы няма тае клясы, якая кіруе соцыялістычным будаўніцтвам, якая перабудоўвае ўсю народную гаспадарку, якая праз жорсткае змаганьне перамагае сваіх клясавых ворагаў. Замест жывой рабочай клясы, замест жывых яе гэрояў-энтузыястаў мы бачым манэкены, якія, як на спрунжынах, рухаюцца на сцэне. Роля рабочае клясы ў клясавым змаганьні, наперакор намерам аўтара, не паказана. Гэта першы і асноўны недахоп, зрыў аўтара і тэатру, недахоп, які кладзе адпячатак на ўвесь ход п'есы.

З першага недахопу органічна вынікае і другі. Партыйная арганізацыя як заводу, так і раёну дзе адбываюцца здарэньні, не паказана, кіруючая роля партыі затушавана. Партыя, парторганізацыя ўвасоблена ў сэкратару райкому, які, наперакор намерам аўтара, вышаў закончаным опортуністам. Аднак ход п'есы ня толькі не разьвенчвае опортуніста, а, наадварот, гэты опортуніст, дзякуючы нейкім таемным сілам, перараджаецца (у момант) і становіцца на чале рабочых мас, носьбітам і пропагандыстам ідэй ленінізму. Гэта другі зрыў, другі недахоп, які, аднак, нясе пэўную шкоднасьць. Мы ведаем, што ня ўсякі член партыі, папаўшы ў балота опортунізму, гэтым самым беспаваротна страчаны для партыі, мы ведаем, што паасобных опортуністаў партыя перавыхоўвае. Але опортунізм, а ў „Качагарах" опортуніст ёсьць вобраз опортунізму, як соцыяльнай зьявы, вось гэты опортунізм ня мае права на апраўданьне, на перараджэньне ў ідэолёгію пролетарыяту, ён павінен быць разгромлены, а мастаком-пісьменьнікам павінен быць разьвенчаны. У „Качагарах" ня ў прыклад „Гуце" гэтага мы ня бачым.

Трэці асноўны недахоп—дык гэта па часьці нацыянальнай формы. Аўтар пастаноўшчык, кіраўніцтва тэатру ў змаганьні з богэмай, з нацыянал-дэмократызмам не заўважылі таго, што аддалі на зьядзеньне нацыянал-дэмократызму нацыянальную беларускую форму. Яны не зразумелі таго, што новы зьмест таксама ня можа ня мець нацыянальнай формы. Далей: з якога гэта часу беларуская вопратка, беларуская песьня, скокі сталі дастаяньнем нацыянал-дэмократызму? А між тым па п'есе так. Адкуль гэта тэатр узяў, што „косоворотка"

зьяўляецца адзнакай пролетарызацыі, а беларуская вышываная кашуля—формаю варожых кляс? А па п'есе выходзіць так.

Праўда, мы чулі пярэчаньні (якія, да слова кажучы, не выратоўваюць кіраўнікоў пастаноўкі), што сяляне ў „Качагарах" апрануты ў беларускую вопратку. Добра. Значыць, па-вашаму, таварышы-пастаноўшчыкі, выходзіць, што толькі сялянства зьяўляецца носьбітам нацыянальнасьці, што толькі нацыянальная форма ўласьціва тэй культуры, якой жыве сялянства? Выходзіць так. А паколькі культура, якой жыве пакуль што селянін, не зьяўляецца яшчэ пролетарскай, соцыялістычнай, бо сялянства толькі далучыцца зараз да соцыялістычнай культуры, то выходзіць, што соцыялістычная культура беларускага пролетарыяту ня мае свае беларускай формы.

Але, каб да канца ацаніць эфэктыўнасьць змаганьня тэатру з нацыянал-дэмократызмам, па гэтай лініі, успомнім, што гаварылі нацыянал-дэмократы аб носьбітах беларускасьці. Яны, як усім вядома, гаварылі, што толькі сяляне зьяўляюцца сапраўднымі беларусамі, што рабочых беларусаў няма, што беларускія рабочыя толькі сваім паходжаньнем беларусы і г. д. Каму патрэбна, каб наш тэатр падтрымліваў гэту рэакцыйную бяссэнсіцу.

Можна было-б праілюстраваць вам некалькі ўзораў тае дзікай „дыялектыкі", якую пробуе „ўжываць" пастаноўшчык. Так, напрыклад, п'яны карагод навакол цэбра выяўляе ідэю руху, а тое, што Іваноўскі ходзіць толькі ўніз, а ня ўверх—ідэю ўпадку клясы, прадстаўніком якой зьяўляецца Іваноўскі і г. д. і г. д.

Проблемы, якія паставіў перад сабою Г. Гурскі, зьяўляюцца надзвычайна актуальнымі для беларускай драматургіі, але т. Гурскі пацярпеў на гэтым паражэньне, а пастаноўшчык тэатру яшчэ больш усіліў эфэкт паражэньня. П'еса „Качагары" патрабуе карэннай перабудовы, выпраўленьня вялікіх палітычных і мастацкіх памылак, у тым ліку і памылак пастаноўкі. П'еса можа быць выпраўлена і павінна быць выпраўлена.

Ня гледзячы на зрывы і недахопы ў драматургічных творах пролетарскай літаратуры, зрух усё-ж зроблены. Зроблены першыя крокі па шляху стварэньня рэпэртуару, адпаведнага задачам рэконструкцыйнага пэрыоду. Але трэба з усёй рашучасьцю сказаць, што ў гэтай справе мы зрабілі куды менш, чымся маглі зрабіць пры хаценьні, пры належным кіраўніцтве, пры мобілізацыі ўвагі пісьменьнікаў навакол тэатру. Гэтага апошняга фактару, кіраўніцтва, ў нас па сутнасьці ня было.

Горш, нікуды ня варта стаіць справа ў кіно. Чым можа пахваліцца пленум перад рабочай клясай і працоўным сялянствам у гэтай галіне? Пакуль што нічым. На сёньняшні дзень мы ня маем яшчэ ніводнага твору беларускай пролетарскай літаратуры ў выглядзе сцэнарыя для кіно. Кіно—самае вузкае месца. Мне здаецца, што трэба нашым пісьменьнікам мобілізавацца і ўзяцца за напісаньне сцэнарыя Недаацэнка работы кіно зьяўляецца горшым відам опортунізму.

Пролетарская літаратура зрабіла агромністыя посьпехі па шляху аўладаньня дыялектычна-матэрыялістычным творчым мэтодам.

Пролетарская літаратура на сёньняшні дзень дасягнула такой ступені станаўленьня творчага дыялектычна-матэрыялістычнага мэтоду, калі асноўныя моманты матэрыялістычнай дыялектыкі ў часткі пісьменьнікаў сталі, а ў другой часткі становяцца асновай творчай практыкі. Праўда, як мы пабачым на разглядзе творчасьці пісьменьнікаў, на гэтым шляху нам яшчэ трэба шмат працаваць, яшчэ шмат вучыцца і ўпарта вучыцца. Але вучыцца ня так, як гэта некаторыя разумеюць: засесьці за Гегеля, засесьці за Маркса, засесьці за іншых клясыкаў, завесіцца фіранкамі з брэзэнту, каб сапраўднасьць не прасякала ў яго габінэт. Ня так вучыцца, а вучыцца на жывой сувязі тэорыі з практыкай, узаемнай і актыўнай сувязі з соцыялістычным будаўніцтвам. Толькі на падставе гэтага нашы пісьменьнікі сапраўды змогуць аўладаць дыялектыка-матэрыялістычным, марксыцка-ленінскім творчым мэтодам.

Да гэтага часу БелАПП ня мела свае творчай пляцформы. Дыскусія па творчых пытаньнях толькі пачнецца з пленуму. Да гэтага часу па розных прычынах мы яшчэ яе не разгарнулі як сьлед.

Праўда, былі спробы распачаць яе, але гэтыя спробы капіравалі горшыя бакі, адмоўныя бакі творчай дыскусіі ў РАПП,—гэта голае, схолястычнае практыкаваньне ў катэгорыях, адарванае ад штодзённага літаратурнага руху, ад творчай практыкі пролетарскіх пісьменьнікаў, Але апрача гэтых бескарысных спроб, былі спробы выкарыстаць творчую дыскусію для адкрытай пропаганды буржуазнай тэорыі і „рэцэптаў". Я маю на ўвазе выступленьне вядомай палітычнай Mädchen fur alle Функа-Гародні, выступленьне, якому мы далі жорсткі адпор.

Мы ня зьбіраемся вынаходзіць які-небудзь асаблівы свой уласны беларускі „самабытны" творчы мэтод. Дыялектыка-матэрыялістычны творчы мэтод зьяўляецца адзіным мэтодам як для расійскай, украінскай, чуваскай, татарскай і г. д., так і для беларускай літаратуры. Праўда, кожная, у тым ліку і наша, літаратура мае сваю спэцыфічнасьць, кожная літаратура будзе дапасоўваць гэты мэтод да сваіх спэцыфічных умоў. Кожнаму нашаму пісьменьніку трэба гэтым мэтодам аўладаць добра, і тады наша пролетарская літаратура на падставе гэтага будзе мець яшчэ большыя посьпехі, большыя заваёвы.

Вам кожнаму вядома, што мастацтва і літаратура маюць сваім об'ектам об'ектыўную рачаіснасьць, яе законамернасьць, процэсы, зьявішчы і г. д. Вы ведаеце, што няма такога зьявішча, такіх процэсаў, законамернасьцяй, якія-б не зьяўляліся об'ектам літаратуры. Значыць, літаратуру адрозьнівае ад іншых відаў ідэолёгіі, хоць-б ад навукі, нешта іншае, а не об'ект, не прадмет. Гэта іншае і складае спэцыфікум літаратуры, утварае новую форму ідэолёгіі. „Разве есть

область, составляющая исключительную собственность поэзии? Ведь ее содержание то же, что содержание философии"—пісаў у свой час Пляханаў (гл. т. XVIII, ст. 225).

Значыцца розніца паміж навукай і літаратурай ня там, дзе яе часамі шукаюць буржуазныя эстэты і іх эпігоны, ня ў розьніцы зьместу, ня ў розьніцы об'екту, а, мабыць, у форме выяўленьня зьместу, у форме яго выражэньня, у форме пазнаньня об'екту. Для нас, для пролетарскай літаратуры, мастацтва, а значыць, і літаратура зьяўляюцца асобнай, спэцыфічнай формай пазнаньня об'ектыўнай рачаіснасьці, яе законамернасьцяй, яе процэсаў руху і г. д., вобразнай формай, мысленьнем вобразамі. Вобраз у мастацтве, у літаратуры ёсьць той сродак, праз які выяўляецца, пазнаецца, адлюстроўваецца рачаіснасьць у яе частках, у яе зьявах, у яе сутнасьці. Спэцыфіка літаратуры—у вобразе.

Вучоны пазнае рачаіснасьць, яе законамернасьці, об'ектывуе вынікі свайго пазнаньня праз лёгічныя катэгорыі, сылёгізмы; пісьменьнік-мастак гэтае робіць праз вобраз, захоўваючы ў самой рачаіснасьці, у свайго об'екту „чувственную, наглядную форму".

„Искусство имеет своею целью представить идею под чувственною формою"—гаварыў стары Гегель, і гэта зьяўляецца глыбокай праўдай. Мастак, калі ён сапраўды мастак, а не мастак па сьпісе, а такіх у нас шмат,—складаную рачаіснасьць у яе зьявах, усю сукупнасьць свайго об'екту выяўляе, паказвае праз „чувственную" форму, праз вобраз. Я дазволю сабе спаслацца на невялікую мясьціну з твору Платона Галавача „Спалох на загонах", на мясьціну, дзе ён гаворыць пра бежанства.

„Чалавек, які, калі яго выгналі вайною з свае хаты, ішоў на далёкі ўсход і шлях свой цяжкі і бясконцы ўстаўляў крыжамі над магіламі дзяцей сваіх, каб ня зблудзіць, калі прыдзецца варочацца да дому..." Што тут асаблівага? А тое, што тут „крыжы над магіламі дзяцей сваіх" наглядна, „чувственно" выяўляюць, хвалюючa паказваюць хвалюючую трагедыю мільёнаў працоўных, якіх выгналі вайною, што гэты вобраз раскрывае перад вамі наглядна, „чувственно" той сапраўды „цяжкі і бясконцы" шлях, па якім па „літасьці" цароў, капіталістаў і памешчыкаў ішлі мільёны працоўных.

Тут, як бачыце, для таго, каб стварыць вобраз трагічнага шляху мільёнаў працоўных, пісьменьніку непатрэбна была статыстыка сьмяротнасьці, хворасьці не патрабавалася пісаць, па колькі дзён гэтыя „выгнаныя людзі" ня елі, ня пілі і г. д. Ён удалым вобразам выкрыў усю глыбіню, усю трагічнасьць бежанства. Я ўзяў тут прыватны момант твору, асобны вобраз, які зьяўляецца органічнай часткай твору, вобраз процэсу, процэсу, які выяўляецца ў творы.

Мастак праз вобраз, праз наглядную, „чувственную" форму ўскрывае і выяўляе супярэчнасьці об'ектыўнай рэальнасьці, змаганьне гэтых супярэчнасьцяй, пераход аднае супярэчнасьці ў другую праз зьняцьце, праз перамогу вядучай тэндэнцыі. Мастак праз вобраз,

улаўлівае і выяўляе рух і апасродкаваньне об'ектыўнага процэсу. А праз усё гэта ён і стварае вобраз процэсу ў яго многаабразьзі і адзінстве.

„Явления искусства не только не суть простая видимость, но по сравнению с обыденной действительностью им следует приписать более высокую реальность и более истинное бытие"—гаворыць Гегель аб зьявах мастацтва. Калі мы будзем чытаць гэтую формулу паматэрыялістычнаму, калі адкінем адсюль ідэалістычнае разуменьне „более высокой реальности и более истинного бытия", дык мы атрымаем формулу, якая вызначае розьніцу паміж сапраўдным мастацтвам і апісацельствам, портрэтнасьцю.

Звычайнае, абыдзенае наша ўяўленьне аб рачаіснасьці ёсьць звычайна павярхоўнае ўяўленьне. Тое ўяўленьне, якое мы атрымліваем ад нашых непасрэдных уражаньняў яшчэ не зьяўляецца сапраўдным пазнаньнем рачаіснасьці ў яе сутнасьці. Пазнаць, выразіць, адлюстраваць рачаіснасьць—гэта значыць разгарнуць і выявіць усю яе сукупнасьць, улавіць законамернасьці яе руху, пераходы апасродкаваньні і г. д., інакш кажучы, пазнаць і выявіць рачаіснасьць ва ўсёй яе „богатой целостности с многочисленными определениями и отношениями" (Маркс), пазнаць і выявіць яе, як адзінства многаабразія, „сведенную к единству множества определений" (Маркс). Гэта значыць прадстаўленую ў вобразным уяўленьні. Пазнаньне дыялектычнай рачаіснасьці магчыма толькі праз разгортваньне усёй сукупнасьці.

„Развертывание всей совокупности действительности—сущность диалектического познания" (Ленин, сборник IX, ст. 159).

Мастак дыялектык-матэрыяліст пазнае і разгортвае законамернасьці процэсаў, формы процэсаў, асобныя і агульныя зьявы, інакш кажучы, усю сукупнасьць рачаіснасьці не як фотограф, які бярэ асобную зьяву ў яе статыцы і „запечатлявае" на плёнцы сваіх пачуцьцяў тое, што выбрала яго вока, альбо, як павярхоўны апісальнік, фіксуе, зноў-такі ў статычным стане, дробязі зьяў, і які ўсё-ж ня можа прасякнуць усёй глыбіні процэсу. Мастак дыялектык-матэрыяліст—не пасыўны фіксатар зьяў. Утварэньне вобразу, які адлюстроўвае і выяўляе сутнасьць процэсу, адбываецца не незалежна ад актыўнага ўдзелу сьвядомасьці, не без адпаведнага партыйнага клясавага пункту гледжаньня, не праз адно падсьвядомае, інтуітыўнае, у супроцьлегласьць сьвядомасьці, а на аснове адзінства сьвядомага і падсьвядомага, пры прымаце сьвядомасьці.

Адсюль відавочна ўся рэакцыйнасьць і шкоднасьць тых творчых „рэцэптаў", якія ў свой час даваў пролетарскай літаратуры А. Варонскі. У сваёй кнізе „Искусство видеть мир" ён пісаў:

„Тайна искусства—в воспроизведении самых первоначальных и непосредственных впечатлений" (ст. 91). Няма чаго гаварыць, што калі-б пролетарская літаратура пашла па шляху Варонскіх, дык яна ня толькі ня была-б пролетарскай, але-б нават ня здолела быць і

літаратурай наогул, а была-б пародыяй на літаратуру, ня толькі не дапамагала-б пролетарыяту ў ажыццяўленьні гістарычных задач, а, наадварот, была-б зброяй у руках клясавых ворагаў пролетарыяту, у іх змаганьні супроць соцыялістычнага будаўніцтва.

Відавочна рэакцыйнасьць і няпрыемлівасьць для пролетарскай літаратуры і такіх навучаньняў Варонскага, што: „В создании образа деятельное участие принимает ум, но еще большее участие в его образовании принадлежит бессознательной работе“ (там-жа, ст. 17). Што тут характэрнага ў гэтай вынятцы? Перш за ўсё электрычнае, мэханічнае разуменьне суадносін „ума и бессознательной творческой работы“.

Па Варонскаму, розум і падсьвядомыя процэсы не знаходзяцца паміж сабой у дыялектычнай сувязі, яны разарваны, яны правамерны ў сваёй самастойнасьці.

Але, па-другое, ня гледзячы на самастойнасьць розуму і падсьвядомага, у творчым процэсе, у стварэньні вобразу прымат, вядучая роля належыць падсьвядомаму. Адсюль адмаўленьне змаганьня за сьветапогляд, адсюль пасывізм, капітуляцыя перад буржуазным і дробнабуржуазным інтуітывізмам, адсюль адмаўленьне змаганьня за папутніка. Можам мы пайсьці па гэтым шляху? Не, ня можам і ня пойдзем, бо гэты шлях ня наш, а шлях клясавых ворагаў. Зусім невыпадкова, што „рэцэпты“ Варонскага зьяўляліся асновай творчых позыцый контррэволюцыйных нацыянал-дэмократычных лірыкаў. Невыпадкова і тое, што вароншчына зьяўлялася асновай творчасьці большасьці ўзвышанцаў і актыўна імі пропагандавалася. Але пра гэтае потым.

Мастак дыялектык-матэрыяліст, насупроць Варонскім, не застанаўліваецца на павярхоўнасьці, не задавальняецца „первоначальными и непосредственными впечатлениями“, не аддаецца ва ўладу сваёй інтуіцыі, стыхіі падсьвядомага, а прасякае ў нутро процэсаў рачаіснасьці, ва ўсю іх глыбіню, пазнае іх сілай свае сьвядомасьці, сьвядома робіць адбор агульнага, тыповага, таго, што можа быць узьведзена ў вобраз. Адсюль зусім ня значыць, што мастак ігноруе „чувственную, наглядную“ звычайную форму. Наадварот, ён, захоўваючы „чувственное, наглядное“, звычайнае, выяўляе праз гэта сутнасьць зьяў. Праз „чувственное, наглядное“, бачнае мастак дыялектык-матэрыяліст выклікае „сущее“, сапраўднае.

Вось у гэтым спэцыфічныя моманты мастацтва, у гэтым асаблівасьці і асноўныя моманты мэтоду дыялектычнага матэрыялізму, мэтоду, якім павінен кожны пролетарскі пісьменьнік аўладаць, каб рухацца далей.

Аднак-гэта яшчэ ня ўсё. Варонскі ў свой час пісаў: „Эстетическое чувство лишено узко-утилитарного характера, оно бескорыстно“... Калі гэта перакласьці на звычайную нашу мову, дык гэтае сьцьвярджэньне набудзе наступны выгляд: эстэтычныя пачуцьці, якія знахо-

дзяць сваё выяўленьне ў мастацкім творы, ня носяць дзейнага характару, яны ня маюць за мэту і не зьяўляюцца спэцыфічным сродкам клясавага змаганьня, яны бескарысны. Эстэтычныя пачуцьці ёсьць толькі сваяасаблівая, бескарысная, плятонічная форма сузіраньня. Ці правільна гэта? Гэта няправільна хоць-бы і таму, што такая пропаведзь ужо ёсьць фактар змаганьня буржуазіі супроць пролетарыяту, змаганьне за супроцьстаўленьне мастацтва, эстэтычных пачуццяў „карысьці“ пролетарыяту.

Для нас, для пролетарыяту мастацтва ня ёсьць сваяасаблівая форма пасыўнага сузіраньня, альбо „бескарыснага адчуваньня“, як гэта вучыць Варонскі. Для нас мастацтва ў яго функцыі ёсьць актыўны сродак пазнаньня сьвету, пазнаньня соцыяльных адносін; для нас мастацтва, далей, ёсьць актыўна дзейная сіла, зброя ў клясавым змаганьні ў розных яе формах. Для нас мастацтва зьяўляецца актыўным сродкам мобілізацыі працоўных на выкананьне задач па соцыялістычным будаўніцтве.

На даным этапе комуністычнае рэволюцыі больш чымся калі мастацтва „павінна максымальна ўзбуджаць псыхолёгічную актыўнасьць і энэргію рабочае клясы (Фрычэ), павінна быць актыўным сродкам узбуджэньня і ўзмацненьня актыўнасьці рабочае клясы і колгасьнікаў навакол задач па ажыцьцяўленьні проблемы „дагнаць і перагнаць“.

Мы зараз больш, чымся гэта рабілі раней, павінны з усёй сілай падкрэсьліць, выпяціць актыўнадзейную, функцыянальную ролю мастацтва, бо бяз гэтай ясна акрэсьленай мэтаўстаноўкі наша літаратура ня выканае свае ролі, сваіх задач, якія ёй адведзены ў сыстэме клясавага змаганьня, сыстэме соцыялістычнага будаўніцтва.

Адсюль ва ўсёй сваёй велічы, з усёй сілай паўстае задача перад пролетарскай літаратурай, задача аўладаньня тэматыкай рэконструкцыйнага пэрыоду. Трэба ўсьвядоміць і памятаць, што аўладаньне тэматыкай рэконструкцыйнага пэрыоду, ня ў вульгарным яе разуменьні, зьяўляецца па сутнасьці сваёй умовай аўладаньня дыялектычна матэрыялістычным мэтодам. Асваеньне нашай літаратурай тэматыкі, якая вынікае з данага, конкрэтнага гістарычнага этапу, зьяўляецца ўмовай таго, што літаратура ня будзе плесьціся ў хвасьце, у абозе гістарычнага руху, ня будзе стаяць у баку ад агульна пролетарскай справы па будаўніцтве соцыялізму.

Пролетарскія пісьменьнікі павінны сваёй творчай практыкай дабіць варожыя пролетарскай літаратуры тэорыі, ліквідатарскія тэорыі Троцкага-Варонскага і іх варыяцыі, у якую-б яны вопратку ні апраналіся. Я маю тут на ўвазе „тэорыю“ „патоса-дыстанцыі“, тэорыю, якая вучыць, што для таго, каб пісьменьнік стварыў вялікі мастацкі твор, для гэтага трэба, каб матэрыял эпохі, об‘ект творчасьці вылежаўся, вымарыўся, што мастацтва наогул ня можа пасьпяваць за гістарычным рухам, што месца яго ў гістарычным абозе.

„В 18 и 19 г.г. на фронтах нередкость было встретить воинскую часть, движение которой открывалось конной разведкой и замыкалось телегами с артистами, декорациями и всяческим реквизитом. Место искусства вообще—в обозе исторического движения (Троцкий—„Литаратура и революция“). Такім чынам вы зьяўляецеся не байцамі, не авангардным атрадам пролетарыяту, а, па просту кажучы, вы зьяўляецеся, па Троцкаму, абознай клячай. Праўда гэта—адваротная. Палажэньне Троцкага прыстасоўваецца да яго самога. Ён не ў авангардзе рэволюцыі, а хутчэй у асэнізацыйным абозе буржуазіі. Такой-жа думкі адносна месца мастацтва ў гістарычным руху, адносна таго, што сапраўднае мастацтва можна тварыць толькі ў эпохі сытасьці, заціша, устойлівыя эпохі, трымаецца і А. Варонскі.

„Искусство—преимущественно занятие мирное. Искусству трудно отдаваться в эпоху войн, битв, острых классовых столкновений напряженной борьбы. В эти моменты воля видеть затемняется сплошь и рядом волей хотеть и действовать. Препятствуют также и общие неблагоприятные экономические и бытовые условия“ („Искусство видеть мир“, стр. 14).

З усяго гэтага вынікае, што ў наш час, час напружанага і востр. рага клясавага змаганьня нельга „отдаваться искусству“, што мастацтва не зьяўляецца вынікам і сродкам клясавага змаганьня, што тварыць мастацтва—гэта ня значыць „хотеть и действовать“ у клясавым змаганьні, а што мастацтва толькі зьяўляецца сродкам „видеть“ пасьля абжорства. Што гэтыя тэорыі зьяўляюцца варожымі для пролетарскага літаратурнага руху—даводзіць наўрад ці патрэбна. Вельмі-ж відавочна буржуазная сутнасьць іх.

Нават стары Гегель і той трымаўся другога погляду на гэта пытаньне. Ён у свой час гаварыў, што ня эпохі сытасьці і зрэласьці ўтвараюць вялікія мастацкія каштоўнасьці, а эпохі гэроічныя. Вадаразьдзелам у творчасьцях пісьменьнікаў розных кляс зьяўляецца сьветапогляд.

Ва ўсёй творчай практыцы пролетарскай літаратуры асноўную ролю, наперакор буржуазным тэорыям, наперакор інтуітывізму вароншчыны, адыгрывае сьветапогляд. Сьветапогляду ў творчым процэсе належыць вядучая роля. За вядучую ролю сьветапогляду нашаму пролетарскаму літаратурнаму руху прышлося на працягу апошніх год весьці жорсткае змаганьне ня толькі супроць трацкізму і вароншчыны, але і супроць нацыянал-дэмократычных варыяцый вароншчыны. У свой час вядомы вам Язэп Пушча пісаў, што няхай лепш твор вырываецца з гарачага сэрца, чымся вымучваецца з халоднай галавы.

Дазвольце разам з вамі ўсумніцца ў якасьці і творчых здольнасьцях сэрца такога пісьменьніка, з халоднай галавы якога прыходзіцца вымучваць вобразы.

Таксама ў свой час сярод белаппаўцаў была ў модзе і карысталася досыць значнай популярнасьцю думка, праўда, не орыгінальная, што пісьменьнік павінен пісаць пра тое, што ён адчувае.

Адзін з нашых маладых пісьменьнікаў у 1929 годзе так і заявіў: „Буду пісаць тое, што адчуваю". У свой час мы на такія выказваньні так адказвалі: паважаныя таварышы, па-першае, ня ўсё тое, што вы адчуваеце, мае грамадзкае значэньне, па-другое, ня ўсё, што вы адчуваеце і пішаце, уяўляе сабою мастацкую вартасьць; па-трэцяе, ня ўсё, што вы адчуваеце, павінна знайсьці сваё выяўленьне ў творах, з сваімі пачуцьцямі, зрабеце ласку, застанецеся самі. Пісьменьнік павінен пісаць аб тым, што хвалюе клясу, чым яна дыхае, чым жыве, чым захоплівaецца, што творыць, пісаць аб тым, што зьвязана з процэсамі рачаіснасьці, якія адбываюцца ў нашай краіне, што адбываюцца на рэволюцыйнай арэне комуністычнай рэволюцыі.

Інтуітыўным настроям, якія знайшлі сваё больш клясычнае выяўленьне ў зборніку „Как мы пишем", у якім пропагандуецца аполітычны індыфэрэнтызм (хоць аўтары яго ніколі не іспаведвалі), у якім пішуцца зусім дзікія рэчы, што толькі калі застаеш, то тады і творыш—усялякім такім настроям трэба даць рашучы, сьмяротны бой Змагацца за дыялектыка-матэрыялістычны мэтод—азначае змагацца ў першую чаргу за пролетарскі сьветапогляд, бо, як правільна пісаў т. Фрычэ, творчыя „мэтоды ў пісьменьнікаў вынікаюць з іх мэтодаў мысьленьня, з іх клясава-абумоўленага агульнага сьветаадчуваньня".

Сьветапогляд для пролетарскага пісьменьніка зьяўляецца не „ідэолёгіяй для галоўліта" і ня нечым вонкавым, а органічнай, вядучай асновай творча-мастацкай практыкі.

Нашым пісьменьнікам трэба памятаць, што для пролетарскага пісьменьніка мала пазнаць сьвет, а што яго (сьвет) трэба праз пазнаньне ператварыць.

У сваіх тэзісах аб Фэйербаху Маркс пісаў:

„Философы лишь различным образом об'ясняли мир, но дело заключается в том, чтобы изменить его":

Мастацкая літаратура зьяўляецца аднэй з вастрэйшых зброй зьмены сьвету, адпаведна мэтаімкненьням перадавой, рэволюцыйнай клясы, а ня толькі сродкам пазнаньня яго. Мастацкі пазнаць, каб зьмяніць—вось што зьяўляецца галоўным у нашай літаратурнай практыцы. Об'ектыўная рачаіснасьць—сьвет, усё тое, што зьяўляецца об'ектам творчасьці пісьменьніка,—у тым выглядзе, як ён ёсьць на кожным этапе нашага разьвіцьця, ня можа задаволіць пролетарскага пісьменьніка, таго пісьменьніка, які правільна ўлавіў і зразумеў тэндэнцыі гістарычнага разьвіцьця.

„Мир не удовлетворяет человека, і человек своим действием решает изменить его" (Ленін).

Пролетарыят сваёй штодзённай практыкай соцыялістычнага будаўніцтва, сьмяротнымі бойкамі з сусьветным капіталам зьмяняе

сьвет. Рабочая кляса, якая прызвана кіраваць гісторыяй і тварыць яе, не застанаўліваецца на сваіх заваяваных посьпехах. Заваяванае для яе ёсьць толькі прадмова, аснова для далейшых заваёў у справе зьмены сьвету, у справе ператварэньня грамадзтва адпавёдна комуністычным ідэалам.

Пролетарыят, перабудоўваючы сьвет, ператвараючы грамадзтва, кіруецца перадавой рэволюцыйнай тэорыяй марксызмам-ленінізмам. Пролетарская літаратура цалкам, кожны пісьменьнік упаасобку, для таго, каб выканаць сваю ролю ў справе перабудовы сьвету, павінен узброіцца рэволюцыйнай тэорыяй, сьветапоглядам і мэтодамі Маркса-Леніна, бо „сознание человека не только отражает об'ективный мир, но и творит его" (Ленин).

Узброіцца марксыцка-ленінскім сьветапоглядам, аўладаць дыялектыка-матэрыялістычным творчым мэтодам, органічна, непарыўна ўвязаць літаратурную практыку з задачамі соцыялістычнага будаўніцтва, з задачамі культурнай рэволюцыі—такая задача, такія ўмовы пераўзброеньня. Той, хто гэтага ня хоча, той няўхільна будзе адкінуты гісторыяй туды, куды адкідаецца ўсякі бруд у масавым рэволюцыйным руху.

Пролетарскі пісьменьнік зьяўляецца такім-жа профэсіянальным барацьбітом за справу соцыялізму, як токар, сьлесар, муляр і іншыя, бо ён служыць справе рэволюцыі, справе соцыялістычнага будаўніцтва сваімі спэцыфічнымі сродкамі і мэтодамі, якія даручыла і даверыла яму рабочая кляса.

БІБЛІОГРАФІЯ

Беллачаф. Зборнік першы. БДВ, 1931 г. Бал. 69, *цана 60 кап. Тыраж 5000.*

Думка аб стварэньні адмысловага літаратурнага згуртаваньня Чырвонай арміі і Флёту, узьнятая дэкларацыяй групы расійскіх пісьменьнікаў, знайшла шырокі водгук у пісьменьніцкіх масах, вынікам чаго зьявілася заснаваньне літаратурнага згуртаваньня ЛОКАФ і часопісу аднайменнай назвы, якога выйшла ў сьвет ужо 6 кніжак. Думка аб стварэньні такога літаратурнага згуртаваньня знайшла свой водгук і на Беларусі, і першы зборнік БелЛАЧАФ (беларускае літаратурнае аб'яднаньне Чырвонай арміі і флёту) ёсьць першы грунтоўны творчы вынік працы азначанага згуртаваньня. Гэты зборнік яскрава паказаў, што на Беларусі ёсьць пэўны грунт для організацыі БелЛАЧАФ як у сэнсе патрэбы твораў з адпаведнай тэматыкай, так і ў сэнсе пэўных літаратурных кадраў.

Невялікі сваімі памерамі (69 балонак друкаванага тэксту) зборнік БелЛАЧАФ здолеў шырока ахапіць самыя рознастайныя бакі чырвонаармейскага жыцьця. Варта перагарнуць балонкі зборніка. каб убачыць шырыню яго тэматыкі. Гэроіка грамадзянскай вайны ў „Пяць дзён" Іл. Барашкі атрымлівае ўзаемнае пацьвярджэньне ў гэроіцы новага, добрапамятнага нам змаганьня з кітайскай ваеншчынай на Далёкім Усходзе ў нарысе Ан. Вольнага „Прыехалі". Нарыс Вольнага, які паказвае, як удала ў належны момант пролетарыят СССР можа замяніць варштат на вінтоўку, знаходзіцца ў шчырым суладзьдзі з дынамічна-імклівымі словамі вершу Броўкі:

„Скажы, Клімэнт Яфрэмавіч,
Мы сядзем на каня".

Ператварэньне гэроікі вайны ў гэроіку будняў маем у нарысе Сташэўскага „На золку вясны". Адмоўным бокам гэтага нарысу зьяўляюцца раптоўныя, проста кінэматографічныя зьмены малюнкаў. Чытач часам ня можа адразу ўцяміць, калі-ж што адбываецца і што за чым ідзе. Асабліва гэта датычна апошняга малюнку нарысу, дзе малюецца напад бандытаў.

Штодзённае жыцьцё Чырвонай арміі знаходзіць сваё адлюстраваньне ў творах саміх чырвонаармейцаў. І. Гуцаў у нарысе „Навакол штандараў" і А. Шчарбакоў у творы „Пляма" паказваюць прыклад выхаваньня колектывістычнай ідэолёгіі ў чырвоных часьцях, новыя мэтоды працы (грамадзкі буксір) у прыстасаваньні да ўмоў Чырвонай арміі. У эскізе „Сёньня" А. Шчарбакоў паказвае вучобу Чырвонай арміі артылерыйскай і тэлефоннай справе. Наяўнасьць некаторых тэхнічных тэрмінаў ані не абцяжарвае эскізу, а наадварот, прымушае чытача больш уважліва ўдумацца ў прачытанае. Апавяданьне П. Буйвалінскага „Дэлегат" малюе цяжкасьці вучобы для малапісьменнага чырвонаармейца. Апавяданьне прасякнута ўпэўненасьцю ў канчатковай п рамозе ўпартага чырвонаармейскага розуму. Напісана апавяданьне так, што чытач прымушаны, не адрываючыся, сачыць за разьвіцьцём дзеі, так, што дзеючыя асобы апавяданьня, асабліва Шэін, становяцца блізкімі чытачу і запамінаюцца ім.

Зьвернута ўвага зборніка і на сувязь Чырвонай арміі з усім жыцьцём кр іны. Цалкам прысьвячанае гэтаму апавяданьне С. Богуша „Наказ выканаў" паказвае організацыю дэмобілізаваным чырвонаармейцам калгасу ў роднай вёсцы. Тую самую тэму трактуе часткова і Васіль Сташэўскі ў згаданым ужо нарысе „На золку вясны". Асаблівай увагі варта апавяданьне Іл. Галавача „Кара", дзе паказана прасякненьне кулацкай шкоды ў Чырвоную армію. Кулак Макар, пішучы пад дыктоўку няпісьменнага бацькі Сідарука ліст апошняму ў Чырвоную армію, паведамляе розную хлусьню пра олектывізацыю. Чырвонаармеец Сідарук самавольна едзе на вёску, каб праверыць, ці праўда ўсё пісанае ў лісьце. Упэўніўшыся ў тым, што ўсё гэта—выдумкі кулака, Сідарук вяртаецца ў армію, атрымлівае дысцыплінарнае спагнаньне, але таварышы ўсё-ж не жадаюць пусьціць яго ў рогу за тое, што ён сваім учынкам расхлябвае дысцыпліну. У гутарцы з політрукам Сідарук усьвядомлівае ўсю шкоднасьць свайго ўчынку. Два чырвонаармейцы з роты Сідарука выказваюць процілеглыя погляды—адзін ня верыць у Сідарукову шчырасьць і патрабуе бязумоўнага выключэньня яго з рогы, а другі прапануе „не перасольваць" і аднавіць яго, прымаючы пад увагу яго шчырае раскаяньне. З ўласьцівай для ўсяго ягонага творчага мэтоду рысай, Галавач не дае разьвязаньня гэтай спрэчкі. Гэта прымушае чытача асабліва ўдумацца ў апавяданьне, падумаць над тым, хто праў, хто не. Усё апавяданьне паказвае на тое, што мае рацыю чырвонаармеец, які прапануе „не перасольваць" і аднавіць Сідарука. Галавач-жа, не даючы клясычнага, добрага канчатку апавяданьня, узбуджае гэтым самым сьвядомасьць чытача на неабходнасьць ва ўсіх жыцьцёвых справах паставіць перад сабой пытаньне: а ці варта перасольваць? Ці ня лепш аднесьціся больш уважліва да таго асабліва каштоўнага ў наш час матэрыялу, які завецца чалавекам? У гэтай рысе творчага мэтоду Галавача—яго вялікая карысьць для выхаваньня чытача ў належным клясавым напрамку.

Вершы зборнікў выглядаюць слабей за ягоную прозу. Маршы Ліхадзіеўскага, Шушкевіча, і Бобрыка па сутнасьці выказваюць адну і тую самую думку, толькі рознымі словамі:

„Напорней крок
Чырвоны полк“ (Шушкевіч)
„Марш на сусьветны пажар
Раз! Два! Тры!“ (Ліхадзіеўскі).
„Таварыш, ахв ч не ахвоч—
сядлай каня“ (Бобрык).

Бобрыкаў верш выдаецца неапрацаванасьцю, а часта і проста наборам слоў. Прыведзеная ўжо цытата аддае нейкай дзіўнай „лявацкасьцю“, бо Чырвоная армія з справы гонару для працоўнага абараняць сваю бацькаўшчыну робіцца ў Бобрыка нейкім прымусам „Ахвоч не ахвоч—сядлай каня“. Усёроўна, маўляў, прымусім! Выраз „у алюр па дарозе пашла цішыня“ зусім ня мае сэнсу ні з мастацкага, ні з вайсковага пункту гледжаньня. Бо алюр бывае розны хуткі, павольны і г. д. І як гэта цішыня пайшла якім хочаш з гэтых алюраў—цяжка сабе ўявіць. Апрача таго, гэты „алюр цішыні“, зьвязаны з выездам коннага атраду—выразны вобраз парушэньня цішыні, яе прарыву, а не хады. За гэтым радком ідзе „І ноч праглынула, узяла цішыня...“ Тут сапраўды да сэнсу не дайсьці!

Дынамічным і ўдалым зьяўляецца згаданы ўжо верш Броўкі „Клімэнт Яфрэмавіч“. Удалае чаргаваньне разьмераў, няспынная політычная завойстранасьць тэмы ставіць гэты верш у першыя шэрагі твораў чырвонаармейскай літаратуры Беларусі. Верш Чарота „Чырвонаармейская“ ўжо вядомы па ранейшым яго выданьні, лепш за ўсё можа служыць творчай прадмовай да зборніка, характар якой ён і выконвае, паводле таго, дзе ён знаходзіцца ў зборніку. Вершы пачынаючых пісьменьнікаў А. Шчарбакова і Я. Гуцава не вызначаюцца яшчэ асаблівай колёрытнасьцю, але маюць той дадатны бок, што бяруць за тэму конкрэтны факт, альбо вобраз, а не разважаньні „сусьветнага маштабу“, што часта маем у пачынаючых пісьменьнікаў і што трэба кваліфікаваць, як зьяву далёка не дадатную.

Зборнік мае і шмат недахопаў. Адзін з галоўных—гэта адсутнасьць хоць з большага паведамленьня ад БелЛАЧАФ, ці яго творчай дэкляцыі аб характары зборніка, яго мэтах і г. д. Паведамленьне на вокладцы ня можа нават лічыцца за паведамленьне. І да таго-ж яно мае таксама спрэчны момант. „Большасьць твораў, якія ўвайшлі ў гэты зборнік, зьяўляюцца першымі работамі маладых пісьменьнікаў“, гаворыцца там. Але як да зборніку ні падыходзіць, а старыя пісьменьнікі (г. зн. пісьменьнікі, імя якіх досыць вядома на Беларусі) займаюць у зборніку пераважнае месца. Так выйдзе і па колькасьці твораў (дзевяць старыя, сем—маладыя) і па колькасьці занятых балонак (сорак тры—старыя, дваццаць шэсьць—маладыя). Адсутнасьць паведамленьня дае нявыразнасьць і пэрыодычнасьці зборніка. Невядома, ці гэта часопісь, ці альманах. Каштоўней, бязумоўна, была-б часопісь і імкненьне зьвесьці справу да зборнікаў, якія выходзяць невядома калі і праз які тэрмін, савецкай і, ў першую чаргу чырвонаармейскай грамадзкасьцю павінна быць пераможана.

Нарэшце вялікай заганай зборніка зьяўляецца адсутнасьць аддзелаў крытыкі, бібліографіі. хронікі. Крытыкаваць у нас на Беларусі ёсьць што, бо бібліотэка чырвонаармейца ўжо выпусьціла досыць кніжак, але амаль ніводная з іх не атрымала яшчэ ацэнкі. Расійская часопісь „ЛОКАФ“ увяла ў сябе аддзелы бібліографіі і ад гэтага яна толькі выйграе.

Ал. Цітоў.

Сяргей Ракіта,—„Я агітую за пяцігодку“.
„Выданьне Палескай праўды“ Гомель.
1931 г. Бал. 64. *Цана 40 кап.*

„У змаганьні за творчы мэтод пролетарскай літаратуры спатыкаюцца часам шкодныя адхіленьні ад мэтаду матэрыялістычнай дыялектыкі. Адным з такіх шкодных адхіленьняў зьяўляецца знадворна-павярхоўны ахоп пісьменьнікам пэўнай зьявы, тое, што ў літаратурнай практыцы набыло назву коўзаньня па паверхні. У беларускай літаратуры адзін час на гэты няпэўны шлях стаў А. Александровіч у сваёй „Поэме імя Вызваленьня“. Александровіч, ня гледзячы на высокі патос будаўніцтва, глыбокую шчырасьць яе, зьвёў амаль ўсю поэму да лёзунгаў, голай агітацыі, беглага, павярхоўнага агляду зьяў. Жыцьцё паказала, што поэма гэта не стварыла таго ўражаньня на шырокія чытацкія масы, якія рабілі іншыя рэчы Александровіча, як „Цені на сонцы“ і інш. Жыцьцё паказала, што ў наш час мала выкінуць лёзунг „Даёш пяцігодку ў 4 гады“, бо мастацкая літаратура нечым ды павінна адрозьнівацца ад літаратуры плякатнай, жыцьцё паказала, што ўсякі такі лёзунг трэба расшыфраваць, паказаць ва ўсёй яго глыбіні, ва ўсіх яго рознастайнасьцях, унутраных супярэчнасьцях, ва ўсёй яго конкрэтыцы. А. Александровіч і сам прызнаў сваю памылку, імкнучыся да практычнага яе выпраўленьня ў поэме „Нараджэньне чалавека“. Аднак у гэтым кірунку ў Александровіча знайшліся пасьлядоўнікі, з якіх досыць значнай зьявілася постаць Сяргэя Ракіты. Казаць аб Ракіце немагчыма, не гаворачы пра Александровіча часу напісаньня „Поэмы імя Вызваленьня“. Немагчыма ня толькі таму, што ў Ракіты маем непасрэдныя перайманьні Александровіча накшталт:

Шчыльней пролетарскія рады!
Даёш пяцігодку ў 4 гады!“
(„Поэма імя Вызваленьня“, бал. 7).

„Зьяднаем шчыльней
баявыя рады!
Даёш пяцігодку ў 4 гады".
(„Я агітую за пяцігодку" бал. 22)

а таму, што і гэта непасрэднае перайманьне незалежна ад таго, зроблена гэта Ракітам да ці пасьля чытаньня „Поэмы імя Вызваленьня", цесна ўвязана з усім яго творчым мэтодам, які ідзе ў яго ад Александровіча ў першую чаргу, і пры гэтым выкарыстоўвае найбольш Александровіча ва адмоўнае.

Сяргей Ракіта пачынае сваю кніжку аўтаэпіграфам, ў якім, паміж іншым, кажа:

„Зьмест гэтай кніжкі просты—
Я агітую за пяцігодку,
За пяцігодку росту".

Паўстае пытаньне, чаму зьмест кніжкі просты? Ці не таму толькі, што аўтару трэба было падзабраць рыфму да слова „росту"? Але ізноў-жа незалежна ад таго, што суб'ектыўна штурхнула Ракіту, лічыць зьмест кніжкі „простым", об'ектыўна гэта азначае салідарнасьць з творчым мэтодам Александровіча часу стварэньня „Поэмы імя Вызваленьня", але гэты мэтод ужываецца Ракітам у значна горшым выглядзе. Ракіта лічыць, што агітаваць за пяцігодку проста, з чым мы аніяк ня можам згадзіцца. Зьмест кніжкі, якая агітуе за пяцігодку, павінен быць вельмі і вельмі складаным, такім, які-б сапраўды абуджваў савецкага чытача на змаганьне за пяцігодку, які-б паказваў пяцігадовы плян ня толькі ў лёзунгах, а ва ўсіх яго ўнутраных супярэчнасьцях, мажлівасьцях, сувязях. Агітаваць за пяцігодку з посьпехам ня менш цяжка, чымся яе ажыцьцяўляць, бо прыцягваньне, дзякуючы агітацыі новых сьвядомых змагароў за пяцігодку—ударнікаў—хіба-ж гэта ня тое самае ажыцьцяўленьне пяцігодкі? А наўрад ці хто, да і наўрад ці сам аўтар скажа, што ажыцьцяўляць пяцігодку проста. Таму і агітаваньне за яе ня можа і не павінна быць простым.

Тое, што сказана ў эпіграфе да кніжкі, невыпадкова, гэта можа пацьвердзіць увесь зьмест кніжкі. Ракіта думае, што досыць яму выказацца за пяцігодку для таго, каб пераканаць у патрэбнасьці змаганьня за пяцігодку чытацкую масу, думае, што досыць ўпэўніць чытача ў тым, што ён, аўтар, за пяцігодку, каб за пяцігодку быў і чытач яго зборніка, чытач, магчыма, у палітычных пытаньнях хісткі. У гэтай самазакаханасьці і самаўсхваленьні—адна з галоўных заган кніжкі. Прывядзём шэраг пацьвярджэньняў. На бал. 18 гаворыцца

І я
абвяшчаю сябе ўдарнікам
Літара-
турнага цэху"

У вершы „Другу-ударніку" (бал. 19-21) Ракіта імкнецца ўпэўніць чытача ў тым, што... мы

нясём у грудзёх
вялікую палкую радасьць (бал. 19),
што ўдарніку „я песьню дару,
запал
і
імкненьне поэты" (бал. 21)
ці
„—Для працы
вялікай,
напружнай,
упартай
Свой розум і сілы аддам (бал. 40)

Чытач, сапраўды, можа пераканацца ў Ракітавай шчырасьці. Але гэтага мала. Чытач павінен адначасова пераканацца і ў неабходнасьці для яго прыняць актыўны ўдзел самому ў змаганьні за пяцігодку. А гэтага якраз ён і ня можа атрымаць ад зборніка Ракіты. Бо для таго, каб пераканацца, трэба ўбачыць і ўсьвядоміць сабе конкрэтную гэроіку будаўніцтва, а гэтага ізноў-жа ў Ракіты няма. Праўда, Ракіта кажа, што тэмпамі ўдарнымі трэба

„Нам перайначыць сягодньня (бал. 22)

але мы амаль ня маем у яго каштоўнага паказу таго, як-жа трэба перайначваць сягоньня. Праўда, ёсьць у Ракіты імкненьне паказаць такое перайначваньне, але яно непераконліва. Спынімся крыху на ім. Эскіз „Ля чорнай дошкі" паказвае, як рабочы, якога за сапсаваны паравоз занесьлі на чорную дошку, стаіць перад ёй і чытае пра сябе.

„І раптам—
у дзьверы натоўпы людзей
Ўстрывожаны рухі і твары
— Даёш паравоз!
— Ты прагульшчык' зладзей!
— Марнеюць бяз руху цяжары!
Цішынь...
Паравоз (і)...
Здаюся яму
Стаіць аднагорбым вярблюдам
— Клянуся (рашыў)
— Недаем,
— недасплю—
На дошцы чырвонай буду".

Ніякіх ўнутраных перажываньняў у гэтага чалавека быццам і няма. Усё так проста—рабочыя выказалі сваё абурэньне, ён засароміўся і рашыў адразу папасьці на чырвоную дошку. Цяжкасьці пераробкі псыхолёгіі прагульшчыка ў ударніка па Ракіту адсутнічаюць. Ён цвёрда верыць у канчатковую перамогу соцыялістычных мэтодаў працы, але ён забываецца на тое, што гэтая перамога праходзіць у выніку складанага змаганьня. Вось тэтае складанае змаганьне ў Ракіты і выпадае. Ракіта апісаў у эскізе выпадак, які можа ўбачыць усякі староньні наглядальнік, але ён не прасякнуў у глыбіню, у ўнутраныя супярэчнасьці гэтага выпадку. Такая самая павярхоўнасьць, пастава староньняга наглядальніка характэрна і для „Поэмы аб першай баразьне". Тут аўтар таксама не прасякнуў ва ўнутраныя супярэчнасьці зьявы. У „Лісьце да сына" пака-

зана ўтварэньне колгасу зусім стэрэотыпна—заможнікі былі супроць, беднякі—за колгас, улада была на баку беднякоў, і калгас стварыўся. Але перавага колгаснай працы не паказана. Не паказана, чаму калгас жыве і будуецца? (справа не ў аднэй сьвядомасьці колгасьнікаў!). Ці здаволены колгасьнікі новай працай, новым жыцьцём, якія перашкоды зьявіліся пры будаваньні самога колгасу (пасьля яго ўтварэньня?) Нічога гэтакага ў Ракіты няма. Некаторым выключэньнем зьяўляецца верш „Кадры".

Да зборніка падана панэгірычнага тону прадмова Л. Розэнблюма, на якой варта спыніцца. Для аўтара, відаць, самае важнае тое, што Ракіта ўцяміў, ён прасякнуўся сьвядомасьцю, што барацьба за пяцігодку—гэта матар'яльнае афармленьне клясавай барацьбы за соцыялізм" (бал. 10) і гэтага хопіць. Прывёўшы некалькі цытат з Леніна, аўтар лічыць сябе пазбаўленым ад патрэбы ўважнага разгляду Ракітавай творчасьці і таму на адмоўных бакох яе ня лічыць патрэбным спыняцца. Тыя небясьпекі, якія намячаюцца ў Ракітавай творчасьці, Л. Розэнблюма ня цікавяць. Упадаючы ў лірычны тон, Л. Розэнблюм кажа. „яшчэ многа стрэлак на шляху, тых стрэлак, якія могуць.. загнаць у тупік..." але конкрэтна ён гэтых стрэлак не паказвае. Ні слова пра творчы мэтод пролетарскага пісьменьніка, ні слова пра конкрэтныя задачы Ракіты, за тое шмат усхваленьняў Ракіту і Александровічу, прычым не Александровічу, як аўтару яго лепшых твораў, а найбольш адмоўнаму ў Александровічавай поэзыі—яе плякатнасьці. Такая прадмова, якая, замест сьціслага, але грунтоўнага агляду творчасьці сьпявае толькі „алілуя" і аўтару зборніка, у наш час ня толькі бескарысна, яна нават шкодна, бо прымушае пісьменьніка замест упартай, штодзённай працы над сабой „почивать на лаврах", дае яму штуршок „увядать, не успев расцвести".

Спынімся хоць з большага на формальных заганах Ракітавай творчасьці. У сэнсе мовы Ракіта не дастаткова ўладае беларускай літаратурнай мовай, таму часта маем у яго русізмы, часам у ахвяру разьмеру, а часам нават бяз усякай ахвяры—„прамая (чаму ня простая?) дарога", злодзей (зладзей?), найпэўны (трэба—найбольш пэўны ці найпэўнейшы), праворна (жвава?), прывет (прывітаньне?). Часам ёсьць зрывы у рытміцы вершу.

Вобразы Ракіты часам нацягнуты і вымучаны: так „Прыгожасьць губляе адсоткі" здаецца нам надзвычай надуманым.

Ракіту трэба доўга і ўпарта працаваць над творчым мэтадам і над формальнымі асаблівасьцямі сваёй мовы.

Што ў кніжцы сапраўды цешыць вока—гэта яе выданьне. На дзіва добрая папера, параўнаўча нявысокі кошт яе зьяўляюцца момантам цалкам дадатным.

Ал. Цітоў

Зіна Бандарына—Веснацьвет. Выданьне БДВ 1931 г. Стар. 125. *Цана 1 р. 30 к.*

Ранейшая літаратурная дзейнасьць Зіны Бандарынай, хоць была і нязначная сваімі памерамі і мастацкай каштоўнасьцю, насіла на сабе выразныя адзнакі дробнабуржуазнай ідэолёгіі, і вельмі часта ў яе творах мы бачылі выразныя нацыянал-дэмократычныя ўплывы, якія знаходзілі сабе адбітак у вершах, дзе ў сумных і змрочных фарбах апявалася Беларусь і сум па сваёй роднай старонцы.

Наяўнасьць гэтых момантаў у вершах З. Бандарынай дала повад М. Гарэцкаму замаскаваць зьмест вершаў пісьменьніцы, які, па яго думцы, быў бясспрэчна каштоўным, і сьцьвярджаць, што творчасьць З. Бандарынай адрозьніваецца ад іншых пісьменьнікаў сваёй, элегійнасьцю, пяшчотнасьцю і далікатнасьцю" і што ў вершах яе адбіта „прыгожая ясная думка, але з некаторай нэрвовасьцю". У даны момант мы маем права патрабаваць ад пісьменьніцы, якая працуе ў шэрагах пролетарскай літаратуры, рашучага перагляду сваіх ранейшых творчых установак і падпарадкаваньня сваёй дзейнасьці запатрабаваньням сучаснасьці.

Але трэба сказаць, што даны зборнік вершаў З. Бандарынай асноўным сваім зьместам не паказвае нам на тое, што пісьменьніца перабудавала сваю творчасьць што, яна актыўна становіцца на шлях пролетарскай поэзіі, адбівае ў сваіх творах ідэолёгію пролетарыяту, выказвае яго думкі і жаданьні.

Пры азнаямленьні з матар'ялам зборніка „Веснацьвет" такая думка ў нас ня зьнікае, а, наадварот, можна адзначыць, што пісьменьніца не адыходзіць ад апяваньня нуды і смутку, а імкнецца гэтыя мотывы яшчэ больш паглыбляць і ў свой зборнік уключае без усялякіх зьмен вершы (як, напр., „Апошняя вясна"), якія былі надрукованы ў першым зборніку вершаў пісьменьніцы, выданым ёю ў супрацоўніцтве з Пфляўмбаўм і Вішнеўскай („Вершы" — выданьне, „Маладняк" 1926 г.) і якія вызначаліся выразна выяўленымі настроямі смутку і дэпрэсіі.

Больш таго, у свой новы зборнік вершаў, З. Бандарына ўключае яшчэ шэраг вершаў, у якіх гэтыя мотывы ўстаюць перад чытачом у яшчэ больш акрэсьленым выглядзе.

Прыкладна, вершы „Былая", „Мары", „Навучы" і інш. кажуць нам аб тым, што пісьменьніца яшчэ значнае месца адводзіць асабістым перажываньням і настроям.

Характэрным прыкладам такога вершу зьяўляецца верш, зьмешчаны на стар. 67.

„Завіліся словы
у сіні туманы.
Даўнасьцю сталецьцяў
даль зьвініць, зьвініць...
Завіліся словы
у сіні туманы
раньне аксамітнае
прашаптала: хочу жыць...
Сонца залацістае
маладой вясны,
шалясьценьнем ветрыка
дадало: любіць!
Завіліся словы“ і. г. д.—

Верш гэты напісаны ў больніцы, як гэта зазначае З. Бандарына, што аднак ня можа апраўдаць яго нізкай мастацкай і ідэолёгічнай вартасьці.

Усе даступныя ёй мастацкія сродкі поэтэса прыцягвае да перадачы свайго суму і выказваньня свайго жалю аб пражытых днёх.

„Была я ў раньні зусім шчасьлівай
Сінелі ў жыце васількі,
І нечакана наўкол узрасьлі вы
Сівыя травы маей тугі...
Іду далёка, іду дрыгвою,
У прасторах вольных гукаю раньне
О, дзе вы, дзе вы, кволыя словы...
Іду адна я, туга ў тумане“...

Моманты неапраўданага смутку і роспачы пераважаюць яшчэ і зараз у вершах З. Бандарынай, хаця пісьменьніца імкнецца змагацца з імі і прабуе асудзіць гэтыя настроі.

У вершы „Адцьвітаньне“ яна прабуе адыйсьці ад настрояў суму і прыйсьці да новага, „спакойнага“ жыцьця, але ў яе, акрамя нэрвознага і істэрычнага выкліку, нічога не атрымоўваецца:

„Палец белы пракалола востраю іглою,
Кропелька крыві на ім зазьзяла,
І ня чула, быццам і ня боль,
У адчаі ўсе пальцы пакусала“.

Цэлы шэраг вершаў, як напрыклад, верш, зьмешчаны на стар. 81, „Ня трывож“ і інш., яскрава нам гавораць аб тым, што пісьменьніца яшчэ добра не ўразумела сутнасьці таго, для чаго патрэбен адыход ад старых настрояў, яна яшчэ сабе ясна не ўяўляе, што павінна прыйсьці на зьмену адчаю і суму.

І таму вельмі няясна, непераканаўча гучаць словы поэтэсы, калі яна кажа:

„Ня трывож адцьвілых лятуценьняў,
Ня будзі у восень гэты сум.
Я знайшла ад роспачы збавеньне,
У пералівах восені красу
. . . . . .

„Загубіліся, і зьніклі міражы.
„Буду цешыцца я будучыняй новай,
„У парыванньнях, лятуценьнях жыць“.

(Падкрэсьлена мною—Э. Г.)

Тое-ж самае мы маем і ў вершы „І вятры і зоры“—дзе З. Бандарына нашу сучаснасьць уяўляе, як нешта няяснае, невядомае.

„Дзесьці адчыніліся будучыні дзьверы,
Дзесьці невядомае блізіцца—ідзе...“

Жаданьне падыйсьці да ўсьведамленьня сьвету, прымаць удзел у яго перабудове ў пісьменьніцы ёсьць, але першыя крокі, якія яна прабуе зрабіць у гэтым напрамку, надзвычай няўпэўненыя і хісткія і таму жаданьні гэтыя выглядаюць крыху беспрадметнымі.

„Мне так хацелася
Крылатаю арліцай
Над балотамі роднымі
Лунаць.
Братоў у адну
Сям‘ю комуны клікаць,
Душу за будучыню
Сьветлую аддаць“.

(стар. 70).

Ці, прыкладна, радкі з вершу „Імкліваcьць“

„Я на сьвет нарадзілася
з бурай,
Каб імкнуцца, тварыць,
кіраваць,
Каб пад гімны
магутных мотораў для Комуны
палацы будаваць“.

Пісьменьніца не бярэ кожнай грамадзкай зьявы ва ўсёй яе конкрэтнасьці, а апісвае толькі павярхоўныя моманты, іншы раз зусім не характэрныя гэтай зьяве.

Прыкладна, вершы „З падшэфнай вёскі“—„Комсамол у паходзе“ і інш. служаць доказам нашай думкі.

Таксама і верш „Ліст у вёску“, дзе пісьменьніца наіўна заяўляе таварышом на вёсцы:

„Зьбіраем попел мы
І хутка падарунак (!)
Пашлем да вас
для новае сяўбы“.

Верш датаваны 1929 годам. Колектывізацыя вёскі. Ліквідацыя кулацтва. Уступае ў сілу пяцігадовы плян. Усё гэта прайшло міма вершаў З. Бандарынай.

І таму словы:

„Якое шчасьце
жыць і будаваць...
—бясконца хочацца гарэць
і захапляцца".

гучаць вельмі непераканаўча, бо гэтыя словы як „гарэць", „захапляцца" служаць спэцыяльным шаблёнам, калі іншы раз няма чаго конкрэтнага сказаць.

Павярхоўны падыход да зьяў рачаіснасьці, неўсьведамленьне гэтых зьяў ва ўсёй іх глыбіні накладвае пэўную адзнаку амаль на ўсе вершы Зіны Бандарынай і асабліва на тыя, дзе яна прабуе адбіваць зьявы грамадзкага жыцьця.

Гэта прычына прыводзіла яе вельмі часта да памылак, а іншы раз да цалкам няправільных выказваньняў: напр., у вершы „Маё credo" дзе, характарызуючы наш час, яна зазначае:

„Экстазнасьцю дзікіх прэрыяў
Сягоньняшні наш разьбег".

ужываючы зусім няправільнае і недарэчнае параўнаньне.

У зборніку ёсьць некалькі ня дрэнных вершаў („Да прысуду грамады", „Росквіт", „Жанадцзелу Беларусі", „Комсамол Беларусі"), моцна напісаны вершы „На зломе дзён" і „Шумы лясной краіны", але яны ня могуць даць падстаў казаць, што пісьменьніца прыйшла ў сучаснае літаратурнае жыцьцё, усьвядоміўшы і выправіўшы свае мінулыя памылкі. Такім чынам вершы Зіны Бандарынай, замест політычнай насычанасьці, ў яшчэ больш падкрэсьленым выглядзе даюць нам мотывы індывідуалізму, тэмы свайго „я".

Пісьменьніца яшчэ не пазбавілася і знаходзіцца ў палоне ідэалістычнага творчага мэтоду.

Слабыя спробы падыйсьці да сучаснасьці і зразумець яе разьбіваюцца аб вузкасьць сьветапогляду поэтэсы, неўразуменьне зьяў ва ўсёй іх конкрэтнасьці і ўзаемадзеяньні прыводзіць яе да схэматызму і павярхоўнасьці што характарызуе амаль усе вершы З. Бандарынай.

Вершы, зьмешчаныя ў зборніку „Веснацьвет", былі напісаны некалькі год таму назад.

Трэба спадзявацца, што наяўныя поэтычныя здольнасьці пісьменьніцы дадуць ёй магчымасьць у бліжэйшы час выправіць свае памылкі і аўладаць творчым мэтодам пролетарскай літаратуры.

Неабходнасьць рашучай перабудовы для Зіны Бандарынай бясспрэчна.

І перабудова гэта павінна ісьці не да зацьверджаньня шляхоў „Веснацьвету", а шляхам адыходу ад іх і пераходу на рэйкі пролетарскай літаратуры.

„Освобождаясь от наследства чуждых пролетариату влияний в своем творчестве, надо прежде всего зачеркнуть, преодолеть неверное, ложное, питаемое чуждыми классовыми корнями, в своем идейном багаже. Овладеть искусством революционной поэзии нельзя, не вооружившись ведущими идеями рабочего класса, не приобщившись к сокровищнице марксистско-ленинской теории. Только правильно усвоив угол зрения, можно видеть мир не плоским, не перекошенным, не дробящимся в призме мелких ощущений, а собранным в исторически достоверную картину, в которой противоречия и контрасты составляют лишь выражение глубочайшего единства исторического процесса, в основе которого лежит непримиримая борьба классов". (Литературная газета № 35 ст. „Трудности перестройки").

Гэтыя словы правільна вызначаюць той кірунак, у якім павінна разьвівацца далейшая творчая дзейнасьць маладой пісьменьніцы.

Эд. Галубок.

БССР Дзяржаўная бібліятэка імені ЛЕНІНА

Рэдагуе рэдколегія *Выдае* Беларускае дзяржаўнае выдавецтва